—Людзьмі звацца!
Янка Купала

ЛіМ

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ПЯТНІЦА
5
ЧЭРВЕНЯ
1992 г.
№ 23 (3641)

ВЫХОДЗІЦЬ
з 1932 г.

КОШТ — 50 кап.
(Па падпісцы — 10 кап.)

ВЫЙСЦІ З НАЦЫЯНАЛЬНАГА АНАБІЁЗУ

Эдуард ДУБЯНЕЦКІ: «Беларускі народ мог бы поўнасцю асімілявацца ці дэградаваць, калі б не яго славутыя доўгацярплівасць, працаздольнасць, таленавітасць... Калі б не гэтыя цудоўныя якасці беларускага нацыянальнага характару, існаванне беларускага народа, як самастойнага этнасу, магло б увогуле спыніцца яшчэ ў XIX стагоддзі».

СТАРОНКІ 5, 12

СТРАКАТЫЯ ВЫЯВЫ ДНЯ

Па старонках штогадовіка «Дзень паэзіі—91».

СТАРОНКІ 6—7

«МЫ ВЯРНУЛІСЯ ДА ПАЧАТКУ...»

«Балтыйская тэатральная вясна» ў Гародні.

СТАРОНКІ 10—11

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Адна дэтэктыўная гісторыя пра росшукі археолагаў.

СТАРОНКА 16

НАС ПАПЯРЭДЖВАЮЦЬ

Днямі мы атрымалі дакумент наступнага зместу:

«Учредителям газет и журналов. Главным редакторам газет и журналов. Министерство финансов Республики Беларусь. Министерство информации Республики Беларусь.

Сообщаем, что в связи с недостаточным финансированием газет и журналов «Наша слова», «Голас Радзімы», «Дзеці і мы», «Физкультурник Белоруссии», «ЛіМ», «Нёман», «Беларусь», «Полымя», «Мастацтва», «Крыніца», «Спадчына», «Театральная Беларусь», «Маладосць» издательство «Полымя» вынуждено с июля месяца т. г. приостановить выпуск вышеперечисленных изданий.

Директор М. А. Иванович».

Іншымі словамі, калі наш урад у бліжэйшы час не дасць неабходных сродкаў, ужо ў ліпені суверэнная Беларусь пазбавіцца значнай часткі сваёй перыёдыкі.



ЧАС І МЫ

Віктар КАЗЬКО

АЗВЯРЭННЕ

Амаль крамлёўская гісторыя

ПРАШУ прабачэння ў звера. Ён да такога яшчэ не дайшоў і наўрад ці дойдзе. Гэта пра нас, каго і параўнаць нельга ні з кім і ні з чым. Пра чалавекаў.

Прыбіральшчыкі смецця сёння хрысцяцца, пад'язджаючы да студэнцкіх і маладзёжных інтэрнатаў. Там, у кантэйнерах, адыходах і адкідах шумных вечарынак і застолляў і проста будзёншчыны, можна знайсці задушанага маладой маці немаўля, што толькі ўчора ці нават сёння з'явілася на свет з неперавязанай яшчэ для жыцця, бруднай, як нейкі недарэчны матузок, пупавінай...

Бацька гвалтуе родную дачку. Лашчыць і песціць, мые ў ванне ёй плечыкі, насуха выцірае свежым рушнікам, уцалоўвае радзімку на грудзях, ашчадна бярэ на рукі і нясе да сябе ў ложак...

Нябожчыка паднялі з табурэтак, на якіх каля брамы яго хаты ляжала труна, павезлі на могілкі, каб пахаваць. Аддалі зямлі, прыехалі назад, а ад табурэтак і знаку няма. Падкінулі ў гарод на трэці дзень, калі старая напісала аб'яву: табурэткі мае пойдуць за вамі на той свет, будзеце вы на іх перад Богам сядзець, як на патэльні...

Унук ці ўнучка забівае бабулю, таму што грошыкі на дыскатэку патрэбны...

І ўсё гэта не што-небудзь надзвычайнае, ніякая не паталогія, анармальнасць. Серыя, плынь, норма. Нармальныя, зробленыя яшчэ рукамі дзеда і прадзеда табурэткі, табурэтачкі. На гэтых драўляных табурэтках, услонах і лавах трымалася вясковая хата, нараджаліся, адседжвалі і адлежвалі пакаленні, але нам ужо на іх больш ні сесці, ні легчы нават у смяротны свой час, і нікому на іх ужо не нарадзіцца больш. Толькі гарэць, як у крэматорыі, смылець душою. Такія нашы сёння табурэткі. Такое наша сёння посткамуністычнае жыццё. Як і выкіды плазмы на сонцы, вывяржэнні вулканаў, землетрасенні там, дзе няма гор, паводкі амаль у пустыні. Невытлумачальныя і залпавыя выкіды насілля, гвалту і зла чалавечых душ— сістэма, як залпы ракет сістэмы «Град». І азонавыя дзіркі над галавой — прарэхі ў небе і душах. Чорныя ці белыя плямы памутнелага розуму, прарэхі ў ім, праз каторыя мо якраз і прарываюцца да нас прыхадні, лаўцы чалавечых душ, праз іх, пэўна ж, і адыходзяць, мігрыруюць у сусвет і самі нашы душы. А да нас ад абураных планет і сонца наплываюць гвалт і злыбяда. А мо і наадварот, наша зло і гвалт і ўтварылі тыя дзіркі, прапяклі ў небе брэшы і праломіны. Ахуталі брыдотай чыстыя зоркі нябесныя, атруцілі сваім духам сонца, абурылі, узбунтавалі планету. Не прымаюць зоркі душу чалавечую, сусвет распачаў вайну з нашым духам. Ідзе вайна касмічная, зорная вайна.

І блукаюць па сусвеце нашы непрыкаяныя душы. Няма ім спакою на зямлі, няма ні прытулку, ні прыстанку і на небе. Неба і зоркі згвалтаваны чалавекам. Зямля адмаўляецца прыняць яго прах. Чалавек з асалодаю творцы творыць сабе магілу. Мітусіцца, гойсае па могілках былога жыцця, капае, рые, як свіння лычом, раскопвае старыя магілы, дастае і адчыняе труны, трасе, перабірае і вее прах, не зважаючы ні на грэшнікаў, ні на праведнікаў, раскідвае косткі продкаў па ўсіх нашых весях і далях, вялікіх гарадах і маленькіх вёсках.

Непадалёк ад Мінска, наваяўленай сёння свету сталіцы наваяўленага супольніцтва, схавалася вёсачка. На высокім беразе рэчкі Пціч, што яшчэ ў сівой даўніне, калі на зямлі, пэўна, існавалі адны толькі птушкі, пратаптала яна сабе тут у мяккіх тарфяніках сцяжынку, сатварыла лебядзіную пасцель, з той пары мілуецца ў ёй. Да рэчкі прыляпіліся людзі, пабудавалі вёску і нараклі яе таксама Пціч. Хаця птушак навокал у звычайныя дні і не вельмі відно. Прыб'ецца аднекуль з дзесятак буслоў на новабудоўлю перад уваходзінамі, нібыта правяраюць, хто тут селіцца, выпрабоўваюць чалавека, ці думаюць, што гэта нарэшце і ім адладзілі жытло. Назаляюць, ляцяць на новую хату сарокі, калі бярвенні кладуць не на мох, а на паклю, учыняюць разбой і крадзёж. Рабуюць яшчэ недабудаваную хату. Скок - паскок па дошчачцы, па бярвенцу, галоўкай у картузку сінім ці ў сіняй жа хусцінцы направа-налева і дзюбкай, носікам моцненькім, амаль стальным, між бярвенняў, дзе пакля пакладзена. Раз, і ўхапілі касмылёк, і пацяглі. Сілы не хапае дзюбкай — лапкамі падсобяць. Вось ужо ў сцяне і дзіркі, шчыруюць да сіняга поту ўваччу. Як і ўсе мы, пэўна, гэтыя апошнія семдзесят гадоў перамог і дасягненняў. Нясуць, нясуць па сінім небе, разносяць па сваіх гнёздах сугрэўную ім паклю. Папраўдзе, як мы з вамі, асабліва ў самыя апошнія гады, калі ў хаце нашай, вялікай, прасторнай і светлай, нічога, акрамя той паклі, ужо і не заставалася. А мы шчыравалі, не ведаючы адпачынку, не складаючы рук, нібы адчувалі, што б'е той апошні час, калі красці ўжо не будзе чаго і не будзе ў каго. Прыйдзе ж, спасцігне нас і такое за ўсе грахі нашы, і прадчувалі гэта. Чалавек празорлівы, ведае грахі свае, ведае душа яго, што было, што будзе, і тое, што за ўсё прыйдзецца трымаць адказ. І сарокі гэтыя хутчэй за ўсё ў перасцярогу чалавеку пасланы небам, а мо гэта і не сарокі зусім, а нашы зладзеяватыя ўжо душы. І наканавана, прадпісана ім вось так самазабыўна, але не ведаючы радасці век свой птушыны векаваць.

Гаспадарчыя буслы, зладзеяватыя сарокі. А іншых птушак над вёскаю і не відна, і не чутна. Мо самі пцічане служаць тут замест іх. Былі некалі людзьмі, а цяпер перавярнуліся ў птушак. Падобна, у варон, вельмі старых варон. Самі старыя, старыя іх гнёзды. Дзесятка паўтара хатак, што счарнелымі штандарамі ўраслі ў белы пясок, у адляцелае, як слізготная цень, мінулае, стоенае і прыхаванае ад нашага адукаванага вока і розуму. Толькі чуткі і меркаванні.

(Працяг на стар. 14—15).

Кола Дзён

1 чэрвеня, у Міжнародны дзень абароны дзяцей, раней у нашым друку звычайна змяшчаліся падборкі здымкаў. Яны павінны былі засведчыць «шчаслівае савецкае дзяцінства» і, адпаведна, абяздоленае дзяцінства ў «краінах капіталу». Пазней, пасля Чарнобыля, сталі друкавацца здымкі, зробленыя ў дзіцячых шпіталях і інтэрнатах, на якіх была наша трагедыя, наш боль. На жаль, з цягам часу і гэта стала ператварацца ў своеасаблівы штамп, дзяжурную тэму... Размова тут не аб міжнародным дні абароны дзяцей і не аб тым, як яго адзначаць. Проста пад цяжарам шматлікіх сучасных праблем мы ўсё часцей забываем пра тых, хто найбольш пакутуе ад іх, каму сапраўды патрэбна абарона і клопат. Сённяшняя абыякавасць і апатыя заўтра абернуцца для грамадства жорсткай расплатай. І чаго тады будзе вартая ўся сучасная палітыка разам з палітыкамі?..

28 МАЯ

завяршыўся афіцыйны візіт урадавай дэлегацыі Беларусі на чале з В. Кебічам у Ізраіль. Пад час візіту прэм'ер-міністра прызначаны часовы павераны ў справах Рэспублікі Беларусь у Ізраілі. Ім стаў народны дэпутат Беларусі М. Фарфель. У ходзе паездкі беларускага прэм'ера на Блізкі Усход Старшыня СМ Беларусі наведаў таксама з візітам Кувейт. Вынікам паездкі стала ўмацаванне гандлёва-эканамічных сувязей з гэтымі краінамі.

29 МАЯ

даверныя лісты Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі С. Шушкевічу ўручыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Французскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь К. Жаліф. Дыпламатычнага «палку» на зямлі Беларусі прыбывае.

Старшыня Камітэта дзяржбяспекі Беларусі генерал-маёр Э. Шыркоўскі і старшыня КДБ Казахстана генерал-лейтэнант Б. Баякенаў падпісалі дагавор аб каардынацыі дзеянняў рэспубліканскіх службаў бяспекі.

У Кіеве адкрылася міжнародная канферэнцыя па праблемах увядзення нацыянальных валют. Актуальнасць яе ў святле фінансавай сітуацыі, у тым ліку ў нашай рэспубліцы, тлумачыць не трэба. Трэба спадзявацца, што ўдзел у канферэнцыі спецыялістаў Беларусі прынясе свой плён.

30 МАЯ

сталіца Беларусі адзначыла Дзень горада. Менску споўнілася 925 гадоў. Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, свята атрымалася. Яно было адзначана і тэатралізаваным шэсцем вершнікаў, і рыцарскімі рысталішчамі, і шматлікімі прадстаўленнямі фальклорных калектываў.

31 МАЯ

сучасная эканамічная рэальнасць зноў жорстка нагадала аб сабе: павысіліся цэны на малако, малочныя прадукты і хлеб (удвая), а таксама на мяккія сыры, жывёльны тлушч, прадукты з сала і мяса птушкі.

1 ЧЭРВЕНЯ

у Рыме ў рамках Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе сустрэліся ўдзельнікі канферэнцыі па Нагорным Карабаху, яная мае адбыцца ў сталіцы Беларусі ў гэтым месяцы.

2 ЧЭРВЕНЯ

ў Мінск з'ехаліся на кангрэс кіраўнікі саюзаў прадпрымальнікаў, арандатараў, навукова-прамысловых асацыяцый СНД. Не толькі звычайныя грамадзяне, як выявілася, але і вядомыя бізнесмены, гаспадарнікі і эканамісты ва ўсіх без выключэння краінах Садружнасці заклапочаны развалам эканомікі, які можа прывесці, калі не прыняць тэрміновыя меры, да поўнага спынення вытворчасці ўжо ў бліжэйшы час.

3 ЧЭРВЕНЯ

ў адным з прыгажэйшых куткоў планеты — Рыо-дэ-Жанейра (Бразілія) пачаўся беспрэцэдэнтны па маштабах міжнародны форум па экалогіі Зямлі. Ягоны дэвіз — «Планета ў небяспецы!» У рабоце канферэнцыі прымаюць удзел практычна ўсе члены ААН. Многія краіны прадстаўлены на вышэйшым узроўні. Удзел у форуме прымае і дэлегацыя Беларусі на чале з С. Шушкевічам. Пытанне — якую планету мы пакінем нашым дзецям — хвалюе ўсё чалавецтва.

Анатоль БУТЭВІЧ:

«Заўтрашні дзень кожнага выдання— камерцыйная дзейнасць»

На мінулым тыдні ў Доме ўрада адбылася прэс-канферэнцыя міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь А. Бутэвіча. Напачатку міністр пазнаёміў прысутных з асноўнымі кірункамі дзяржаўнай выдавецкай палітыкі, расказаў аб праблемах, што ўзніклі ў выніку гаспадарчай раз'інтэграцыі на тэрыторыі былога СССР, і аб тым, як гэтыя праблемы ў выдавецкай справе вырашае суверэнная Беларусь.

Сёння ў рэспубліцы 10 выдавецтваў і 300 арганізацый, што выпускаюць друкаваную прадукцыю. Паколькі выдаткі на паперу, клей, пераплётны матэрыял узраслі ў дзесяткі разоў нават у параўнанні з мінулым годам, мы не маем іншага выйсця, як ствараць уласную вытворчую базу. І сёе-тое ўжо зроблена. У прыватнасці, кардон для кніжных вокладак Беларусь ужо не імпартуе з-за мяжы. Плануецца мець уласную паперабочную фабрыку.

Па словах міністра, дзяржаўную падтрымку будзе мець сацыяльна-неабходная літаратура (дзіцячая, літаратурна-мастацкія выданні, падручнікі і г. д.). Што ж датычыць датацый на перыёдыку, дык яе сёння маюць 19 выданняў.

У галіне радыё і тэлебачання галоўнай мэтай бачыцца стварэнне нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Чатыры гадзіны вяшчання ў дзень, якія мае сёння Беларускае тэлебачанне, яўна недастаткова. Тым болей, што вяшчанне «Астанкіна» ахоплівае 98 працэнтаў тэрыторыі Беларусі, а Беларускае тэлебачанне — толькі 94 працэнты. У перспектыве наша тэлебачанне магло б ахопліваць Віленшчыну і Беласточчыну, іншыя этнічныя беларускія землі.

Ёсць праблема выхаду Беларусі на сусветны рынак інфармацыі, але яна можа быць вырашана толькі пасля падзелу паміж суверэннымі дзяржавамі маёмасці ТАСС.

Патрабуе вырашэння праблема забеспячэння беларускіх сродкаў інфармацыі кадрамі і, адпаведна, іх падрыхтоўка, бо зараз большасць спецыяльных ВНУ (у прыватнасці, паліграфічныя інстытуты) — за мяжою.

На заканчэнне А. Бутэвіч, а таксама прысутны на прэс-канферэнцыі С. Паваляеў, начальнік аддзела друку, радыё і тэлебачання Упраўлення справамі Саўміна РБ, адказалі на пытанні.

Асноўная думка, якую міністр інфармацыі меўся данесці да прысутных, гэта тое, што камерцыялізацыя ў той ці іншай ступені ў хуткім часе закране ўсе выданні, радыё, тэлебачанне. Таму і спадзявацца трэба не толькі і не столькі на дзяржаўны бюджэт, колькі на самаразвіццё сродкаў масавай інфармацыі.

НАШ КАР.

У Мінску адбылося трэцяе пасяджэнне камісіі СНД па разглядзе комплексу пытанняў, звязаных з праваперанасцю ў адносінах дагавораў, якія ўяўляюць узаемную цікавасць, дзяржаўнай уласнасці, архіваў, даўгоў і актываў былога СССР.

Фота Юрыя ПАЎЛАВА (БЕЛТА).

Што ўручыць пасол Садоўскі прэзідэнту Нямеччыны?

Пра тое, што дэпутат Пётр Садоўскі будзе першым паслом Рэспублікі Беларусь у Германіі, ведаў увесь Менск. Шкада, што апазіцыя ў Вярхоўным Савеце будзе аслаблена, але добра тое, што нашу дзяржаву будзе прадстаўляць чалавек, які выдатна ведае і нямецкую мову, і Нямеччыну.

Праз пэўны час Пётр Вінцэнтавіч пераступіць парог рэзідэнцыі Федэральнага Прэзідэнта Нямеччыны Рыхарда фон Вайцзэкера. Сказаўшы некалькі абавязковых фраз, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь уручыць першай асобе Федэратыўнай Рэспублікі...

Што ўручыць філолаг, знаўца не толькі нямецкай, але перш-наперш беларускай мовы П. Садоўскі? Замежныя паслы ў Беларусі ўручаюць С. Шушкевічу **вярыцельныя граматы.** Ужо сем такіх грамат атрымаў Старшыня Вярхоўнага Савета. Не хацелася б, аднак, каб наш пасол уручаў нямецкаму прэзідэнту вярыцельныя граматы. Няхай гэта будзе перш за ўсё ліст. Па-другое, няхай у гэтым лісце будзе выказаны **давер** паслу, тое, што яму **давяраюць** весці справы Беларусі ў Нямеччыне. Такі ліст з такім зместам будзе называцца **даверным лістом.**

Тэрмін не новы. Яшчэ ў 60-я гады нашы філолагі прапаноўвалі памяняць кальку з рускай («вярыцельныя граматы») на **даверчыя лісты.** Згадаем, што менавіта лісты атрымлівалі, едучы ў дарогу, паўнамоцныя паслы Вялікага княства Літоўскага. Спрэчка ідзе пра словы «даверны» і «даверчы». Будзем спадзявацца, што ўрадоўцы ў нашым МЗС і філолаг П. Садоўскі выберуюць найбольш адпаведнае, а пасол П. Садоўскі ўручыць Р. фон Вайцзэкеру не «вярыцельную грамату»...

Ч-ч.

НАСТАЛЬГІЯ—ХВАРОБА НЕБЯСПЕЧНАЯ

«Народная газета» паведаміла 2 чэрвеня г. г., што аддзел адукацыі Кобрынскага гарсавета дапамог Таварыству ўкраінскай мовы імя Т. Шаўчэнкі арганізаваць у школах групы для вывучэння ўкраінскай мовы. З новага навучальнага года замест груп плануецца стварыць цэлыя класы.

Таварыства ўкраінскай мовы найбольш набліжана да Руху. «ЛіМ» ужо не раз пісаў пра дзейнасць рухаўцаў у Беларусі, пра іх жаданне бачыць Берасцейшчыну і Піншчыну ў складзе ўкраінскае дзяржавы. Нават брашуру выдалі — пра тысячагадовае імкненне Берасцейшчыны да Украіны.

1000 гадоў таму назад Украіны не было. Украіна ўзнікла тады, калі вялікія князі Гедымін і Альгерд ўзялі пад сваю ўладу Валынь, Чарнігаўшчыну, Кіеўшчыну ды Падолію. Гэтыя землі сталі называць украінскімі — адсюль і Украіна. У 60-х гг. XVI ст. шляхце ўкраінных земляў вельмі захацелася пад польскую апеку. У 1569 годзе Ратненскі павет перайшоў у склад Польшчы, а шляхта Берасцейскага і Пінскага паветаў пажадала застацца ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Сучасная граніца Беларусі з Украінай амаль дакладна паўтарае мяжу 1569 года.

Паўднёвыя беларускія землі належалі Украіне двойчы: пры кайзеры Вільгельме II ды пры Гітлеры. Мусіць, валынскія рухаўцы ды актывісты Таварыства ўкраінскай мовы з настальгіяй успамінаюць тыя часы. Што і казаць, хвароба небяспечная.

Самае незразумелае тут — пазіцыя мясцовых уладаў. Якая настальгія апанавала іх? Маўчаць КДБ і Пракуратура Беларусі. Маўчыць Міністэрства замежных спраў.

...Ведаць мову суседзяў добра і карысна. Але трэба адрозніваць культурную місію ад палітычнай. Тое, што ўкраінскае міністэрства адукацыі пакідае абітурыентам з Берасцейшчыны месцы ў сваіх ВНУ, недвухсэнсоўна сведчыць аб пэўных тэндэнцыях. Ураду Беларусі трэба было б высветліць, што гэта за тэндэнцыі.

С. А.

1993—ГОД БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Адкрыты ліст Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь сп. Станіславу ШУШКЕВІЧУ і Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь сп. Вячаславу КЕБІЧУ

Паважаныя спадары!

Сябры культурна-асветніцкага клуба «Спадчына» звяртаюцца да Вас з гэтым лістом, каб засяродзіць Вашую ўвагу на наступным.

Ужо больш за два гады дзейнічае Закон аб мовах. І што мы назіраем? Бясконца доўжыцца гаворка аб стварэнні канцэпцыі нацыянальнай адукацыі. Аднак ні нацыянальнай школы, ні нацыянальнага выхавання ў рэспубліцы як не існавала, так і не існуе. Прыняцце Міністэрствам адукацыі рашэння аб скасаванні з пераліку безумоўных патрабаванняў да выкладчыкаў пры праходжанні атэстацыі такога пункту, як неабходнае валоданне беларускай мовай, паказвае, што дзяржава не падтрымлівае мову народа, які стварыў яе і даў ёй імя. Дзе ў свеце, у якой краіне такое магчыма?

Мы жывём зараз у незалежнай дзяржаве. Неад'емным атрыбутам дзяржаўнасці, гэтакім жа, як сцяг, герб, уласныя грошы, з'яўляецца дзяржаўная палітыка, скажам, у галіне інфармацыі. Між тым, даводзіцца канстатаваць, што наша дзяржава не мае ўласнай інфармацыйнай палітыкі. Няма нацыянальнага тэлебачання. Большасць рэспубліканскіх перыядычных выданняў, заснавальнікам якіх з'яўляецца Савет Міністраў, выдаецца на расійскай мове, іншыя друкуюць па-беларуску адну толькі назву. Нягледзячы на запэўніванні аб фінансавай падтрымцы беларускамоўнага друку, па-ранейшаму выданні па гісторыі і культуры Беларусі маюць абмежаваныя мізэрныя наклады і не задавальняюць попыт чытачоў. Усё гэта, як і наяўны недахоп слоўнікаў і дапаможнікаў, спецыяльнай літаратуры па галінах навукі і вытворчасці, асуджае і надалей нашае грамадства на выкарыстанне на працы і ў побыце жахлівага сурагату, трапна названага «трасянкай», ці рускай мовы.

Толькі нацыянальная культура ды мова аб'ядноўваюць народ, робяць яго суб'ектам гісторыі і вызначаюць у канчатковым выніку тое месца ў цывілізаваным свеце, якое ён зойме сярод іншых народаў. Таму ў незалежнай краіне менавіта дзяржава распрацоўвае і праводзіць НАЦЫЯНАЛЬНУЮ культурную палітыку. Адказнасць за гэта нясуць урадавыя структуры, якія, усведамляючы нацыянальныя інтарэсы, абавязаны выкарыстаць усе магчымасці дзеля іх забеспячэння.

У час, калі пасля развалу камуністычнай імперыі побач з нашай Бацькаўшчынай паўсталі нацыянальныя дзяржавы, улады і народы якіх добра ўсведамляюць свае нацыянальныя інтарэсы і адзіныя ў іх правядзенні, Беларусь можа апынуцца ў становішчы сусветнай перыферыі, палітыка якой вызначаецца за яе межамі. Таму гэта вымушае нас звярнуцца да Вас з заклікам усвядоміць сваю адказнасць за лёс нашай мовы і пачаць праводзіць моўную палітыку на Беларусі не на словах, а на справе.

Акрамя зместу гэтай палітыкі, немалое значэнне адыгрывае і форма, у якой гэтая праца будзе праводзіцца. Шырока вядома традыцыя, якой прытрымліваюцца ЮНЕСКА, краіны сусветнай супольнасці: праводзячы палітыку ў галіне культуры, надаваць каляндарнаму году адмысловае найменне, прысвячаць яго вялікім здабыткам культуры, адметным постацям і падзеям гісторыі. Як вядома, 1990 год быў для нас годам Скарыны. Без перабольшвання можна канстатаваць: гэты год дазволіў шмат каму з нас зразумець, што Францішак Скарына — краса і гонар нашай нацыі, што мы — еўрапейскі народ і нам ёсць чым ганарыцца ў сваёй гісторыі, ён паказаў таксама ўсяму свету талент і моц нашага народа і прымусіў гаварыць пра Беларусь. Карысць, якую прынесла культурная праца па правядзенні Скарынаўскага года, значна перавышае ўсе панесеныя выдаткі.

Таму, зыходзячы з вышэйадзначанага, мы звяртаемся да Вас з прапановай абвясціць 1993 ГОД ГОДАМ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ. Той час, які застаецца, дазваляе распрацаваць на дзяржаўным узроўні адпаведныя навуковыя, асветніцкія і мастацкія праграмы яго правядзення, якія павінны ўключаць, напрыклад, выдавецкую дзейнасць, фестывалі беларускай духоўнай і харавой музыкі, фальклорныя святы, стварэнне цэнтраў беларускай культуры, адчыненне беларускамоўных школ, навучальных устаноў і да т. п. Нельга адкладаць надалей і рэформу беларускага правапісу, скалечанага пастановай СНК БССР ад 1933 года. Усё гэта, а таксама многае іншае, можа быць аб'яднана і здзейснена ў межах Года беларускай мовы.

Старшыня клуба «Спадчына», А. БЕЛЫ;
сябры клуба:
Я. ГУЧОК, Я. ЛАУРЭЛЬ, Я. КАЛУБОВІЧ, С. БАГДАНОВІЧ, А. БУДЗЯНОК, С. БАРЫСЕВІЧ, Г. БІЦЕЙ, А. САСКАВЕЦ, Г. СМОЛЯК, А. АНІСЬКА, У. СОДАЛЬ, С. БАРЫС, Я. ПЯТРОЎСКАЯ, М. ЯКАУЛЕЎ і інш.

ХТО ВІНАВАТЫ І ШТО РАБІЦЬ?

Сваё меркаванне выказалі ўдзельнікі сацыялагічнага апытання

Яго вынікам была прысвечана прэс-канферэнцыя, якая адбылася ў Мінску, у выдавецка-паліграфічнай кампаніі «Эрыдан». Паводле заказу гэтай кампаніі група вучоных Сацыялагічнага цэнтра Белдзяржуніверсітэта пад кіраўніцтвам кандыдатаў навук Ж. Грышчанкі і Л. Новікавай правялі даследаванне на тэму: «Сучасная палітычная сітуацыя — ваша меркаванне». Сёлета ў красавіку метадам анкетавання ў сталіцы Беларусі і па ўсёй рэспубліцы было апытана 1465 чалавек. Сацыялагічная выбарка пры гэтым дазволіла ахапіць самыя розныя катэгорыі працаздольнага насельніцтва па такіх крытэрыях, як узрост, пол, сацыяльнае паходжанне, нацыянальнасць, сфера дзейнасці.

Па словах кіраўніка кампаніі «Эрыдан» А. Патупы, гэтыя даследаванні (дакладней — іх першы цыкл) — не разавая акцыя, не даніна модзе, а неабходнасць. Яны выкліканы патрэбай бачыць перспектыву, мець маштабны эканамічны і палітычны прагноз сітуацыі, магчымыя сцэнарыі яе развіцця на Беларусі. Ясна, што такі прагноз цікавіць не толькі прадпрымальнікаў, а даследаванні грамадскай думкі — не толькі спецыялістаў. Таму варта прывесці некаторыя вынікі работы сацыёлагаў БДУ. (На жаль, тут немагчыма прывесці звесткі апытання ва ўсёй іх сукупнасці або каментарыі сацыёлагаў. Прыйдзецца абмежавацца фрагментамі).

Цэлы комплекс пытанняў зводзіўся, калі спрашчаць, да наступнага: хто вінаваты ў крызісе, які мы зараз перажываем, і якія шляхі выйсця з яго?

74 працэнты апытаных ведаюць дакладны адказ на першае пытанне (у іх сфарміравалася пэўнае «аблічча ворага»). Амаль палова гэтых рэспандэнтаў ускладае галоўную адказнасць за крызіс на былы партыйна-дзяржаўны апарат. 27,5 працэнта бачаць галоўнага ворага ў арганізаванай злачынасці (мафіі). 18,5 працэнта схільныя абвінавачваць новых палітычных лідэраў Беларусі... Цяперашні Вярхоўны Савет Беларусі абвінавачваюць 8,6 працэнта. Столькі ж бачаць ворага ў «дэмакратах». Да «патрыётаў» варожа ставяцца 4 працэнты.

64,6 працэнта апытаных лічаць неабходным закон, які б забараняў былым партфункцыянерам займаць кіруючыя пасады. Супраць — 14,5 працэнта.

43 працэнты апытаных выступаюць за прыватную ўласнасць у розных формах, амаль трыццаць працэнтаў — за калектыўную і каля 23 працэнтаў лічаць найбольш эфектыўнай формай уласнасці дзяржаўную.

Незадаволенасць у грамадстве, як паказалі апытанні, сёння вялікая. Пры гэтым найбольш радыкальныя погляды выказваюць галоўным чынам прадпрымальнікі, студэнты і спецыялісты. А найбольш кансерватыўнымі застаюцца апарат кіравання і сялянства. Самае трывожнае, што каля 75 працэнтаў апытаных выказвалі гатоўнасць прыняць удзел у акцыях пратэсту супраць сучаснай сацыяльна-эканамічнай палітыкі.

У чым жа людзям бачыцца выйсце з эканамічнага і палітычнага крызісу? Больш як дзве трэціх выступаюць за больш актыўнае ўкараненне рыначных механізмаў і менш адной пятай — за тое, каб вярнуцца да сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Гэта абнадзейвае. Але, з другога боку, 33,6 працэнта ўпэўнены, што патрэбна «цвёрдая рука» для навядзення парадку ў грамадстве і пакаранне «балбатуноў».

Цікава, што пры ўсім негатыўным стаўленні да КПСС у цэлым, больш за 30 працэнтаў апытаных ставяць ёй у заслугу стварэнне ваенна-прамысловага комплексу. Станоўча ацэньваюцца таксама НЭП і эканамічнае развіццё СССР да 1985 года. Найбольшае асуджэнне ў народзе выклікаюць сталінскія рэпрэсіі (68,6 працэнта лічаць іх злачынствам кампартыі), пралікі ў нацыянальнай палітыцы і Чарнобыль. Цікава, што звыш 17 працэнтаў апытаных адносяць да злачынстваў КПСС... перабудову. (А 27,7 лічаць перабудову памылкай.)

Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю 35,5 працэнта апытаных ацэньваюць як злачынны дзяржаўны пераварот. І толькі 16,1 працэнта ставяцца да Кастрычніка 17-га станоўча.

Асобны блок склалі ў даследаванні пытанні аб мове. Ці трэба тлумачыць, якую ролю адыгрывае гэтае пытанне зараз у жыцці нашай рэспублікі? Апытанне паказала, што 17 працэнтаў рэспандэнтаў выступаюць сёння за тое, каб дзяржаўнай мовай у рэспубліцы была беларуская, 7,8 — руская і 74,1 працэнта — беларуская і руская. 17 працэнтаў — быццам бы, не так і мала. Аднак за тое, каб выкладанне ў школах і ВНУ вялося на беларускай мове, выказаліся ўсяго 6,5 працэнта ўдзельнікаў апытання. Звыш 80 працэнтаў — за выкладанне на рускай і беларускай мовах.

Ясна, што на падставе аднаго даследавання нельга рабіць канчатковыя высновы. Кіраўнікі навуковай работы, дарэчы, пазбягалі катэгарычных ацэнак. Але ясна і іншае: мы пакуль вельмі кепска ведаем грамадства, у якім жывём. Вельмі цьмянае ўяўленне пра грамадскі настрой, яго змены, тэндэнцыі грамадскай думкі маюць у эшалонах улады рэспублікі. І невыпадкова сацыёлагі БДУ гаварылі аб неабходнасці каардынацыі намаганняў розных сацыялагічных структур (а іх зараз нямала ў рэспубліцы) для таго, каб здзейсніць прарыў у фундаментальным вывучэнні сучаснага стану грамадства.

Віталь ТАРАС.

КПБ=ПКБ?

Пасляслоўе да аднаго судовага працэсу

Недзе, здаецца, у кастрычніку мінулага года ў рэдакцыю пазваніў наш чытач з Вілейкі і паведаміў, што ў будынку былога райкома КПБ адбыўся сход членаў КПСС, на якім былі абраны дэлегаты, як ён сказаў, на нейкі з'езд камуністычнай партыі.

— Што ж гэта робіцца? — з абурэннем пытаўся чытач. — Дзейнасць КПСС-КПБ Вярхоўным Саветам Беларусі прыпынена, уся яе маёмасць, у тым ліку памяшканні, узяты органамі ўлады пад ахову, апячатаны, а нашым партыйным наменклатуршчыкам ніякія законы не пісаны, яны па-ранейшаму адчуваюць сябе гаспадарамі...

Я тады пазваніў Генеральнаму пракурору рэспублікі М. Ігнатовічу і расказаў пра званок з Вілейкі. Мікалай Іванавіч у адказ сказаў:

— Я магу вам прачытаць па тэлефоне цэлы спіс гарадоў рэспублікі, дзе ў памяшканнях былых партыйных камітэтаў прайшлі аналагічныя сходы.

— І як на гэта зрэагавала мясцовая пракуратура? — пацікавіўся я.

— Арганізатары гэтых «мерапрыемстваў» строга папярэджаны, — адказаў Генеральны пракурор.

Тым не менш, на пачатку студзеня 1992 года ў Мінску адбыўся ўстаноўчы з'езд так званай партыі камуністаў Беларусі, на якім былі прыняты статут і праграмная заява, іншыя пастановы і рэзалюцыі. На з'ездзе быў абраны палітвыканком з сустаршынямі У. Сямёнавым, А. Лашкевічам, В. Чыкіным, якія да жнівеньскіх падзей мінулага года былі адпаведна першым сакратаром Гродзенскага абкома, сакратарамі Мінскага абкома і Мінскага гаркома Кампартыі рэспублікі. Яшчэ адным сустаршынёй стаў І. Каратчэня, народны дэпутат Беларусі (дарэчы, пры размеркаванні абавязкаў паміж сустаршынямі яму «дастаўся» ці не самы адказны ўчастак — «узаемадзеянні палітвыканкома з фракцыяй Вярхоўнага Савета з ліку народных дэпутатаў - камуністаў і тых, хто падтрымлівае ПКБ»).

Далей падзеі разгортваліся наступным чынам. 16 сакавіка г. г. Міністэрства юстыцыі рэспублікі адмовіла ПКБ у рэгістрацыі, матывуючы сваё рашэнне цэлым шэрагам прычын, галоўная з якіх — партыя камуністаў Беларусі не з'яўляецца новай партыяй, па сваіх мэтах і задачах яна нічым не адрозніваецца ад былой кампартыі Беларусі, дзейнасць якой прыпынена вышэйшым органам улады рэспублікі.

14 мая судовая калегія Вярхоўнага суда Беларусі, разгледзеўшы скаргу ПКБ на Мінюст рэспублікі, абавязала апошні зарэгістраваць партыю камуністаў ва ўстаноўленым парадку...

Зараз, перагортваючы блакнот з занатоўкамі, зробленымі на тым, фактычна палітычным, працэсе, амаль не заўважаным, на жаль, шырокай грамадскасцю, я зноў і зноў прыходжу да сумнай высновы: прагнозы многіх дэмакратычных публіцыстаў аб тым, што камуністычная партыя ўжо ніколі не акрыяе, былі прадыктаваны больш эйфарыяй, спароджанай разгромам ГКЧП, чым цвярозым аналізам сапраўднага становішча спраў. Пра гэта думалася і ў час выступленняў на працэсе, нагаданага вышэй А. Лашкевіча і члена палітвыканкома партыі камуністаў, старшыні Савецкага райсавета народных дэпутатаў г. Мінска С. Калякіна, якія прадстаўлялі на судзе інтарэсы ПКБ. Былая камуністычная наменклатура, пераадолеўшы разгубленасць і страх, што апанавалі ёю пасля роспуску КПСС, пачала супакойвацца і зараз, пусціўшы ў ход напрацаваныя гадамі палітычны авантурызм, напорыстасць і непераборлівасць у сродках для дасягнення пастаўленай мэты, імкнецца аднавіць страчаныя пазіцыі «кіруючай і накіроўваючай».

Цяперашнія камуністычныя лідэры нядрэнна авалодалі майстэрствам мімікрыі, разумеючы, што КПСС-КПБ канчаткова скампраметавала сябе ў вачах народа, а таму на словах гатовы падтрымаць дэмакратычныя пераўтварэнні ў дзяржаве. Вось чаму Лашкевіч і Калякін з такім імпэтам пнуліся даказаць, што ПКБ карэнным чынам адрозніваецца ад сваёй папярэдніцы — кампартыі Беларусі, хоць бы ўжо ў тым, што дэкларуе шматпартыйнасць, плюралізм думак, іншыя дэмакратычныя свабоды. А наогул, у іх выступленнях было нямала спасылак на законы рэспублікі, якія быццам бы парушыў Мінюст, адмовіўшы ПКБ у рэгістрацыі. Дзіўна было гэта слухаць ад прадстаўнікоў камуністычнай партыі (А. Лашкевіч адзначыў на судзе, што фармальна па-ранейшаму з'яўляецца сакратаром Мінскага абкома КПБ, бо ніхто яго з гэтай пасады не здымаў), якая на працягу ўсёй сваёй гісторыі ўпарта дэкларавала адносна любых юрыдычных законаў — законна толькі тое, што адпавядае яе інтарэсам, якая распраўлялася з іншадумствам, як з самым страшным злачынствам.

Дык адрозніваецца ў нечым ПКБ ад КПБ? У падшытай да судовай справы (прачытаць яе мне ўдалося толькі пераадолеўшы пэўнае супраціўленне некаторых членаў Вярхоўнага суда) «Праграмнай заяве», прынятай устаноўчым з'ездам ПКБ, чорным па белым напісана: «Мы, дэлегаты ўстаноўчага з'езда партыі камуністаў Беларусі, заяўляем, што ПКБ уступае на арэну палітычнай дзейнасці ў якасці праваперaемніцы КПБ і бярэ на сябе адказнасць за камуністычны рух работнікаў наёмнай працы і іх саюзнікаў на тэрыторыі Беларусі... Захоўваючы лепшыя традыцыі КПБ — праверанага справай атрада КПСС, ПКБ у той жа час рашуча адмяжоўваецца ад службовых асоб КПСС-КПБ, якія скампраметавалі партыю, здрадзілі яе камуністычным ідэалам». Нягледзячы на крытыку ананімных «здраднікаў», накіраванасць і сутнасць «новай» партыі гранічна відавочныя. Адным словам, крамка гандлюе тым жа таварам, толькі шыльду змяніла...

Здавалася б, безнадзейная для «новых» камуністаў сітуацыя. Але і тут яны пачынаюць выкручвацца. С. Калякін зачытвае ісковую заяву ПКБ, дзе па гэтым пытанні гаворыцца наступнае: «Сцвярджэнні Мінюста аб тым, што ПКБ абвяшчае сябе праваперaемніцай КПБ і заявіла прэтэнзіі на яе маёмасць, не мае адносін да пытання рэгістрацыі партыі і, акрамя таго, не адпавядае сапраўднасці. Так, у частцы 2 пункта І рэзалюцыі ўстаноўчага з'езда «Аб стварэнні ПКБ» запісана: «У выпадку, калі дзейнасць КПБ не будзе адноўлена, або калі яна будзе ліквідавана, ПКБ становіцца яе праваперaемніцай... На сённяшні дзень КПБ не забаронена і не ліквідавана, у сувязі з чым пытанне аб пра-

(Працяг на стар. 4).

МЫ І СВЕТ

За інтарэсы трэба змагацца

Яшчэ не выпарыўся водар палітычнага шарму ад знаходжання ў Мінску дэлегацыі Савета Еўропы (СЕ) — міжурадавай арганізацыі дзеля цеснага «еўрапейскага згуртавання», а мерка «дэмакратычнай сталасці» Беларусі на наданне ёй статуса «спецыяльна запрошанай» у СЕ вымагае самакрытычнага погляду.

Як вядома, Савет Еўропы, куды, апроч нашай рэспублікі, хочуць патрапіць Арменія, Украіна, Азербайджан і інш., канцэнтруе сваю дзейнасць на пытаннях правоў чалавека, гуманітарнага, прававога і сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва, культуры, ЭКАЛОГІІ І ІНФАРМАЦЫІ (выдзяленне маё. — АУТ.). Вядома ж, да паўнапраўнага членства ў СЕ нам яшчэ вельмі далёка, а на прадстаўніцтва рэспублікі ў якасці «спецыяльна запрошанай» грэх не разлічваць.

Тут, вядома, узнікае цэлы шэраг пытанняў, якія трэба вырашаць, «падцягваць» да сапраўды еўрапейскіх стандартаў. Аднак рабіць гэта трэба не дзеля пратакола і дамарослай паказухі, а з будзённай прагавітасцю справы, пачуццём пастаянства і чыннай сталасці. І не перакладваючы на заўтрашні дзень.

Вось толькі адзін свежы прыклад, які, на жаль, сведчыць пра адваротнае. З чэрвеня, як вядома, у Рыо-дэ-Жанейра адкрылася Канферэнцыя ААН па навакольным асяроддзі і развіцці. Па сутнасці, гэта першы ў гісторыі міжнародны экалагічны і эканамічны форум на вышэйшым узроўні, дзе, магчыма, будзе прынята «Хартыя Зямлі» — дэкларацыя аб галоўных прынцыпах паводзін дзяржаў, якія б гарантавалі чысціню навакольнага асяроддзя. Прапануецца таксама праект «Парадку дня XXI» з міжнароднай стратэгіяй і праграмай дзеянняў, будуць прыняты канвенцыі па клімаце і біялагічнай разнастайнасці. Сустрэча ў Рыо, несумненна, стане сусветным форумам у інтарэсах Зямлі. Несумненна і тое, што ўдзел Беларусі ў Канферэнцыі адпавядае як нашым карэнным палітычным і эканамічным інтарэсам, так і інтарэсам Еўропы.

Застаецца галоўнае — за інтарэсы трэба змагацца. Інтэлектуальна, палітычна, інфармацыйна. З гэтага пункту погляду паглядзім на склад дэлегацыі. Едуць у Рыо кіраўнік парламента Станіслаў Шушкевіч, старшыня Дзяржкамітэта па экалогіі Анатоль Дарафееў, міністр замежных спраў Пётр Краўчанка і супрацоўнік МЗС Аляксей Мажухоў. Каманда не столькі традыцыйная, колькі малалікая, асабліва калі браць пад увагу мерку міжнароднага прадстаўніцтва (у сярэднім колькасць дэлегацыі ад адной краіны 15—25 чалавек).

Мяркуецца ўдзел 175 краін-членаў ААН, дзвюх тысяч журналістаў. Лёгка падлічыць і выказаць меркаванне, што большасць дзяржаў паклапацілася пра галоснасць і прапаганду ідэй «Хартыі Зямлі». Мы ж паранейшаму абыходзімся без прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, пакідаючы ім вядомы шанц з'ездзіць хіба што «ў Пухавічы».

Тым часам паралельна Канферэнцыі будзе праходзіць глабальны форум неўрадавых арганізацый, шэраг іншых мерапрыемстваў з удзелам прадстаўнікоў сусветных дзелавых і навуковых колаў, журналістаў і грамадскасці. Аднак, зноў жа, як ні будуць гукаць там беларускіх «нефармалаў» — не дагукаюцца. Яны засталіся дома.

Няма сур'ёзных падстаў спасылацца пры гэтым на адсутнасць сродкаў, валюты. Хіба нельга было дзеля прэстыжу і відавочнага прыярытэту сэканоміць на бясконцых і часам малаэфектыўных ваяжах за мяжу розных дзяржаўных чыноў, на складзе шматлікіх дэлегацый, на якія выдаткоўваюцца тыя ж немалыя сумы дзяржаўных грошай?..

Можна сказаць, калі на тое, і пра падрыхтоўку ў Рыо Дзяржаўнага (Нацыянальнага) даклада аб стане прыроднага асяроддзя ў РБ. Мала таго, што яго змест, якасць і ўзровень аналізу, паводле не самых высокіх крытэрыяў, ледзьве дасягаюць горшых узораў справаздачы, дык ён яшчэ і спазніўся траха не на паўгода, што відавочна супярэчыць агульнапрынятаму пратаколу міжнароднай сустрэчы ў вярхах. Варта жалю, што ні ў навуковых колах рэспублікі, ні ў шэрагу грамадскіх экалагічных суполак і арганізацый даклад не стаў прадметам зацікаўленага абмеркавання, выспяваў у кабінетных цяпліцах ведамаснага «падполля» і таму не можа пацвердзіць ролю інтэгруючага экалагічна-грамадзянскую свядомасць дакумента.

Экалогія і інфармацыя — рэчы, якія безумоўна паказваюць на дэмакратычную сталасць любой краіны. Без імкнення штодня працаваць на свой палітычны, эканамічны, інфармацыйны імідж не суцяшае і перспектыва рэспублікі быць «спецыяльна запрошанай» хоць у СНД, хоць у СЕ...

Валерый ДРАНЧУК.

З ПОШТЫ «ЛіМа»

АДРАДЖЭННЕ: вяртанне да вяршынь ці дабудова нацыі?

У лістападзе 1991 г. ў Маскве святкавалася 20-годдзе канцэртнай залы «Расія». Значнае грашовае ахвяраванне на ягонае аднаўленне зрабіў «Беларускі тэатр Ціхановіча і Паплаўскай» (так яго прадставілі). У спадара Ціхановіча быў вельмі разгублены выгляд, калі вясёлы вядучы спытаўся ў яго, адзінага нерасійскага спонсара, у якой валюце ён робіць унёскі, дадаўшы, што яго цікавіць назова будучай беларускай валюты. Падалося, што спадар Ціхановіч упершыню пачуў гэткае...

Што казаць, нагода гэтая нязначная, але выклікае даўжэзны ланцуг думак-пытанняў. ПЕРШАЕ. Ці слушна гэткая зычлівасць, калі Расія адмяняе канцэрт памяці М. Багдановіча ў Маскве («святкуйце на Беларусі»), Массавет не дае сродкаў на беларускія імпрэзы («няхай дае Беларусь»), а мы ўсё часцей чуем па розных нагодах: «Не падабаецца, ад'язджайце на Беларусь!» Цікава, ці кажуць так на Беларусі расіянам?

Другое. Ці слушна лічыць беларускім усё, што знаходзіцца на Беларусі альбо зыходзіць з яе?.. Украінцы па-за межамі Украіны ставяцца адзін да аднаго вельмі спрыяльна. Прыгадваю, як два гады таму падчас пікетавання былога Мінатамэнерга ў гадавіну чарнобыльскай навалы прадстаўнікі пікетчыкаў былі запрошаны для размовы да тагачаснага намесніка міністра. Высветлілася, што ён украінец, і далейшая гутарка йшла толькі паміж імі і «рухаўцамі», яго ідэйнымі праціўнікамі, але перадусім — супляменнікамі. Украінскія суполкі заўжды атрымлівалі дапамогу ад урадавых і камуністычных устаноў, калі там знаходзіўся хоць бы адзін украінец...

Калі я ўжо згадаў украінцаў, дык трэба адзначыць, што на Украіне нават у час наймацнейшага вынарадавання можна было ўсюды спаткаць людзей у вышытых сарочках, прынцыпова размаўляўшых толькі па-ўкраінску. І іх віталі іншыя людзі. Паспрабуйце на Беларусі адшукаць у крамах нацыянальную сарочку — яны вырабляюцца толькі па «спецзаказах». Летась мы святкавалі Купалле разам з прыбалтамі: яны ўсе ў нацыянальных строях, а з нашых адно ў двух былі гэткія (адну падаравалі эмігранты з «Васілька»).

ТРЭЦЯЕ. Ці мае дачыненне да беларускай культуры сучасная творчая і мастацкая інтэлігенцыя Беларусі? Думаю, што, апрача малой часткі яе, — ніякага, нават калі апранаецца ў нацыянальную вопратку. Здаецца, чым вышэй ранг мастака, спевака, кампазітара, тым далей ён ад беларускай глебы. І тым мацней у ім трымаецца саўдэпаўская ментальнасць.

Чацвёртае. Калі творчая інтэлігенцыя авалодала, прынамсі, рускай ці нават сусветнай культурай (скажам, пяюць арыі з рускага ці італьянскага рэпертуару), дык інтэлігенцыя нятворчая (тэхнічная, службовая і інш.), — ані руская, ані беларуская. А хтосьці са славутых сказаў: «Якая інтэлігенцыя, такі і народ»...

Згадваю аднаго свайго сваяка, высокаадукаванага чалавека, галоўнага канструктара, выпускніка яшчэ даваеннай (!) беларускай школы. Ён цалкам забыўся на мову, на нацыю, і прызнаваўся, што ён беларус, толькі калі выказваўся нецэнзурна: «Как говорят по-нашему, по белорусски, мать-твою-перемать»...

Альбо другая разнавіднасць інтэлігенцыі — афіцэры. Зараз згуртаванне беларускіх вайскоўцаў прывабіла да сябе ў Маскве шмат афіцэраў, чым надта ганарыцца. Але ніводзін з іх не гаворыць па-беларуску, не цікавіцца беларускай ідэяй, нават не падзяляе імкнення да нацыянальнага войска. Як жа яны будуць выхоўваць жаўнераў?! (Праўда, супакоіўшыся, трэба пагадзіцца з кіраўнікамі згуртавання: добра і тое, што яны прыйшлі да нас, а не да «маёра Савецкай Арміі»: ёсць надзея на перавыхаванне).

ПЯТАЕ. Ці магчыма зараз у кароткі тэрмін узняць узровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў да ўзроўню суседзяў? Альбо: ці магчыма зараз перанесці ўвагу людзей з матэрыяльнай у духоўную сферу? Лічу амаральным з боку вядомых дзеячаў упікаць людзей за тое, што яны «ставяць кілбасу вышэй за мову». Можна зрабіць гэткі дакор тым, для каго моўная ці культурная праца ёсць службовы абавязак, — але недапушчальна папракаць якую-небудзь маці-адзіночку з заробкам у чатыры сотні рублёў у занядбанні мовы. Зразумела, тыя дзеячы пражылі жыццё і «зрабілі імя» ў варунках, калі змаганне за захаванне нацыянальнай культуры было вяршыняй легальнага дысідэнцтва. Але зараз іншы час, мы перабудоўваем жыццё, а яго суцэльнае, і КУЛЬТУРНАЕ АДРАДЖЭННЕ НЕПАРЫЎНА ЗЛУЧАНА З САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ.

Адсюль шостае і апошняе пытанне: што ёсць Адраджэнне? Звычайна пад ім разумеюць вяртанне да вышынь росквіту беларускага духу ў літаратуры, палітыцы і г. д. Эканоміка не прыгадваецца, але ж умовы XVI стагоддзя непараўнальныя з умовамі XX ст.! Відаць, трэба ўсё ж разважаць не пра Адраджэнне да нейкага нявызначанага ўзроўню, але пра дабудову нацыі. Бо яе фармаванне было ў нейкі час прымусова прыпынена ці, дакладней, надта замаруджана і таму не скончана дасюль. Таму беларусы так лёгка адыходзяць да другіх народаў: яны не адчуваюць пад сабой трывалай глебы — гістарычнай ці, напрыклад, літаратурнай, як, скажам, рускія, немцы альбо кітайцы. Гэтую скарбніцу трэба яшчэ **стварыць.**

Але хто павінен гэта зрабіць і ў які тэрмін? Лідэраў новай эпохі трэба шукаць не ў прэзідыумах, а на студэнцкай лаве і ў аспірантуры. Гэта будуць «нацыяналісты» ў папраўдзе рацыянальным (па С. Дубаўцу) сэнсе гэтага слова, бо «нацыяналіст» ёсць таксама «народнік». (Дарэчы, палякі не ўжываюць гэтага слова (нацыяналіст); у іх не «нацыя», але «народ», не «нацыянальны», але «народовы»). «Нацыяналіст» ёсць ганебнае слова толькі ў вуснах савецка-бальшавіцкіх ідэолагаў, сароміўшых ідэйных праціўнікаў.

Ацэньваць скутак дзейнасці людзей трэба адно з пункту гледжання, якую карысць даў ён свайму народу. У гэтым звязку можна параўнаць, хто больш каштоўны для Радзімы: Пётр Машэраў ці Радаслаў Астроўскі? Не вызначаючы наперад вынік, але і без шораў. Дапушчальна ганарыцца службай свайму народу, Беларусі, але не Сталіну, Гітлеру, Чынгісхану, Напалеону і г. д. Таксама апраўданы любы палітычны саюз на карысць Беларусі. Чаму, напрыклад, не пасябраваць з Германіяй? Яна ў стане дапамагчы эканамічна...

Які ж скутак гэтага разважання? Трэба вырабляць «новае мысленне». Засяродзіць увагу на «выхаванні выхавальнікаў»; ствараць моцны і трывалы шыхт свядомых, адданых і адукаваных беларусаў, у першы чарод настаўнікаў, інжынераў, афіцэраў, аграномаў, лекараў. Прыняць, што справа Адраджэння — чын доўгіх гадоў; усвядоміць, што зараз такіх выхавальнікаў замала, каб імкнуцца да хуткага перавыхавання ўсяго народа.

Абавязкова трэба злучаць духоўнае выхаванне са штодзённай эканамічнай працай. Сёння ніводзін рух на Беларусі не мае дасканалай эканамічнай праграмы, а калі мае, дык шырокія колы не ведаюць яе. (Таму БНФ часта блытаюць з ТБМ, асабліва ў глыбінцы). Без сацыяльна-эканамічнай дзейнасці Адраджэнне будзе заклятым, як гісторыя Старажытнага свету.

Галоўнае — не сварыцца. Можна спрачацца па прыватнасцях, але трэба пагадзіцца ў галоўным: выратаваць Беларусь.

Алесь ДРАЯНКОЎ,
старшыня Рады
Маскоўскага таварыства
беларускай культуры
імя Ф. Скарыны.

СПАДНІЦЫ... НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

Калі я наведваў у майскія дні кнігарні Мінска, мне хацелася, вобразна кажучы, выць, як у піліпаўку воўк. Мяркуйце самі: у адных кнігарнях аддзелы беларускай літаратуры адметныя... пустымі паліцамі (напрыклад, кнігарня «Цэнтральная», праспект Ф. Скарыны, 19), у другіх аддзелы беларускай літаратуры наогул знікаюць (кнігарня № 6, вул. Кірава, 3), а на іх месцы з'яўляюцца аддзелы для абслугоўвання нуварышаў (ад французскага «нуво рыш» — новыя багацеі). Яны нагадваюць ці не амерыканскія супермаркеты на фоне нашай убогай рэальнасці.

Такога крайне крызіснага становішча з беларускамоўнай літаратурай яшчэ не было ні пры адным складзе Вярхоўнага Савета рэспублікі, як бы адмоўна ён ні ставіўся да беларускай мовы. Думаю, што гэты мой закід дойдзе і да цяперашняга Старшыні вярхоўнай улады рэспублікі, які да таго ж з'яўляецца сынам вядомага беларускага паэта. Вядома, нельга вінаваціць у гэтым становішчы толькі С. С. Шушкевіча, але менавіта ён павінен спытаць з вінаватых, бо нацыя ніколі не даруе бяздзейнасці ў гэтым пытанні.

Менавіта тут заселі нядобразычліўцы беларушчыны, бо менавіта яны ў адказе за тое, што мы бачым на паліцах нашых кнігарань. А да таго, што бачым, мы даўно ўжо прывыклі, і нам ужо не моташна ад голых азадкаў.

Чым абгрунтаваць гэта? Абгрунтую на сваім прыкладзе.

У свой час выдавецтва «Навука і тэхніка» прапанавала мне напісаць дапаможнік па міжнароднай мове эсперанта. Я яго напісаў, як было дамоўлена, на беларускай мове, хоць і з вялікай цяжкасцю, бо і школу і інстытут, вядома ж, заканчваў на рускай мове. Пры абмеркаванні тыражнасці я прапанаваў выдаць кнігу тыражом 30 тысяч паасобнікаў, бо адпаведных дапаможнікаў нават на рускай мове немагчыма знайсці ў свабодным продажы, а на беларускай дапаможнік па міжнароднай мове наогул будзе выходзіць упершыню, ды і цікавасць да эсперанта ў рэспубліцы даволі высокая. Выдавецтва вырашыла выдаць кнігу тыражом 10 тысяч паасобнікаў. Аднак аб'яднанне «Белкніга» «зарэзала» тыраж, заказаўшы толькі дзве тысячы, бо кніга выходзіць на беларускай мове.

Калі ж я звярнуўся да загадчыцы кнігарні № 42 (праспект Ракасоўскага, 114) з пісьмом-заказам на тысячу паасобнікаў маёй кнігі, дык яна праз некалькі дзён пасля кансультацый з супрацоўнікамі «Белкнігі» наогул адмовілася прыняць ад мяне заказ хоць бы на мінімальную колькасць, спаслаўшыся менавіта на «Белкнігу».

Я пішу гэты ліст не таму, што непакоюся пра лёс менавіта сваёй кнігі. Я непакоюся пра лёс беларускамоўнай кнігі наогул (не толькі беларускіх пісьменнікаў), і таму заклікаю: ратуйце беларускую мову і беларускамоўную кнігу ў дзяржаве, якая абвясціла менавіта беларускую мову — дзяржаўнай.

А. ПАЎЛЮКАВЕЦ.
г. Мінск.

БЕЛАРУСЬ — КРАІНА ЦІ НЕ?

«Дзіўнае пытанне», — скажа жыхар Рэспублікі Беларусь. Скажа, але, на жаль, не кожны. Нават вядучая папулярнай перадачы «Радыёфакт» Алена Швайко хуценька паправілася, калі назвала Беларусь нашай краінай. Трэба было, маўляў, сказаць «наша рэспубліка».

Аб такім вось сумным «радыёфакце» даведаўся я раніцай 27 мая г. г. і падумаў: калі ў вачах паважанай вядучай мая Беларусь як бы яшчэ не краіна (дзякуй, што ўжо не «Северо-Западный край»), то дзе ж я жыву? У Расіі, ці што? Бо СССР амаль паўгода, як няма, а СНД — не дзяржава.

Я не прыхільнік таго, каб пасля кожнага «пракола» кідаць каменем у журналістаў. Тым больш у тых, хто працуе ў прамым эфіры. Але праз дзве гадзіны пасля «Радыёфакта», калі па той жа першай праграме Беларускага радыё абвяшчалі назву інфармацыйнага выпуску «Рэспубліка. Садружнасць. Свет», давялося ўсё-такі схапіцца за галаву: замест «садружнасць» дыктар прачытала «краіна» (інакш кажучы, прагучала ранейшая рубрыка перадачы). Зноў не ведаў, што і думаць адносна наймення краіны...

Камусьці ўсё гэта можа здацца дробяззю, да якой не трэба чапляцца. А ў мяне вельмі прыкры асадак застаўся на душы ад «радыёпраколаў», так бы мовіць, адной накіраванасці. Не, я не збіраюся кагосьці падазраваць у кепскіх намерах. Але хачу спытаць: мабыць, хопіць нам тужыць па мінулым, па былой імперыі, увесь час пакланяцца «старэйшаму брату».

Што датычыць згаданага выпуску навін, то мяне не можа задаволіць і мадыфікаваная рубрыка, пад якой ён ідзе зараз у эфір. На мой погляд, усё стане на сваё месца, калі назва перадачы будзе гучаць так: «Краіна (г. зн, Беларусь). Садружнасць. Свет». Не сумняваюся, што такая прапанова знойдзе падтрымку ў таго, хто заклапочаны справай нацыянальнага Адраджэння, для каго незалежнасць нашай Бацькаўшчыны — не пусты гук.

Г. ЛАГУНОВІЧ,
ветэран вайны, афіцэр
у адстаўцы.
г. Мінск.

КПБ=ПКБ?

(Пачатак на стар. 3).

вапераемнасці застаецца адкрытым і носіць дэкларатыўны характар».

Як гэта ні дзіўна, але члена Вярхоўнага суда В. Вышкевіча, які старшыняваў на працэсе, такое «тлумачэнне» задаволіла. І ў рашэнні судовай калегіі будзе потым запісана: «У праграмнай заяве партыі камуністаў Беларусі і рэзалюцыі «Аб утварэнні партыі камуністаў Беларусі», прынятых устаноўчым з'ездам, сапраўды ўказваецца на тое, што партыя камуністаў Беларусі «ўступае на арэну палітычнай дзейнасці ў якасці праваперaемніцы Камуністычнай партыі Беларусі...» Аднак, як **вынікае з тлумачэнняў прадстаўнікоў палітвыканкома партыі А. Лашкевіча і С. Калякіна** (падкрэслена мной. — **М. З.**), пад тэрмінам «праваперaемніцтва» ўстаноўчы з'езд ПКБ мае на ўвазе пераемнасць лепшых традыцый КПБ...» Цікава было б даведацца ў В. Вышкевіча і яго калег, што яны маюць на ўвазе, гаворачы пра «лепшыя традыцыі КПБ»?

Не хаваў сваіх сімпатый да ПКБ і пракурор аддзела Пракуратуры рэспублікі І. Давыдоўскі, які з пахвалой адазваўся аб імкненні партыі камуністаў стаць партыяй парламенцкага тыпу, аб яе дэкларацыях на карысць дэмакратычных свабод, шматпартыйнасці і да т. п. Ён начыста абверг сцвярджэнні Мінюста аб тым, што ў сваіх дакументах ПКБ выказвае прэтэнзіі на маёмасць былой КПБ. «Тое, што там напісана, не мае юрыдычнай сілы, з такім жа поспехам я мог бы сёння прэтэндаваць на маёмасць Ракфелера», — пажартаваў ён. Такія жартачкі...

Усплыло на судзе і нямала іншых фактаў, якія досыць поўна характарызавалі і маральнае аблічча «новай» партыі. Нават у падрыхтоўцы і правядзенні свайго ўстаноўчага з'езда яна ва ўсім трымалася традыцый і практыкі КПСС-КПБ. Зробленая Мінюстам праверка засведчыла ігнараванне ініцыятыўным камітэтам па скліканні з'езда дэмакратычных норм пры правядзенні выбарчых сходаў, выбараў дэлегатаў на з'езд. Ды і сам прыём у члены ПКБ праводзіўся (і праводзіцца) шляхам перарэгістрацыі членаў КПСС з адпаведнай адзнакай у старых партбілетах.

Паводле звестак, прыведзеных на судзе намеснікам начальніка аддзела грамадскіх аб'яднанняў Мінюста М. Сухіным, з 284 дэлегатаў, якія прымалі ўдзел у рабоце з'езда, паўнамоцтвы толькі 86 былі пацверджаны пратаколамі выбарчых сходаў, дакументамі мандатных камісій і да т. п.

Але і да гэтых шакіруючых фактаў і суддзі, і пракурор аднесліся індыферэнтна, задаволіўшыся блытанымі тлумачэннямі прадстаўнікоў палітвыканкома ПКБ, накшталт таго, што грамадскім аб'яднанням прадастаўлена права самім вырашаць нормы ўнутранага жыцця. Адносна прыведзеных Мінюстам фактаў арганізацыі выбарчых сходаў партыйнай наменклатурай на месцах А. Лашкевіч і С. Калякін выказаліся ў тым сэнсе, што няма такога закона, які б забараняў членам адной партыі прымаць удзел у стварэнні другой.

Сёння пракамуністычныя выданні, накшталт «7 дзён», «Славянских ведомостей», «Мы и время», б'юць у літаўры з нагоды рашэння Вярхоўнага суда аб рэгістрацыі ПКБ. «Мы и время», рэдактарам якой з'яўляецца сустаршыня палітвыканкома партыі камуністаў Беларусі В. Чыкін, змясціла на першай старонцы пад шапкай «Ёсць такая партыя!» (што, відаць, павінна нагадаць чытачу пра вядомую рэпліку Леніна, сказаную ім у дакастрычніцкі час у адказ на выступленне меншавіка Чхеідзе, які даводзіў, што не ведае ў Расіі партыі, якая б мела рэальныя магчымасці ўзяць уладу) малюнак з выявай двух бегуноў, адзін з якіх з надпісам на грудзях «ПКБ» перахоплівае эстафетную палачку ў другога, пазначанага абрэвіятурай — «КПБ»... Вось так. На малюнку ўсё «сказана» прамым тэкстам. Без камуфляжу, як гэта рабілі на судзе прадстаўнікі «новай» партыі.

Такім чынам, на палітычным небасхіле рэспублікі з'явілася новая «парламенцкая» партыя. Ці не павядзе яна сябе, як тое зязюляня, якое, вылупіўшыся ў чужым гняздзе, адразу пачынае знішчаць птушанят — яго законных насельнікаў? Так яно «запраграмавана»...

Міхась ЗАМСКІ.

БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

ВЫЙСЦІ З НАЦЫЯНАЛЬНАГА АНАБІЁЗУ

ГІСТАРЫЧНЫ лёс беларускага народа з'яўляецца, на думку многіх, надзвычай адметным, дзіўным і своеасаблівым. Безумоўна, у падобным меркаванні ёсць вельмі значная доля ісціны. Дык у чым жа канкрэтна выяўляецца адметнасць станаўлення і развіцця культуры, мовы беларусаў, спецыфічныя рысы нацыянальнага светапогляду і самасвядомасці беларускага народа? Адказ на дадзенае пытанне ўвогуле досыць складаны, няпросты. Думаецца, тут неабходна аб'яднанне творчых намаганняў прадстаўнікоў розных навуковых дысцыплін — гісторыкаў, філосафаў, этнолагаў, літаратуразнаўцаў і г. д. Аднак, на маю думку, пры вырашэнні праблем, звязаных з эвалюцыяй нацыянальнай свядомасці, з раскрыццём аўтэнтычных бакоў характару беларусаў, немагчыма абысціся без комплекснага, шматпланавага падыходу, у якім былі б адначасова выкарыстаны самыя разнастайныя метады і формы даследавання.

Зыходзячы з гэтага, немалаважнае значэнне мае так званы сацыяльна-псіхалагічны аналіз дзейнасці гістарычных асоб і асобных груп, катэгорыі насельніцтва той ці іншай дзяржавы. На жаль, калі ў большасці цывілізаваных краін Захаду падобныя распрацоўкі шырока вядуцца ўжо некалькі дзесяцігоддзяў, у нашай рэспубліцы, а ў пэўнай меры і ва ўсёй Садружнасці, на іх практычна ніхто не звяртае ўвагі, і робяцца (у лепшым выпадку) толькі першыя няўпэўненыя крокі ў такім напрамку. Да сораму сучасных вучоных, у Рэспубліцы Беларусь нават і да цяперашняга часу няма аніякіх (хоць нязначных) спроб карыстацца ў сваёй прафесійнай дзейнасці вышэйназванай метадалогіяй, не кажучы ўжо, зразумела, пра псіхалагічную школу або плынь у гістарычных даследаваннях.

Пры традыцыйным жа падыходзе (дарэчы, далёка не беззаганным) да аналізу праблем мінулага сапраўдная «карціна» гісторыі атрымліваецца нярэдка скажонай, недакладнай, а падчас і проста неаб'ектыўнай, сфальсіфікаванай. Як правіла, нашыя гісторыкі звычайна робяць асноўны ўпор на вывучэнне гісторыі розных дзяржаўных утварэнняў, даследаванні палітыка-эканамічных адносін. Пры гэтым амаль заўсёды абыходзіцца стараной той відавочны факт, што кожная дзяржава ўяўляе сабою супольнасць розных нацый і народнасцей, складаецца з мноства асоб, якія вызначаюцца пэўнымі асаблівасцямі псіхалогіі, светаўспрымання, непаўторнымі рысамі інтэлекту, сваіх інтарэсаў, схільнасцей, стэрэатыпаў у паводзінах і г. д. Да таго ж, псіхічны склад таго ці іншага народа (яго менталітэт або ментальнасць) не з'яўляецца для ўсіх часоў і эпох аднолькавым, застыўшым, а з цягам часу мяняецца, набывае нейкія новыя рысы, іншымі словамі, эвалюцыяніруе пад уздзеяннем змен у рэаліях паўсядзённага жыцця. Недарэмна ж іншы раз гавораць, што каб глыбей пазнаць гісторыю сваёй Бацькаўшчыны, патрэбна зразумець «душу народа» ў даследуемы перыяд. Усё гэта мае выключнае значэнне, бо менавіта «народная душа» (ці «дух народа») накладае часам моцны адбітак на функцыяніраванне любой дзяржавы. З гісторыі ж вядома, што эфектыўнае, дынамічнае развіццё, або, наадварот, заняпад і пагібель цэлых імперый у значнай меры залежаць не ад нейкіх абстрактных прычын эканамічнага, палітычна-ідэалагічнага парадку, а ад духоўнага, маральнага стану, узроўню псіхафізічных характарыстык іх насельнікаў.

Цяпер, пасля кароткіх агульных разважанняў, хацелася б спыніцца на некаторых аспектах псіхадагічнага, духоўнага развіцця беларускага народа ў мінулым стагоддзі і ў наш час. У цэлым падобная дынаміка, на наш погляд, уяўляе, так бы мовіць, карціну даволі сумную. Больш таго, за выключэннем асобных непрацяглых перыядаў часу, духоўнае развіццё беларусаў мела тэндэнцыю да павольнага разбурэння (размывання) большасці маральных каштоўнасцей, традыцыйных рысаў светапогляду, паводзін беларускага народа. Якія фактары аказалі негатыўны ўплыў на духоўны стан беларусаў? На чым грунтуюцца даныя высновы?

Адназначна на такія складаныя пытанні адказаць немагчыма. Тым больш, што, паўтаруся, неабходны яшчэ рознабаковыя распрацоўкі гэтай праблемы. Аднак некаторыя думкі і меркаванні ўсё ж рашуся выказаць.

Сапраўды, фактараў (дэтэрмінант), якія накладвалі пэўны адбітак на асаблівасці псіхалогіі беларусаў, вельмі многа, прычым характар такога ўздзеяння быў нярэдка супярэчлівы. Адразу адзначым, што Беларусь у XIX ст. з'яўлялася арэнай барацьбы двух даволі моцных уплываў — польскага і расійскага. Ужо адно гэта вызначала адметнасць гістарычнага шляху беларусаў. Нават пры вонкавым разглядзе гэтай праблемы відавочна, што, канешне, уздзеянне двух супрацьлеглых фактараў не магло, у большасці выпадкаў, стымуляваць развіццё беларускай культуры і мовы. Але на самай справе ўсё было больш складаным, і таму некаторыя факты не паддаюцца адной дакладнай трактоўцы. Ды і ўвогуле неабходна разумець, што тыя фактары, якія негатыўна ўздзейнічаюць на асобны аб'ект, у іншых выпадках і пры іншых умовах могуць, наадварот, прыводзіць да пазітыўных зрухаў у іх. І гэта таксама трэба ўлічваць, каб пазбегнуць крайнасцей і аднабаковасці.

Дык вось, вядома, што асабліва з XVII ст. Беларусь знаходзілася пад моцным уплывам Польскай Кароны. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. сітуацыя пачала мяняцца. Тэрыторыя беларускіх губерняў трапляе, пасля яе інкарпарацыі ў склад Расійскай імперыі, у сферу асаблівай увагі з боку апошняй. І ўжо далейшае развіццё беларускага народа праходзіла пры парадаксальных умовах, як бы на скрыжаванні польскага і расійскага націску. Пры Аляксандры I у значнай меры захавалася перавага польскай культуры і мовы на землях Беларусі ў сферы адукацыі, справаводства і г. д. Але з пачатку 30-х гг., у час праўлення Мікалая I, цэнтр уплыву паступова пераносіцца на рускі элемент. Немалы штуршок падобнаму пераходу дало паўстанне 1830—1831 гг. і яго хуткае паражэнне. Тады царскі ўрад надаў сваім дзеянням вядомую ідэалагічную «падкладку» ў выглядзе знакамітай трыадзінай фармулёўкі — «самаўладдзе, праваслаў'е, народнасць». У адносінах да Беларусі палітыка царызму вялася на аснове распрацаванай прыкладна тады ж канцэпцыі «заходне-русізму». Паводле яе, тэрыторыя Беларусі афіцыйна была аб'яўлена «Паўночна-Заходнім краем», а ўсе яе насельнікі з таго часу лічыліся «заходнерусамі». Па справядлівым меркаванні А. Цвікевіча, «заходне-русізм» на «некалькі дзесяцігоддзяў затрымаў развіццё беларускага культурнага адраджэння». Асабліва значныя практычныя вынікі рэалізацыя гэтай канцэпцыі на Беларусі прынесла ў другой палове XIX ст., пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гг. Менавіта тады, на нашу думку, быў нанесены найбольш магутны ўдар па самасвядомасці беларусаў, па іх самабытнай культуры, мове, па маральна-духоўным абліччы беларускага народа-пакутніка. У дадзеным сэнсе Беларусь была адкінута назад, на доўгі час былі «закансерваваны» самыя негатыўныя якасці і праявы духоўнага жыцця розных народаў, якія насялялі Беларусь. Што ж у першую чаргу маецца на ўвазе?

Перш-наперш, паступова, пад такім магутным прэсам, калі ўсё навокал было рускім, паўсюдна панавала руская мова, беларускі народ траціў увогуле яшчэ неразвітае пачуццё сваёй нацыянальнай самабытнасці, саматоеснасці і беспаваротна, здавалася, страчваў тое асноўнае, што адрозніває адзін народ ад другога, — сваю родную матчыну мову. Беларусаў афіцыйныя ўлады, польскія і расійскія вучоныя не лічылі своеасаблівым народам, а ўсяго толькі нейкім «этнаграфічным матэрыялам», «групай», «галіной», «племем» рускай або польскай народнасці. У. М. Ігнатоўскі зазначаў, што «ў Рэчы Паспалітай беларус быў працавітым быдлам», а ў Расіі ён зрабіўся «рабочим скотом». Фактычна ў гады, калі Беларусь была ў складзе Рэчы Паспалітай, а потым і Расіі, няўхільна праходзілі працэсы паланізацыі і русіфікацыі беларускага народа. Тыя часіны былі перыядам шматлікіх здзекаў і прыцясненняў беларусаў, «глумлення» над іх народнай душой (паводле М. Багдановіча).

Ужо у канцы XVIII ст., адразу пасля далучэння Беларусі да Расіі, спецыяльнымі загадамі прадугледжвалася неабходнай і карыснай замена мясцовых улад «натуральнымі», «прыроднымі рускімі» з больш высокім, зразумела, жалаваннем. У далейшым рускія чыноўнікі атрымлівалі, як правіла, і шмат іншых прывілеяў і льгот у параўнанні з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Да ліку падобных прывілеяў, напрыклад, адносіліся больш вялікія памеры зарплаты настаўнікам, служачым органаў улады, выдача ім лепшых казённых кватэр з ацяпленнем і асвятленнем, забеспячэнне так званымі сталовымі, раз'язнымі, кватэрнымі, прагоннымі грашамі і г. д. Адным словам, для «вернападданых» Расійскай імперыі існавала ў той час цэлая сістэма пераваг у розных сферах жыцця. Многія чыноўнікі з Расіі па сваім уласным жаданні прыязджалі на Беларусь у мэтах «нажывы» ці «пагоні за кар'ерай». Асабліва масавы характар набыла гэтая з'ява ў 60-я гг. XIX ст., калі ў выніку «актыўнай» дзейнасці Мураўёва-вешальніка па расправе з паўстанцамі адбылося своеасаблівае «адкрыццё» Беларусі для расійскіх грамадзян. Нярэдка настаўнікі школ, гімназій, семінарый Беларусі, а таксама паліцэйскія, міравыя суддзі, пісары, пасрэднікі ды інш. на барацьбе за «чистый русский язык» рабілі сабе нядрэнную кар'еру, прычым атрымлівалі права на павялічаныя пенсіі (300 руб. і больш), на даволі значныя зямельныя ўчасткі, на атрыманне розных узнагарод (грошы, ордэны, медалі, падзякі і да т. п.). У асноўным для чыноўнікаў рускага паходжання прадугледжвалася выдача канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання 1863—1864 гг. На месца прыехаўшых з унутраных губерань Расіі чыноўнікаў адпраўлялі пераважна асоб, якія набылі адукацыю на Беларусі. Ім неабходна было, як правіла, адслужыць у Расіі поўны тэрмін (5—10 гадоў), пасля сканчэння якога мала хто з беларусаў ужо вяртаўся назад.

У XIX ст. больш высокі сацыяльны статус мелі, вядома, польская і руская мовы, прычым добрыя веды апошняй з пачатку 30-х гадоў становяцца адной з галоўных умоў атрымання права на чын 14 класа (калежскага рэгістратара).

Зразумела, што ўсе вышэйпералічаныя перавагі, якія даваліся польскаму ці рускаму элементу, паступовае выцясненне ўсялякай «беларускасці» не маглі не закрануць светапогляду і адносін да падобных працэсаў часткі беларускага народа. І тут можна сказаць, што ўсебакова адпавядай дэнацыяналізацыі падвергліся пэўныя катэгорыі, слаі беларусаў, асабліва ў гарадах і мястэчках. Беларускае дваранства пачало пад уздзеяннем афіцыйнай русіфікатарскай, паланізатарскай прапаганды лічыць сваю родную мову і традыцыі «хлопскімі», «вясковымі», «ніжэйшымі» за польскія або рускія. Нярэдка беларускія па паходжанні дваране, мяшчане падкрэслівалі і ганарыліся сваім быццам бы польскім шляхецтвам на той толькі падставе, што польская культура з'яўляецца культурай «высакароднага, вышэйшага класа». Страта нацыянальнай самасвядомасці, сваёй непарыўнай прыналежнасці да Бацькаўшчыны назіралася нават і сярод сялянскага насельніцтва Беларусі. Так, яшчэ і ў 20-я гг. XX ст., калі ў рэспубліцы шырока разгарнулася беларусізацыя, далёка не выключэннем былі выпадкі, калі сяляне-беларусы лічылі сваю мову «мужыцкай», «халопскай», якая быццам бы ўвогуле «не мае будучыні». Відавочна, што пад уплывам (у большай альбо меншай ступені) палітыкі паланізацыі і русіфікацыі ў XIX — пачатку XX ст. знаходзілася немалая колькасць беларусаў.

Да ўсяго трэба дадаць, што царскія ўлады выкарыстоўвалі самыя розныя сродкі для дасягнення сваіх палітычных мэтаў — ад замаскіравана-ідэалагічных да адкрыта-рэпрэсіўных. Пры гэтым «няўрымслівымі» праваднікамі такой палітыкі з'яўляліся шматлікія чыноўнікі, паліцыя, армія і праваслаўнае духавенства, частка якога імкнулася «пераканаўча» даказаць беларусам вялікую неабходнасць поўнага падпарадкавання «украінай» Беларусі «вялікай матушцы Расіі». А раней многія святары, шляхціцы даводзілі да свядомасці беларусаў, што яны «сапраўдныя палякі», а Беларусь павінна, нібыта, зноў увайсці ў склад былой Польшчы «ад мора да мора». Вельмі цікава, на наш погляд, сур'ёзна заняцца нашым вучоным аналізам так званай «псіхалогіі прапаганды», г. зн. даследаваць, як, па якіх каналах і ў якой меры ідэалагічныя ўстаноўкі, фармулёўкі ўспрымаюцца масавай свядомасцю, выяўляюцца ў дзейнасці кожнага чалавека. Думаецца, гэтая тэма яшчэ чакае сваіх даследчыкаў, аднак і сёння ясна тое, якімі былі рэальныя вынікі падобных прапагандысцкіх кампаній. Усё сказанае, безумоўна, датычыць і савецкага перыяду ў развіцці Беларусі.

У такіх неспрыяльных варунках, калі «сельская паліцыя па загадзе вышэйшай улады змагалася з народнымі беларускімі звычаямі, старымі ігрышчамі і інш., саджала ў халодную сялян за народныя спевы, у якіх гаварылася аб цяжкім жыцці і дрэннай уладзе» (Е. Раманаў),

(Працяг на стар. 12).

Фота А. КЛЕШЧУКА.

Віншуем!

Вячаславу РАГОЙШУ — 50

Вядомаму крытыку і літаратуразнаўцу, кандыдату філалагічных навук, дацэнту Вячаславу Рагойшу сёння — 50 гадоў. Чытачы «ЛіМа» ведаюць Вячаслава Пятровіча як актыўнага і даўняга аўтара, які ў сваіх рэцэнзіях, артыкулах і іншых публікацыях закранае надзённыя пытанні развіцця беларускай літаратуры, шмат робіць для даследавання малавядомых старонак яе. Звычайна з такога выпадку змяшчаецца слова пра юбіляра. На гэты раз парушаем традыцыю і прапануем увазе чытачоў гутарку з В. Рагойшам.

І АДГУКАЕЦЦА СЛОВА Ў СЛОВЕ

— Вячаслаў Пятровіч, пяцьдзесят — дата і «круглая», і значная. Пройдзены вамі не такі і малы шлях — жыццёвы і творчы. Пачыналі вы, здаецца, з вершаў і допісаў у колішнюю радашковіцкую раённую газету «Сцяг Ільіча», а сталі знакамітым даследчыкам літаратуры... Дык, можа, згадаеце сёе-тое са здзейсненага, асобныя пуцявіны гэтага шляху?

— Безумоўна, кожны чалавек у час свайго юбілею задумваецца, колькі пражыў і перажыў, што зрабіў і чаго не зрабіў. Сказаць папраўдзе, сёе-тое з задуманага не зроблена, але і здзейснена нямала. Сёлета ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выходзіць дванаццатая мая кніга, называецца «І адгукнецца слова ў слове». Акрамя таго, я ўклаў некалькі зборнікаў іншых аўтараў. Гэта і кніга Сяргея Палуяна «Лісты ў будучыню» (разам з Таццянай Кабржыцкай), і анталогія аднаго верша «А хто там ідзе?..» Янкі Купалы на мовах народаў свету (уклаў разам з Ядвігай Раманоўскай), і зборнік твораў Старога Уласа — упершыню сабрана разам спадчына гэтага самабытнага паэта-самавука, і хрэстаматыя беларускай літаратуры XIX стагоддзя (разам з Алегам Лойкам). Нарэшце, таксама ў «Мастацкай літаратуры», сёлета, да 110-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, выходзіць кніга яго нацыянальна - патрыятычных твораў «Жыве Беларусь!». Надрукаваў звыш 300 артыкулаў і рэцэнзій у перыядычным друку — у беларускім, украінскім, польскім, рускім. Ёсць, на шчасце, што падлічыць. А пачынаў я сапраўды з вершаў, допісаў у раённую газету, якія друкаваў ужо недзе ў восьмым—дзевятым класе. Якраз у той час адказным сакратаром «Сцяга Ільіча» стаў працаваць Адам Мальдзіс. Ён публікаваў хлёсткія фельетоны, цікавыя краязнаўчыя матэрыялы і з павагай ставіўся да маладых аўтараў, асабліва пачынаючых. Памятаю, як ён уважліва прачытаў мае вершы, даў на іх добразычлівы адказ. Пасля, наведаўшыся ў Ракаў, сустрэўся, пагаварыў. Гэта, можна сказаць, і вызначыла мой далейшы творчы лёс.

— Пасля школы вырашылі паступаць у БДУ на філалагічны факультэт?

—Шлях ва універсітэт і пачаўся з тых першых публікацый у раённай газеце. Як кажуць, ён быў прадвызначаны. Гады студэнцтва — самы светлы перыяд жыцця. Там я сустрэў сяброў-студэнтаў, а таксама выкладчыкаў, якія пасля сталі сябрамі, а некаторыя і маімі калегамі. Я ж ужо дваццаць пяць гадоў працую ў БДУ выкладчыкам...

— Яшчэ адзін юбілей, яшчэ адна «круглая» дата...

— Так, сапраўды, дзве даты. Карыстаючыся выпадкам, хачу ўспомніць добрым словам тых, хто дапамагаў мне далучацца да роднага слова, нацыянальнай літаратуры, культуры. Найбольшая мая ўдзячнасць Міхасю Рыгоравічу Ларчанку, колішняму дэкану філалагічнага факультэта, загадчыку кафедры беларускай літаратуры.

— Ва універсітэце і пачаўся ваш шлях навукоўца?

— Якраз Міхась Рыгоравіч і заўважыў мяне, рэкамендаваў у аспірантуру, быў кіраўніком маёй кандыдацкай дысертацыі. У студэнцкія гады я пазнаёміўся з цяперашнім дэканам філфака, загадчыкам кафедры беларускай літаратуры Алегам Антонавічам Лойкам. Мой далейшы жыццёвы і творчы шлях быў прадвызначаны менавіта ім.

— У застойныя гады і ва універсітэце даваў аб сабе знаць «звышінтэрнацыяналізм». Тым не менш, на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філфака ўсё ж не цалкам былі вынішчаны нацыянальныя карэнні?..

— Міхась Рыгоравіч сабраў вакол сябе кафедру аднадумцаў, на якой працавалі людзі, адданыя нацыянальнай справе. Гэта і Іван Навуменка, і Алег Лойка, і Ніл Гілевіч, і Дзмітрый Бугаёў, і Кузьма Хромчанка, і Маргарыта Яфімава, і Сцяпан Александровіч, і Сяргей Гусак, і Рыгор Семашкевіч — называю тых, хто працаваў падчас майго студэнцтва ці крыху пазней. Цяпер на кафедры таксама нямала тых, каго мы называем свядомымі беларусамі. Гэта і маладыя даследчыкі Таццяна Шамякіна, Сяргей Кавалёў, Любоў Тарасюк, і іншыя, якія працягваюць традыцыі, закладзеныя Ларчанкам і яго аднадумцамі, — далучэння да роднай мовы, літаратуры, культуры.

Вядома, застойны перыяд накладваў адбітак на працэс навучання, але ўсё ж на філфаку і тады бурліла жывое літаратурнае жыццё. Сёння ці не палова Саюза пісьменнікаў Беларусі — колішнія выпускнікі філалагічнага факультэта, найперш — аддзялення беларускай літаратуры.

— І ўсё ж русіфікацыя давала аб сабе знаць?

— Сказвалася гэта на мове навучання. На жаль, на той час і на беларускім аддзяленні ўсе прадметы, па сутнасці, выкладаліся па-руску. Не кажу ўжо пра іншыя аддзяленні і факультэты. Між іншым, М. Ларчанка і пакінуў мяне ў аспірантуры з той умовай, што пасля тэорыю літаратуры я пачну выкладаць па-беларуску. Зрэшты, я не адмаўляў бы ўсё, што рабілася ў тыя самыя «застойныя» гады. Літаратура жыла, літаратура развівалася, у яе ўліваліся новыя сілы з тых самых студэнтаў, выпускнікоў універсітэта. У бібліятэках пасля 1956 года можна было знаёміцца з камплектамі газет, часопісаў дваццатых гадоў. Скажам, чытаць «Маладняк», «Узвышша». Тады я пачаў працаваць у навуковым гуртку, выступаць на навуковых канферэнцыях. Мае студэнцкія даклады перараслі ў дыпломную работу, а пасля і ў кнігу «Пераклаў Якуб Колас...», якая выйшла ў 1972 годзе, калі ўрачыста адзначалася 90-годдзе з дня нараджэння народнага песняра.

— Як журналіст, паэт вы пачаліся з раённай газеты, а як даследчык літаратуры, крытык?

— З «ЛіМа», калі мець на ўвазе рэспубліканскі друк. На старонках «Літаратуры і мастацтва» я надрукаваў сваю першую рэцэнзію.

— Паколькі вы выкладалі ва універсітэце тэорыю літаратуры, там, відаць, нараджаліся і вашы кнігі «Гутаркі пра верш. Метрыка. Рытміка. Фоніка» і «Паэтычны слоўнік», якія адначасова выйшлі ў 1979 годзе.

— З гэтай працы выраслі не толькі згаданыя кнігі, а і некаторыя іншыя публікацыі, звязаныя з распрацоўкай праблем паэтыкі верша і з даследаваннем паэтычнай творчасці ўвогуле. А «Гутаркі пра верш» і «Паэтычны слоўнік» лічу і сёння сваімі лепшымі кнігамі. Яны атрымалі шматлікія станоўчыя водгукі ў друку, у тым ліку і ў замежным. Праца над імі прыносіла сапраўднае даследчыцкае задавальненне, хацелася працаваць далей. Другое выданне «Паэтычнага слоўніка» (выйшаў у 1987 годзе) я дапоўніў на трэць, выкарыстаўшы новыя матэрыялы.

— Сёння, як вядома, адбываецца настойлівае пераасэнсаванне мінулага, усё робіцца дзеля таго, каб знікалі «белыя плямы» і ў літаратуры. Тым самым узрастае роля даследчыкаў, гісторыкаў яе. Ваша кніга «Вышыні», якая напрыканцы мінулага года выйшла ў выдавецтве «Універсітэцкае», — таксама напісана ў рэчышчы падобнага пераасэнсавання...

— Акрамя тэорыі літаратуры, для мяне своеасаблівым,

Стракатыя выявы дня

Па старонках штогадовіка «Дзень паэзіі — 91»

Мінаюць, дакладней — мільгаюць дні. У калавароце часу многія з іх знікаюць бясследна, асабліва шэрыя, аднастайныя, звыклыя. І ўсё ж мы чакаем новай зіхотка-сонечнай раніцы, якая сагрэе сваім цяплом, адродзіць у нашых душах радасны дзень вясны. Усе мы хочам выбіцца з сённяшняга беспрасвету, смуткуем і верым...

Менавіта ў такіх адчуваннях праходзіла маё знаёмства з чаговым штогадовікам «Дзень паэзіі — 91», які, як вядома, прыйшоў да чытача на пачатку гэтага года, са спазненнем. Што ж, затрымліваюцца з выхадам заоад многія беларускія кнігі — такі ўжо лёс нясе ім дзікая рынкавая ява, у якой нацыянальнае друкаванае слова і мастацтва выцясняюцца на задворкі. Бязлітаснае распяцце «рынку» зазналі часопіс «Маладосць», яго літаратурны дадатак «Бібліятэка...», іншыя выданні, якія адкрываюць дарогу маладым. Мінулагодні «Дзень паэзіі» — гэта без перабольшання не толькі дзень, але і свята маладой паэзіі.

Мажліва, «Дзень паэзіі» ў значнай ступені прыцягнуў увагу чытачоў і сваімі змястоўнымі старонкамі літаратурнай спадчыны, якія прадстаўлены творамі В. Ластоўскага, Х. Ільяшэвіча, У. Клішэвіча, Р. Крушыны, А. Салаўя, Л. Бялькевіча. Вершы гэтых аўтараў падрыхтавалі да друку таксама маладыя літаратары — В. Шніп, В. Чаропка, С. Чыгрын. Мы ж запынім свой позірк на паэзіі сённяшняга дня, прычым не будзем закранаць рускамоўную творчасць, паколькі яна заслугоўвае асобнай гаворкі.

Здаецца, і эстэтычная «планка», крытычная мерка ёсць — гэта вершы М. Багдановіча, якімі адкрываецца зборнік. Пачынаецца пад знакам яго «Пагоні». Што ж да мастацкай вышыні багдановічаўскага ўзроўню, то паэт калі не дасягнуць, то наблізіцца да яе павінен імкнуцца — гэта значыць індывідуальна-непаўторна выявіць сябе ў паэтычным радку. Сапраўдная паэзія, як бы аксіяматычна ні гучала думка, не можа нарадзіцца без выпраменьвання высокай эмацыянальнай і інтэлектуальнай энергіі, пошуку яркіх мастацка-выяўленчых сродкаў і формаў выказвання. Маладыя паэты, якія выступаюць на старонках альманаха, прагнуць і дасягаюць асабовасці самавыяўлення, адметнага мастацкага зроку. Безумоўна, не ўсе, але, думаецца, не варта нам сёння адмаўляць той факт, што творчасць найбольш таленавітай моладзі прыўносіць у сучасную паэзію, увогуле літаратуру свежы струмень.

Перагортваю старонку за старонкай — і мяне ўзрушвае, радуе глыбіня ўнутранага самавыяўлення А. Аркуша, Г. Булыкі, І. Бабкова, С. Адамовіча, П. Вераб'ёва, А. Гуцава, А. Дэбіша... У творах маладых паэтаў адчуваецца пошук, жаданне выявіць стан свайго «я», пасвяціць чытача ў самыя патаемныя думкі-пачуцці. Можа, іхняе слова моцна прыцягвае яшчэ і таму, што яны як паэты растуць, упэўнена гартуюць свой талент і майстэрства. Пачытайце апошнія публікацыі маладых аўтараў — і вы адчуеце душэўна-актыўны тонус іх творчасці. Калі І. Бабкоў інтэлектуальна-філасофскі паэт, то С. Вераціла больш эмацыянальна-рэфлексійны. З нізкі чатырохрадкоўяў С. Вераціны найбольш кранула вось гэтае:

Камусьці восень «залатая»,
А мне шкада лістоты хрустнай,
Што так журботна ападае
З радкамі мовы беларускай.

Шматмернасцю пачуцця вызначаюцца вершы Г. Булыкі «Манета» і «Кропля». Паэтка хоча вытлумачыць невытлумачальнае, ледзь улоўнае, разгледзець філасофію быцця нават у маленькай кроплі. Вобраз у яе вершах прыкметна ўскладнёны: «Пукатая кропля на зжоўклым лісце Асветліла проўвы спарожненых клетак — Праменні, няшкодныя той пустаце, Звіліся ў клубок і паснулі да лета». Увогуле, многія маладыя адчувальна імкнуць да неардынарнай вобразатворчасці, ускладнёнай метафарызацыі. Добра гэта ці кепска? Можна, вядома, на гэты конт спрачацца, але відавочны той факт, што паэтычны радок — гэта не толькі яснасць і прастата, але і мнагазначнасць, якая не паддаецца імгненнай логіцы. Да нетрадыцыйнай формы верша — хоку — звярнуўся І. Сідарук. І, на мой погляд, яго паасобныя творы гэтага жанру больш удалыя, чымся ранейшыя М. Шайбака. Асацыятыўнасць у І. Сідарука выцякае з яркай канкрэтыкі вобразаў. Вось трохрадовік «Развітанне»:

Грукнулі дзверы пад'езда.
Уздрыгваюць
Чайнкі ў кубку.

Безумоўна, дасягнуць такой шматстайнай асацыятыўнасці, як у японскім вершы, паэту цяжка, відаць, проста немажліва, ды ўсё ж лепшыя хоку І. Сідарука гавораць пра тое, што не варта прэбаваць тым, што павышае культуру паэтычнага мыслення.

Лірычная эмоцыя валадарыць у вершах А. Бадака, Ф. Баторына, А. Жыгунова, Л. Забалоцкай, М. Бусько, С. Валодзькі, З. Дудзюк, С. Каробкінай і іншых паэтаў, якія выяўляюць сябе ў класічна-традыцыйных каардынатах. Выяўляюць па-рознаму. Развярэдзіў сваёй драматычнай танальнасцю верш А. Каско: «Беларусь! Ні жывая, ні мёртвая: ні цвісці, ні ў магіле ляжаць». Душэўнай шчырасцю, інтымнасцю інтанацый кранулі вершы «І вось той дзень...» В. Куртаніч, «Палац згарэў...» Л. Рублеўскай.

З меншай цікавасцю, а то і сумам чыталіся публікацыі некаторых сталых паэтаў. Увогуле, у альманаху багата шэрай апісальнасці, рэзкіх кантрастаў паміж мастацкімі вартасцямі твораў. Гэта і не дзіўна, бо штогадовік нагадвае алфавітны спіс вайсковай роты, які зачытваецца на паверцы: чуюцца адзін за адным галасы, розныя па сваёй афарбоўцы і вопыту...

Расчаравала В. Аколава. У нізцы «Бараўлянскае лета» яна самапаўтараецца. Тыя ж матывы, той жа вобразны лад, што і ў нядаўнім яе зборніку «Вяртанне ў заўтра». Верш М. Пазнякова «Матчына хата» — узор апісальнай паэзіі: няма ў ім ніводнага яркага зобраза. Ды і пра пакінутыя вясковыя гнёзды ў такім духу гаварылі ўжо нашыя паэты, да прыкладу, В. Зуёнак. Падаецца, што твор М. Пазнякова больш прыдатны да «Дня паэзіі» сямідзесятых:

Аглухла,
Аслепла,
Сніць чорныя сны
Пустэльная хата.
А некалі
Ціхае, чуйнае свята
Жыло ў гэтай хаце
З вясны да вясны.

Прыкметнае месца ў штогадовіку займаюць творы, прысвечаныя Чарнобылю і Богу. Што ж, зварот да гэтых вобразаў — знак нашага часу і лёсу. Але тым не менш прадчуваю, што неўзабаве ў нас будзе вершаў пра Бога не менш, чым у нядаўнія і колішнія — пра партыю. «Званы Чарнобыля» Л. Возісавай, змешчаныя ў «Маладосці», таксама сведчаць пра тое, што, як і пра званы Хатыні, у нас з'явіцца яшчэ цэлы касяк рыфмаванай вершатворчасці. У «Дні паэзіі» прыклад гэтаму — «Нараўлянскі бэз» У. Скарынкіна. Хіба можа ўразіць, адгукнуцца ў душы чытача канстатацыя вядомага, вонкавая сузіральнасць, агульшчына?

Ніколі не суджана быць
Шчасліваю рыбнай старонцы.
Шмат гвалту і бед нарабіць
Паспелі тут цэзій і стронцый.

Трэба сказаць, што нашы паэты спяшаюцца адгукнуцца на новыя з'явы і падзеі жыцця, не дбаючы пра іх мастацкае асэнсаванне. Старажытныя дзіды «з вірусам СНІДа» зарыфмаваў Х. Жычка, герой якога выступае абаронцам цнатлівасці жыцця. Рыфмоўка пакідае адчуванне нейкай несумяшчальнасці: «Скрыжава-

калі можна так сказаць, хобі з'яўляецца архіўны пошук невядомых раней матэрыялаў, якія тычацца беларускага літаратурнага працэсу. Дзе б ні быў, заўсёды стараюся наведаць бібліятэкі, архівы. А раптам што адшукаю? З гэтых пошукаў нарадзіліся многія мае публікацыі. У прыватнасці, з падобных знаходак цалкам склалася і кніга «Напісана рукою Купалы». Выйшла яна ў 1981 годзе. «Вышыні» ж маюць падзагаловак «З невядомага і забытага пра Янку Купалу, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча». Гэтая праца таксама напісана на аснове архіўных пошукаў і, зразумела, знаходак. Яны прывялі і да выдання арыгінальных аўтарскіх кніг, якія вышэй я ўжо называў: Сяргея Палуяна, Старога Уласа і нават «Жыве Беларусь!» Янкі Купалы. Ёсць у мяне і задума ўкласці кнігу Адама Гурыновіча. Гэта аўтар, якога і ў школе вывучаюць. Але ён, як і тыя ж Палуян, Стары Улас, пры жыцці так і не паспелі сабраць свае творы ў кнізе. І наш абавязак, каб такія кнігі ў рэшце рэшт з'явіліся.

— Але ж гэта праца вельмі карпатлівая?

— Укласці, скласці такія кнігі няпроста. Трэба і ў архівах пакорпацца, адшукаць тэксты і ажыццявіць іх тэксталагічную падрыхтоўку. У той жа час гэтая праца ў выдавецтвах цэніцца вельмі нізка. Па сутнасці, усё на энтузіязме робіцца. І мне хацелася б, каб падобных энтузіястаў было больш сярод маладых даследчыкаў.

— На заканчэнне гаворкі я свядома пакінуў яшчэ адзін значны абсяг вашай творчасці: даследаванне творчых кантактаў і ўзаемасувязяў паміж братнімі літаратурамі, у прыватнасці, паміж беларускай і ўкраінскай. Не таму, што тут вашы набытні меншыя. Справа ў тым, што ў сённяшнім адмаўленні ўсяго ранейшага мы часам даходзім да суцэльнага ахайвання і колішніх тыдняў, дэкад, святаў літаратуры і мастацтва. А між тым і яны ў немалой ступені садзейнічалі кантактам...

— Маё зацікаўленне тэорыяй і практыкай мастацкага перакладу, практыкай і тэорыяй літаратурных узаемасувязяў, найперш беларуска-ўкраінскіх, пачалося з першых выступленняў на студэнцкіх канферэнцыях у Львове і ў Адэсе. Бадай, у кожнай маёй кнізе прысутнічае і ўкраінскі матэрыял. Найперш у кнігах «Карані дружбы» (напісана сумесна з Тацянай Кабржыцкай), у «Праблемах перакладу з блізкароднасных моў» (падзагаловак: «Беларуска-руска-ўкраінскі паэтычны ўзаемапераклад»), у кнізе «І нясе яна дар» (падзагаловак: «Беларуская паэзія на рускай і ўкраінскай мовах»). Украінскі матэрыял ёсць нават у «Паэтычным слоўніку» і ў «Гутарках пра верш», у якіх шмат апеляцый да ўкраінскай літаратуры, менавіта вопыту яе паэзіі.

— Мы гаварылі пра творчую працу. Але ж і асноўная праца шмат часу адбірае — праца ў скарынаўскім цэнтры, выкладанне на філфаку БДУ.

— Разам са стварэннем Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Францішка Скарыны пачалася новая старонка ў маёй біяграфіі. З верасня мінулага года, калі цэнтр набыў статус самастойнай установы, з'яўляюся намеснікам дырэктара па навуковай рабоце. Дырэктар жа — вядомы даследчык літаратуры, прафесар Адам Мальдзіс. Не парываю сувязі і з універсітэтам, з мінулага навучальнага года выкладаю новы курс — беларусазнаўства. Нямала часу займае і грамадская работа. З'яўляюся старшынёй рэвізійнай камісіі Саюза пісьменнікаў Беларусі, членам бюро секцыі мастацкага перакладу, намеснікам старшыні згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», членам праўлення Таварыства Беларусь—Польшча і некаторых іншых грамадскіх арганізацый. Несумненна, гэтая работа займае шмат часу, прыносіць нямала клопатаў, турботаў, але разам з тым гэта дае магчымасць, як кажуць, трымаць руку на пульсе сучаснасці, сучаснага грамадскага жыцця.

А калі гаварыць пра наш скарынаўскі цэнтр, дык гэта своеасаблівая ўстанова. У нас сабраліся спецыялісты розных галін навукі: літаратуразнаўцы, мовазнаўцы, філосафы, гісторыкі, спецыялісты па эстэтыцы, мастацтвазнаўцы, фізікі, матэматыкі. Мы не толькі даследуем гісторыю, тэорыю беларускай культуры, а і займаемся чыста прапагандысцкай, асветніцкай працай: праводзім канферэнцыі, розныя навуковыя сімпозіумы, сустрэчы. Дарэчы, тое, што на нашай базе працуе Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, а наш дырэктар адначасова з'яўляецца яе прэзідэнтам, дазваляе трымаць у руках ніці сувязяў беларусаў літаральна з усімі куткамі свету. Нам штодня звоняць з-за мяжы, дасылаюць лісты. Даводзіцца займацца і праблемамі, якія, здавалася б, знаходзяцца далёка ад рэчышча нашых інтарэсаў, тым не менш яны ідуць на карысць нашай Бацькаўшчыне, культуры, навуцы і нават эканоміцы. Літаральна сёння атрымалі ліст ад аднаго земляка з Канады, які прапануе свае паслугі ў пасадцы лесу на беразе Нёмана, у яго родных мясцінах. Звязваліся з Міністэрствам лясной гаспадаркі, тэхналагічнай акадэміяй, дзе ёсць лесатэхнічны факультэт.

— Але перадусім праца творчая...

— Чакаю кнігу «І адгукнецца слова ў слове», пра якую гаварыў. Чакаю і кнігу Купалы «Жыве Беларусь!», дарэчы, цудоўна афармленую Аляксеем Марачкіным. Яна — падарункавае выданне да 110-гадовага юбілею народнага песняра. І пачынаю працу над зборам спадчыны Адама Гурыновіча.

— Поспехаў вам, Вячаслаў Пятровіч! З паўвекавым юбілеем!

— Дзякую!

З юбілярам гутарыў
Алесь МАРЦІНОВІЧ.

ліся дзіды... Знаю я, хто — каго: спапяліць усе СНІДы грэшнай плоці агонь». «Спэкусіўся» моднай тэмай і В. Шніп. Яго «Манекеншчыца» нагадвае сузіральна-павярхоўны рэпартаж з Палаца мод.

Увогуле, «Дзень паэзіі — 91» дае добры спажытак парадыстам. Сярод парадыйных твораў, змешчаных у раздзеле «Па дарозе на Парнас», я вылучыў бы вострыя радкі М. Скоблы і А. Ненадаўца. Здаецца, пародыю М. Скоблы «Антываенная дактрына У. Мазго» можна аднесці таксама і да верша таго ж аўтара «Прыбудзе заўтра...», які змешчаны ў штогадовіку. У нас ёсць паэты, якіх крытыка не лашчыць, «дзяўбе» ад публікацыі да публікацыі. І часта зусім небеспадстаўна. Пасля выхаду другога зборніка «Вершаліна», які атрымаў даволі крытычную ацэнку, У. Мазго, на жаль, не можа выбіцца з каляіны ўсярэдненай, пасрэднай вершатворчасці:

Яўна не з лепшым вершам паўстаў у вачах чытачоў Ю. Голуб, як і П. Прыходзька, А. Зэкаў, Т. Дашкевіч і інш. Некаторым творам уласціва, кажучы словамі Л. Дранько-Майсюка, паэтычная бесклапотнасць:

Хоць век мы можам працаваць,
Хоць век крычаць,
мітынгаваць,
Цягнуць, як коні, лямку,
Ды нельга перабудаваць
Паветраныя замкі.

Пра што гэты верш Л. Дайнекі? Хай, урэшце, мяркуе чытач. Мне здаецца, што твор можа прэтэндаваць толькі на ўяўную глыбакадумнасць.

Кітайскую экзотыку адкрывае для нас Р. Барадулін. Ды паасобныя вершы ў яго нізцы «Варажу на Вялікай кітайскай сцяне» ўспрымаюцца ўсяго як эскізы, занатоўкі твораў, як, да прыкладу, невялічкая замалёўка «Сустракаю пекінскую раніцу». Хіба толькі па назве твора можна зразумець, што паэт малюе раніцу «экзатычную», тамтэйшую:

З ночы яліне пагады золка.
Ціха святло ўваскрасае.
Раніца —
Шэрая перапёлка
Ад расы крыло абтрасае...

Не хацелася б, каб крытычныя меркаванні і заўвагі бачыліся чытачу як наскокі на паэтаў. Проста я адчуваю, што ў альманах трапляе не самае лепшае з творчага актыву аўтараў. Тым не менш, можна працытаваць шмат радкоў, якія радуюць нас сваёй паэтычнай глыбінёй і майстэрствам. У чарговы раз пераконваешся, што мы мала звяртаем увагі на паэзію М. Рудкоўскага (на жаль, ужо нябожчыка), А. Барскага, Л. Дайнекі, Ю. Свіркі, В. Гардзея, маладзейшых — Л. Забалоцкай, А. Канапелькі... можа, таму, што згадваем іх імёны толькі ў так званых абоймах. Па-добраму здзівілі паэтычныя публікацыі празаікаў А. Масарэнкі і Х. Лялько.

Не магу не сказаць і пра адну акалічнасць, якую прыкмеціла вока. Магчыма я і памыляюся, але чарговы «Дзень паэзіі» — гэта ў значнай меры калектыўнае «дзіця» супрацоўнікаў нашых рэспубліканскіх выдавецтваў, якія, як вядома, размяшчаюцца ў адным будынку. Колькасцю, аб'ёмам надрукаванага іхнія публікацыі вылучаюцца прыкметна (Х. Жычка, В. Лукша, К. Жук, Л. Дранько-Майсюк, Р. Барадулін, М. Мятліцкі, У. Марук). З шчодрасцю адведзены старонкі і паэтам, да якіх праяўляюцца асаблівыя сімпатыі. Прачытаўшы іх прозвішчы, вы зразумееце — чаму. Стасункі па прынцыпе «ты мне — я табе» пазбаўляюць часам патрабавальнасці, крытычнага стаўлення да сябе і іншых. Я ўжо не кажу, што не зашкодзіла б сціпласці ўкладальніку, які не пакрыўдзіў ні сябе, ні калег. А маладыя, маўляў, дарасціце да нашага... Прынамсі, кнігі маладых аўтараў В. Чаропкі, М. Скоблы, Л. Рублеўскай і іншых аўтараў, заяўленыя ў тэматычным плане выдавецтва «Мастацкая літаратура» 1991 г., не выйшлі з друку яшчэ і на пачатку 1992. Затое кнігі выдавецкіх супрацоўнікаў выходзяць без затрымкі...

І яшчэ. Мо не варта гнацца за колькасцю імёнаў у штогадовіку, а дбаць пра яго мастацкі ўзровень, шматстайнае змястоўнае абнаўленне. Скажам, можна было б вылучыць асобным раздзелам «паэзію думкі», інтэлектуальную лірыку ці «міфалагічную» паэзію, змясціць нізкі пейзажна-экалагічных альбо эратычных вершаў ці на тэму горада, роднай гісторыі. Або чаму б не падаць асобна творы, якія вылучаюцца жанравымі і фармальна-стылявымі пошукамі? Сысці з традыцыйна-зазыклага шляху ўкладання можна, бясспрэчна, па-рознаму. Але новыя падыходы вымагаюць ад укладальніка і рэдкалегіі дадатковых клопатаў. Вопыт выданняў «Дня паэзіі» падказвае, што шукаць трэба і варта.

Мінулагодні альманах стаў фактам літаратурнай рэчаіснасці. Якім будзе наступны? Ці выйдзе наогул? Хацелася, каб «Дзень паэзіі» развіваўся не па крузе «з году ў год», а па спіралі, набываючы кожны новы раз паболей вабных рысаў і выяў.

Алесь БЕЛЬСКІ.

Віншуем!

Міхаілу ГЕРЧЫКУ — 60

7 чэрвеня спаўняецца 60 гадоў вядомаму пісьменніку Міхаілу Герчыку. «ЛіМ» віншуе яго з днём нараджэння, зычыць доўгіх год жыцця, новых творчых поспехаў.

ВІРЫ ЗВЫЧАЙНЫХ ДЗЁН

Пасля вайны ў піянерскай газеце «Зорька» мне давялося весці рубрыку «Творчасць нашых чытачоў». У патоку рыфмаваных і празаічных практыкаванняў тагачасных школьнікаў зрэдку з'яўляліся, як мы іх называлі, «водбліскі надзей». З іх рэдакцыйныя рыфмачы і праўшчыкі і рабілі падборкі вершаў і замалёвак «нашых чытачоў». І жартавалі: а мо гэны калі-небудзь «роман» сачыніць. Нячысцік-свавольнік і не тое робіць!.. Бабруйчанін Міша Герчык быў сярод аўтараў тых «водбліскаў». Праз колькі год ён, скончыўшы універсітэт, сам працаваў у той жа «Зорьке». І падступаў да «рамана».

Прыгадваю гэта, бо газеты тае пары часцей заахвочвалі пачынаючых літаратараў усё ж да пісання «датных» опусаў — да Кастрычніцкай гадавіны, да дня нараджэння Правадыра, да Дня танкіста... Такія часцей і «праходзілі» праз рэдакцыйны фільтр на газетныя старонкі. Кемлівы сачыніцель набіваў руку рабіць тое, што «праходзіла». Вучыўся літаратурнаму канфармізму. Шчыра кажучы, усе літаратары праходзілі тады такую школу, і М. Герчык — не выключэнне.

Аднаго разу я спытаў у яго, якая кніга для яго запаветная, як кажуць, настольная, якую гартаеш і перачытваеш, каб далучыцца да раней не заўважанага або не надта зразуметага. «Іскандэр», — адказаў малады літаратар, маючы на ўвазе не Фазіля Іскандэра, вядома, а Аляксандра Геоцэна, кнігу «Былое і думы». Пагутарыўшы, я пераканаўся, што гэта не толькі прыгожае слоўца, што М. Герчык абдумвае рэчаіснасць сур'ёзна, імкнецца спасцігнуць асаблівасці сучасных узаемаадносін паміж чалавечай асобай і грамадствам.

З кожнай новай аповесцю ён як бы паглыбляў свой вобразны роздум аб магчымасцях і прызначэнні чалавека, чыё жыццё заўсёды выпрабоўвае яго то спакусамі сытага і бязбеднага існавання, то неабходнасцю выбраць адданасць (ідэалу ці сябру) або кампрамісную здраду, сумленныя паводзіны або зацяты штурм начальніцкіх вяршынь любым коштам. Пяро празаіка, які піша па-руску, але працуе ў беларускай мастацкай прозе, побач і адначасова з В. Быкавым і А. Адамовічам, В. Адамчыкам і В. Карамазавым, таксама сталее ад кнігі да кнігі. Пераадольваецца спрошчанасць сюжэтных канструкцый і наіўнасць персанальных характарыстык дзейных асоб. Больш выразна раскрываюцца ўнутраныя матывы ўчынкаў і рашэнняў, якія дыктуюцца персанажу супярэчлівымі сутыкненнямі таго ж сумлення з неабходнасцю, абавязку — з маральным уяўленнем пра дабро і зло.

Мабыць, дастаткова ўспомніць нашы ўражанні ад ягоных досыць папулярных у свой час аповесцей накшталт «Ветер рвет паутину» ці «Портрет Фиделя» і параўнаць з такімі псіхалагічна заглыбленымі ў духоўны свет герояў творамі, як «Отдаешь навсегда», «Обретение надежды» ці «Возвращение к себе». Цікава, што некаторыя прататыпы ягоных персанажаў мне асабіста добра знаёмыя. Сярод іх ёсць і даволі прыкметныя фігуры з галіны, напрыклад, сучаснай анкалогіі ці журналістыкі. Пісьменнік не задавальняецца абрысам іх лёсу, ён здабывае мастацкую праўду для даследавання пэўных адметнасцей наогул чалавечага феномена.

Адзін старажытны рымлянін рашуча абвясціў яшчэ да нашай эры: «Адно адзінае бясспрэчна, што няма нічога бясспрэчнага і што чалавек — самае ганебна-нікчэмнае і разам з тым самае дасканалае стварэнне». Кожнае новае пакаленне і асабліва кожная новая грамадская фармацыя звычайна пачынаюць з таго, што прыпісваюць усё «ганебна-нікчэмнае» або «бацькам», або папярэднім сацыяльна-дзяржаўным «абставінам», якія нібыта патуралі ў людзях нізкія памкненні, а вось «нашы», здабытыя ў рэвалюцыйных бурах прынцыпы і стануць спрыяльнымі для перамогі «дасканалага» ў кожным індывідууме. Ці не доказы таго павінен быў засведчыць сваімі вобразамі сацыялістычны рэалізм! Сапраўдны мастак, ведае ён тую максіму Плінія Старэйшага ці толькі інтуітыўна здагадваецца аб супярэчлівай прыродзе чалавечай істоты, не займаецца вытворчасцю станоўчых герояў. Яму больш важна заглыбіцца ў падзеі рэальнага жыцця цікавых для яго персанажаў, каб і мы, чытачы, спакваля пачыналі б адчуваць сябе ў ягоным мастацкім свеце, жыць жыццём новых для нас знаёмых, у прапанаваных аўтарам часе і месцы. У лепшых творах і на лепшых старонках прозы М. Герчыка такое дасягаецца.

Ці не гэтыя якасці таго ж рамана «Обретение надежды» прыцягваюць увагу чытачоў, якія разам з пісьменнікам спрабуюць зразумець прычыны і вытокі як высокай дабрачыннасці, так і мярзотнай згоды з неабходнасцю жыць, прыстасоўваючыся па волі пажадлівага юру да ўлады, да грошай, да славы, пад маскай «выканаўцы» службовых абавязкаў і нават грамадзянскага прызначэння. А ў рамане «Возвращение к себе» ў фокусе аўтарскай увагі стракаты прафесійны склад дзейных асоб — школьны работнік, хірург, выдавецкая машыністка, шафёр — б'ецца па сутнасці, над адным пытаннем: што такое сапраўднае шчасце і ці можна затрымаць яго не на адно імгненне, каб яно не было азмрочана капітулянствам перад усё тымі ж спакусамі прывілей, жаданага дабрабыту, службовай кар'еры і бездакорнай рэпутацыі.

Дзіўна, але гэта так: праз сорак гадоў, пасля публікацый вершаў пачаткоўца Мішы Герчыка ў рубрыцы «Творчасць нашых чытачоў» мне выпала сёлета рабіць прадмову да двухтомнага збору твораў празаіка М. Герчыка. Перачытаў вядомае мне зноў. Аўтару не спатрэбілася ва ўмовах дэмакратычных пераўтварэнняў і галоснасці нічога перапісваць нанова, змяняць акцэнты, упрыгожваць тэкст нечым прыдатным да «духу часу». Ягоныя героі вымушаны жыць сёння і сёння ж сваімі паводзінамі або пацвярджаць неадольную сілу спакусы, якая кідае чалавека ў абдымкі ганебнай нікчэмнасці, або даводзіць хараство дасканаласці, адмеранай прыродай кожнаму з нас.

Барыс БУР'ЯН.

Віктар ШНІП

ВОЛЮ ЗНАЕ ТОЛЬКІ БОГ

●

Не будзе Радасці, не будзе Свята,
Пакуль не раскладзём свайго агню,
Пакуль сваю мы не збудуем хату,
Пакуль з сябе не вырвем цішыню.
А ўжо вятры спускаюцца на поле
І ў неба чорнае ўздымаюць пыл,
І ў адзінокіх дрэў ламаюць голле,
І чутна лапатанне хіжых крыл.
А гэта д'яблы кружацца над намі
І шэпчуць нам: «Жывіце, як жылі...»
І гэты свет знявечаны людзямі,
І мы на смерць ляцім, як матылі.
Ды цішыня жыве ў нас, як зараза,
І мы глядзім спакойна на касцёр,
Дзе нас палілі з цішынёю разам
І мы ўзляталі з дымам аж да зор...
Калі ўжо свой агонь мы раздабудзем,
Калі сваю збудуем хату мы!
Відаць, усё не хутка гэта будзе,
Бо што мы ўмеем, акрамя турмы,
Зрабіць у свеце, дзе жывём часова,
Дзе брата не шануе родны брат,
Дзе ў нас забралі нават нашу мову...
І нам няма ні Радасці, ні Свят.

●

Хто з нас смяецца, гадамі
Гібель прарочачы нам!
Доўга жылі мы рабамі.
Сумна спяшаемся ў Храм.

Просім спагады у Бога.
Бог ці адкрыецца ўсім!
Вельмі грашылі мы многа,
Многа і сёння грашым.

Многа гаворым пра волю,
Волі не знаючы смак.
Знаем жабрацкую долю
З воляй галодных сабак.

Шчэ спадзяёмся, што будзе
Светлае Заўтра і рай.
Дзіўныя, добрыя людзі
Вераць — адродзіцца Край.

— Будзем яшчэ мы панамі!
Хочацца ў тлуме пачуць...
Ціха і нізка над намі
Д'яблы й анёлы лятуць.

Дома

Дрэвы старыя і хаты старыя,
Сумна і ціха на вуліцы сёння.
Людзі глядзяць на мяне, як чужыя,
Людзі жывуць у нядолі ў палоне.

Што ім сказаць, адарваным ад свету,
Што абяцаць ім, не верачым Богу!
Што ім з таго, што я зноўку прыеду,
Помніць век буду дадому дарогу!

Маці і бацька, даруйце вы сыну,
Вырас я, гледзячы крамам у вокны.
Поўныя крамы — мы любім Айчыну,
Мала хто любіць Айчыну галодным.

Заўтра зноўку у горад паеду,
Буду стаяць там у чэргах стамлёны,
Злосна і моўчкі курыць цыгарэты,
Слухаць на ўладу людскія праклёны.

...Дрэвы старыя і хаты старыя,
Шэрым быллём зарастае дарога.
Людзі глядзяць на мяне, як чужыя,
Людзі баяцца чужога.

●

Сёння пуста ў магазінах.
Раздзірае сум душу.
Мне б з прыгожаю жанчынай
З'ехаць за мяжу.
Я сяджу ў пустой кватэры,
А кватэра, як турма.
Сёння людзі ў грошы вераць,
Грошай у мяне няма.
Мне б прадаць пра шчасце мары,
Ды ў людзей хапае мар.
І былыя камісары
Нам гавораць пра пажар,
Што ўзгарэцца можа хутка
На раздзеленай зямлі.
Багацеюць прастытуткі —
Не кахаюць за рублі.
У гатэлях зноў смяюцца
Чужакі й свае паны.
Ну а людзі ў чэргах б'юцца,
Азвярэўшы ад маны.
А па радыё далдоняць:

Сяргей Шмурыгін

якасць смерці

апавяданне

Сяргей Шмурыгін нарадзіўся ў 1954 годзе ў Бабруйску. Закончыў Ленінградскую лесатэхнічную акадэмію і інстытут замежных моў. Працаваў у сельскай школе Старадарожскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі. Зараз — інжынер аддзела дакументацыі і інфармацыі Мінскага электратэхнічнага завода. У штотыднёвіку друкуецца ўпершыню.

МЫ ПРЫЕХАЛІ сюды, каб злавіць апошнюю рыбіну. Не апошні кілаграм ці, скажам, пуд, калі ў вас прызапашана сетка, тол альбо атрута, а апошнюю рыбіну. Ёсць амаль што дакладныя звесткі, што гэта мае быць шчупак. Кіло пад дзесяць. А можа, і больш, з пуд. Так кажуць мясцовыя жыхары. Старэйшы навуковы супрацоўнік на блакітным «масквічы» называе іх абарыгенамі. Яго самога мы завём Трафікам.

Ужываць тол, атруту ці сетку, вядома, забаронена. Увесь час было забаронена, але заўжды ўжывалі. А цяпер ужо ўсё роўна. Апошняя рыбіна і сама здохне: жэрці ёй няма чаго. Трэба хутчэй узяць яе і рушыць у новыя мясціны. Ёсць амаль што дакладныя звесткі, што ў Ціхім з'явіліся падлешчыкі. Знаёмцы паведамілі. Яны сетку там ставілі і здабылі кіло сем. Добрыя падлешчыкі — грамаў па трыста. Цяперашнім часам гэта рэдкасць.

На паўднёвым беразе ўжо кастры засвяціліся. Мы ж заўсёды на паўночным стаім. Тут менш народу таўчэцца, бо падыход да вады забалочаны крыху, але мы прывыклі.

Першы вечар заўжды самы прыемны. Разбілі лагер ля старога папялішча. З возерам мы даўно знаёмы, гадоў пятнаццаць. І амаль заўсёды спыняемся тут, на поўночным беразе.

Наогул кажучы, рыбакі звычайна стараняцца адзін аднаго. Разыходзяцца, расплываюцца паасобку. Кожны адпачывае па-свойму. Але сёння здарылася надзвычайнае. Толькі пачалі мы лодкі надзімаць, падбег незнаёмы, у берэце. «Пайшлі, — крычыць, — на старой базе сход збіраецца». Бачым, сапраўды: і лодкі з возера да старой прыстані кіруюць, і Трафікаў «масквіч» асцярожна падпоўз. Сёння пятніца, народ толькі пачаў збірацца. І ўсё прыезджыя. Абарыгены даўно на рыбалку рукой махнулі...

Карнет каля лодак-гумовак застаўся, а я і Лоб да базы пайшлі, паглядзець, што там такое будзе. Можа, інфармацыю якую аб'явяць, а можа, шчупака таго ўжо спаймалі, тады мяняць трэба планы — рыбіна гэтая тут апошняя.

Наблізіліся мы, бачым — чалавек дваццаць сабралася, а на слупок ад паламанай лаўкі Дацэнт узлазіць. Гэта напарнік Трафікаў, часта разам выязджаюць. Відаць, выпіць яны паспелі ўжо, занадта ўзрушаны ён быў, запальчывы. Спачатку і незразумела было нават, пра што ён гаварыў са слупка. Тыя, што паблізу стаялі, зараўлі незадаволена. Потым ціха стала, і мы сёетое пачулі.

— Дакажам, — крычаў Дацэнт, —пацвердзім сваю кваліфікацыю. Спартсмены мы ці хто?

— Пойдзем, — кажу я Лобу, — няма чаго гэтага эксгібіцыяніста слухаць. Мы сюды не на мітынгі-лозунгі прыехалі.

— Чакай, — кажа Лоб, — ён жа пачэснаму рыбіну злавіць прапануе.

— Па-чэснаму? Гэта як? — уголас здзівіўся я. — На бляшню? Ці як? — І задумаўся. А Лоб зароў: «Гарантыі! Дзе гарантыі?» Ён хутка ўсё зразумеў, і, пакуль я даходзіў да сутнасці, рушыў далей. Трэба было пераканацца, што ўсе будуць у аднолькавых умовах, і ніхто ніякай снасці, акрамя спінінга, у рукі не возьме. А сумнявацца былі падставы. Цымбалаўскай кампаніі, напрыклад, хіба можна верыць? Вунь, пяцёра іх, ці шасцёра. Вынаходлівая публіка! Збіраліся, напэўна, усім калектывам сетку закінуць. Гэткай колькасцю браць — шанцаў куды больш.

На слупок тым часам другі прамоўца ўзлез. Усе міжвольна наструніліся — убачылі інспектара Ерафеева. Нават цымбалаўскія быццам у строй пасталі. Рэфлектыўна, вядома, аўтаматычна. Які там з Ерафеева вартавы, калі ён кожную пятніцу-суботу настолькі дармовай напіваецца, што й да лодкі не заўсёды дойдзе, — так і спіць на зямлі каля таго касцярка, дзе яго рашаючая чарка паваліць... Але ў той момант яшчэ цвярозы быў Ерафееў, на выгляд, ва ўсякім разе, і марку трымаў старанна.

Карацей кажучы, даў інспектар гарантыі. Сваёй асобай гарантаваў ды «казанкай» з маторам.

— Я заўжды закону служыў, — сказаў ён, — а заўтра вам паслужу супраць вас саміх жа, супраць натур вашых нялюдскіх...

Доўгая была ў нас вячэра. І нязвычная. Больш моўчкі сядзелі, хоць і выпілі. Гаворка ішла ўсплёскамі, не было прывычнае гарачлівае ажыўленасці. Ціха стала і цёпла. Возера прытаілася, нячутным зрабілася зусім, быццам і не існавала. Толькі подых сырасці выдаваў яго. Падышоў Ерафееў, але не заседзеўся. Прыняў дзяжурную чарку, пажаваў сала, сказаў, што ўвосень яму «чыстым чынам» на пенсію, і пайшоў.

Ноч упала на возера Светлае, цёмная ноч. Карнет спаў, ён функцыянальны: зранку першым устане і раней за ўсіх на ваду выйдзе. Лоб прадзімаў папяросы, курыў, я таксама не спаў. Мы стрэсвалі попел у бляшанку з-пад кансерваў, маўчалі. Мы прыехалі сюды, каб злавіць апошнюю рыбіну, і мы яе заўтра зловім.

Вядома, раніцай першым устаў Карнет. Ён ужо чвякаў на беразе помпай, калі мы з Лобам павыпаўзалі з палаткі. Лоб старанна выцер лодку мокрай анучай, што рабіў зранку вельмі рэдка. Падпампаваўшы лодкі, мы, не згаворваючыся, вярнуліся да палаткі, налілі і выпілі, чаго раніцай раней ніколі не рабілі. Мы маўчалі, адзін на аднаго не глядзелі і сустрэліся вачыма толькі пасля таго, як апаражнілі шклянкі. Калі б у нас былі з сабою белыя кашулі, мы б іх, пэўна, апранулі.

Некалі назвалі возера Светлым. Відаць, за празрыстую ваду ды белы пясок. Лоб першым з нас пабыў тут, і яго поўны эпітэтаў расказ быў уторканы клічнікамі. Лоб не маніў, рыбацкі аповяд — жанр спецыфічны. Нельга перапыняць рыбака, калі ён гаворыць аб сваім запаветным занятку, крыўдзіць яго недаверам. Рыбак не хлусіць, ён апавядае пра святое, і гэта заўжды праўда. Прэч, малаверы, адыдзіце, дайце мне сказаць, а жадаючых пачуць пра возера Светлае! Пра вялізных, магутных, нястрымных сазанаў, што выскокваюць з вады насустрач ранішняму сонцу. Пра тоўстых кілаграмовых краснапёрак з малінавымі плаўнікамі. Пра вусатых залатых лінёў велічынёй з добрую місу. Пра чорна-карычневых мускулістых вугроў з сінім палеазойскімі вачыма. Пра акунёў з паласатымі бакамі і жоўтым тлустым пузам. Пра шчупакоў — бадзёрых, моцных, прагных шчупакоў...

Гэтакім было возера Светлае. Люстраная гладзь, прыбярэжныя водмелі за паласой чаратоў, лясістыя схілы...

Я выплыў на вялікую ваду. Туману няма, усё праглядваецца. Карнет ужо адплыў даволі далёка. На вадзе лодак шэсць-сем. Тарахціць матор: Ерафееў, трацейскі суддзя, забяспечвае гарантыі. Ззаду хлюпае вёсламі Лоб. Пара адпускаць бляшню.

Спінінг з катушкай і бляшнёй ды падхватнік—толькі гэта прызначана ўдзельнікам па ўмовах канвенцыі. Кожны выняў любімую, удачлівую, праверaную бляшню, кожны на яе папляваў. Пераможцу ў распачатым спаборніцтве наканавана доўга жыць у рыбацкіх байках. Злавіць апошнюю рыбіну —гэта не жартачкі, тут і шчасце сваё праверыш, і майстэрства спатрэбіцца.

Шчупакоў я перабачыў за свой век, ведаю іх звычкі і ўвесь набор іх хітрыкаў. Падхватнікам браў і проста рукамі з вады таксама даводзілася. І ўпускаў, бывала, і рукі выпадала рэзаць. Але ў лоўлі на «дарожку» я мастак, гэта ўсе прызнавалі, з кім рыбачыць даводзілася. І закінуць умею, і правесці дакладжанне рэзала ваду, нібы перыскоп ці акулавы плаўнік. Гэткае я бачыў упершыню. Мабыць, нехта спрабаваў накалоць рыбіну, калі яшчэ лёд стаяў. А, можа, яе прывабілі святлом, калі лёд ужо сышоў. Ды схібіў абарыген, — рука здрыганулася з пахмелля ці падгніло дрэўка. Але гэтаму шчупаку нядоўга жыць. Колькі дзён ён носіць у тулаве сталёвыя зубцы? І што жарэ? Апошняя водная жыўнасць усплыла кверху пузам паўтара месяца назад, калі падселі слупы і абярнулася аміячная цыстэрна на заходнім беразе. Тухляціну ці, можа, вадаплаўных? Як бы там ні было, ёк павінен кінуцца на першую ж бляшню. І кінецца, калі сапраўды галодны. А сытым ён быць не можа. Але чаму ён рыскае, ды яшчэ так блізка ад паверхні? Зразумеў, усвядоміў, што марна, бясплённа таіцца ў засадах? Не дае спакою боль ад трызубца, убітага ў чорны цвёрды хрыбет? Знямогся і не мае сілы, каб пайсці ў глыбіню? А, можа, ён ведае, што сёння апошні дзень, і выконвае рытуальны абход, развітваючыся з месцам, дзе прайшло жыццё, з вадаёмам, які згінуў на ягоных вачах?

Перыскоп аддаліўся і знік з поля зроку. Я закурыў і азірнуўся на Лоба, лодка якога ішла за крокаў сто ад маёй. Ён сядзеў, кінуўшы вёслы. Другі раз за гэтую раніцу мы паглядзелі адзін аднаму ў вочы. І ў гэты момант закрычаў Карнет. То быў крык дзікага азарту, крык амаль што ненатуральны, нялюдскі. Сумненняў быць не магло— шчупак узяў яго бляшню.

Паварухнуўшы левым вяслом, я развярнуўся. Чакалася відовішча. У Карнета «клюнула» — што ж, парадуемся за

— Пацярпіце, будзе лепш...
І каму патрэбен сёння
Гэты мой няшчасны верш!

Балада растаптанага ценю

Ці то крык, ці то плач, ці то смех
Над зямлёю пакутнай ляціць,
Вырываючы цішу з-пад стрэх,
Дзе народ бы ў магіле сядзіць.

Вые воўк на пустэльнай гары,
Ён галодны, як цэлы народ,
Што не ўмее пра боль гаварыць
І не бачыць, дзе Бог, а дзе чорт.

Чый жа гэта разгневаны крык,
Чый жа гэта зняверaны плач!
Я да страху, як цемры, прывык
І, як лёс, нада мною крумкач.

Ён плыве нада мною штодзень,
Ён чакае, пакуль я ўпаду,
Ён дзяўбе мой растоптаны цень
І бароніць усю свалату.

Вые воўк на пустэльнай гары,
Ціха людзі выходзяць з-пад стрэх.
І ляціць над зямлёй і гарыць
Божы крык, плач людскі, чортаў смех.

●

Разбілася ваза, і кветкі завялі,
І марна над імі крыляе пчала.
І змрокам вада расцяклася па зале,
Святочнасць у змроку ў нябыт адышла.

І прыдзе жанчына і кветкі сухія
Збярэ без эмоцый і кіне ў смяццё.
Не шкода ёй кветак, бо кветкі чужыя,
Бо кветкі завялі, не ў кветках жыццё.

І толькі пчала будзе стукацца ў шыбы—
За шыбамі кветкі, прастор і святло.
Ля вазы з букетам сустрэцца маглі б мы,
Ды вазы няма, як таго, што было.

●

Зноў стала цёмна і сцюдзёна
І дрэвы сполахна гудуць.
А па-над вёскаю вароны,
Як д'яблы чорныя, лятуць.
Здаецца, што ідзе канчына
Людзям, і дрэвам, і зямлі.
І што тут думаць пра Айчыну,
Дзе мы, гаротныя, раслі.
І сёння хочацца нам Волі...
Ды Волю знае толькі Бог,
Якой не зведаць нам ніколі,
Дзе ціш кладоў і пыл дарог.

Фота В. МАЙСЮКА.

яго. Зрэшты, узяць такую рыбіну будзе зусім няпроста. Але ж каму і браць, як не Карнету? Ён прафесіянал і дасць сто ачкоў любому з гэтага рыбацкага зброду. Зробіць усё, што трэба, без памылак. І без сантыментаў. Няхай ён возьме гэтую рыбіну. І скончым на гэтым. Паставім крыж на возеры, закрыем гэта псеўдаджэнтльменцкае спаборніцтва, дап'ём гарэлку і раз'едземся па хатах. К чорту! Ад мясцовых вод падымаюцца міязмы. Тут нават жаб няма. Бяздомны сапрапелевы могільнік.

Карнет стамляў рыбіну. Ён роўна трымаў напятасць, адваёўваў сантыметры лёскі, калі рыбіна дазваляла, адпускаў, калі яна рабіла чарговы рывок. Мы бачылі, як ён круціўся ў лодцы, калі шчупак пачаў апісваць круг. Ён перахваціў спінінг, выводзячы яго ледзь не з-за спіны, — гэта быў небяспечны трук, але Карнет здолеў. Зноў затрашчаў катушачны тормаз. І сціх. Потым затрашчаў, заверашчаў ашалела, Карнет выбіраў лёску і не паспяваў — шчупак пайшоў на лодку. Мы ўбачылі, як спінінг лёг на надзьмуты борт, і трэба было зноў аддаваць: рыбіна была глыбока ўнізе. Нядужасць яе аказалася падманнай. Яна была поўная сіл. Перыскоп то з'яўляўся, то знікаў, але цалкам яна не паказвалася. Карнет зноў выбіраў. Мы добра бачылі месца, дзе лёска заходзіла ў ваду. Вугал, утвараемы лёскай і паверхнасцю вады, павялічваўся,— Карнет вываважваў рыбіну. Няўжо яна не выйдзе наверх, не пакажа галаву? Стары, вопытны шчупак павінен паспрабаваць стрэсці бляшню. І ён зрабіў гэта. Вада разышлася, і паказалася велічэзная разяўленая пашча. Унутры яе ярка бліснуў пялёстак бляшні. Магутная турбіна хваста падняла рыбіну галаву — непраўдападобна здаравенную — над вадой. Галава загайдалася, заматлялася, затрэслася, мільгацеў між зубоў пялёстак бляшні, чуўся нават ягоны звон.

Шчупак перамог. Мы не ўчулі выдыху расчаравання — Карнет маўчаў. Ён пачакаў крыху і павольна зматаў лёску. Было відаць, што лёска ідзе без бляшні. Карнет нахіліўся, запоркаўся ў лодцы, засоўгаў локцямі. Перааснасціўшы спінінг, ён падняў галаву, зірнуў у наш бок, вякнуў нешта неразборлівае і ўзяўся за вёслы. «Буйная рыбіна»,—гучна сказаў Лоб і таксама пачаў соўгаць вёсламі.

Кампанія наша сышлася даўно, прыцерліся мы адзін да аднаго. Карнет спачатку асабліва прынцыповы быў. Належная колькасць кручкоў — і ніводнага больш. Правілы ён на памяць знаў, і калі які-небудзь жвавы інспектар, нацэльваючыся на дармовую выпіўку, спрабаваў нас падлавіць на нейкіх дробязных дэталях, намер гэты заўжды правальваўся. Ведаеце, які ў малявачніцы дазволены памер ячэі? Наўрад ці. Запытайце Карнета, ён вам працытуе, старонку, параграф і год выдання ўкажа. У нераставы перыяд ці ў забароненым месцы мы раней ніколі не рыбачылі. Усё ў законе. Дакументы ў парадку, узносы заплачаны, лодкі зарэгістраваны. Карнет узорам служыў і даўжэй за нас з Лобам на законным шляху трымаўся. Даўно гэта было — быццам і не было. Зламаўся Карнет. І як не зламацца, калі што ні інспектар, то злодзей з правамі. Рыбы яму дай, чарку налі. І грошы бярэ, і натурай не гідзіцца. Прычапіцца ж заўсёды знойдзецца да чаго — методыка выпрацавана. А каму ахвота адпачынак псаваць, калі палатка пастаўлена, лагер разбіты, месцы прыкормлены? Усё аддасі, толькі б адчапіўся. Як не зламацца, калі кожны другі восці ўжывае, а кожны першы сеткі, ды з тым жа інспектарам ручкаюцца і нібы сваякі развіваюцца? А Карнет да рыбы прагны. Усё выцерпець гатовы, акрамя адзінага — калі хто па ўлову абыдзе. Нам з Лобам яшчэ можна, мы свае, але больш нікому гэткае не дазволена...

Той раніцаю шчупак тры разы хапаў бляшню. Пасля Карнета пашчасціла аднаму з цымбалаўскіх. Быў сярод іх такі Віцёк. Спінінг апошні раз трапляў яму ў рукі гадоў пяць назад. А, можа, ён яго з роду не ўжываў, цягаў з сабой толькі дзеля таго, каб інспектарам паказваць. Віцёк вішчаў і лаяўся на ўсё возера. Пасля таго, як шчупак ужо далёка быў. А раней ён паўтараў усе памылкі, якія толькі можа дапусціць спінінгіст у абыходжанні са снасцю. Заблытаў лёску, паразбіваў аб катушку пальцы, зламаў кончык вудзільні і ўпусціў за борт падхватнік. Засталося яму толькі перакуліцца і тапіцца. Відаць, ён вырашыў прыберагчы гэтыя шанцы да наступнага разу. Шкада,— адным бы паганцам менш. Суцяшае тое, што ў гэтым вадаёме ад тапельца ўжо ніякай карысці. Апошняга ментуза тут звялі гады два назад. Няхай Віцёк пакуль нагульвае масу, аднойчы яго дастануць з уласнай жа сеткі — час прыйдзе, няма сумнення.

Вадзяны Дзед, старэйшы з цымбалаўскіх, першым падвеславаў да героя пасля сутычкі з рыбай. Дзед быў калючы, з'едлівы, як купарвас. Многа б я даў, каб паслухаць прамову, з якой ён звярнуўся да свайго памагатага. Віцёк паплыў да берага — адзначыць «удачу», запіць дзедавы смачныя словы, за ім павалакліся яшчэ двое з цымбалаўскай суполкі.

А праз колькі мінут наш шчупак ужо катаў па вадзе мужычка ў берэце. Адкуль ён толькі сілы браў! Трэці раз і такі слалам! Дзядзька ў берэціку быў дробны, на аднамеснай лодцы з лапаткамі замест вёслаў, тым не менш, вагу ён меў. Спыніць рыбіну ён так і не здолеў, гульня прайшла ў адны вароты. Гэты спецыяліст дазволіў рыбіне разматаць усю лёску і яна абарвалася на вузле, якім была прывязана да катушкі. Відаць, вузел быў надта лоўкі.

Шчупакоў я перабачыў за свой век. Здабыць гэтага, нават калі ён трапіць на маю снасць, я наўрад ці здолею. Падхватнік мой малаваты для такой рыбіны і рукі ў мяне кароткія. Ды справа нават не ў гэтым. Перахацелася мне лавіць гэтую рыбіну. Няхай бы жыла. А калі будзе здыхаць, няхай робіць гэта не на маіх вачах. Я б даў ёй магчымасць памерці натуральнай смерцю. Хоць слова «натуральная» ці дарэчы ў дадзеным кантэксце. Яно гучыць насмешкаю. Натуральная смерць даўно выйшла з ужытку і занесена ў чырвоную кнігу. Натуральная смерць — гэта дапатопны атрыбут і няўяўная раскоша. Калі п'яны Віцёк ноччу бухнецца з лодкі і заблытаецца ў сетцы, ці будзе гэта натуральная смерць? Калі Вадзяны Дзед з лютага пахмелля хапне штонебудзь малаправеранае з гаспадарча-бытавога асартыменту, і ягоны старэчы арганізм не вытрымае, што напіша фельчар у заключэнні? Калі Трафік на сваім «масквічы» грымнецца дзе-небудзь з масткоў, уцякаючы ад інспекцыі, ратуючы біяграфію, сеткі і здабычу, як будзе кваліфікавана ягоная згуба?

Як будзе паміраць наша рыбіна, апошняя рыбіна Светлага, якую мы ўчора азартна паставілі на кон? Паміраць яна будзе ненатуральна і страшна. Яна будзе гінуць ад іржавага металу і гноевых ран на спіне. Яна будзе здыхаць з голаду, застаўшыся апошняй жывой істотай у гэтым асфальтавым катле, будзе канчацца з-за адсутнасці кісларода ў гэтым гнілым балоце з нафтавымі плямамі, запляваным і заванітаваным. У гэтым катлаване з ліловай жыжкай, захламленым агрызкамі, акуркамі, бутэлькамі, бляшанкамі, іржавым жалезем і слізкай збуцвелай драўнінай. У гэтай адстойнай яме, перапоўненай антрапагенным дзярмом, атрутнымі сцёкамі, у якім гной, фосфар, азот. Калі яна ляжа на бок — перад тым, як кульнуцца дагары пузам, рыба завальваецца на бок,— яна не ўбачыць ні нябёс, ні сонца, ні зорак. Іх засцяць выпарэнні, ядавітыя туманы, што падымаюцца з паверхні таго, што некалі называлася вадой возера Светлае. Не ўбачыць яна нічога. Бурыя газы схаваюць ад яе хутар з крывымі жэрдкамі антэн, кароўнік і загарадзь, што падыходзіць да самага берага, перавернутую аміячную цыстэрну, лазню з памостам для ныранння, лодачную станцыю і лодкі з абдзёртымі днішчамі, прафілакторый для работнікаў разумовай працы з пазабіванымі вокнамі, абмялелы заліўчык і масток з засланкай для рэгулявання сцёку малой рачулкі з некалі празрыстай вадой і чыстым пясчаным дном...

Так будзе паміраць апошняя рыбіна. А, можа, і не так. Хутчэй не так. Сённяшнія джэнтльмены заўтра возьмуць сетку — напэўна, гэта зробіць цымбалаўскі зброд — і акуратна раскінуць яе з беспамылковай арыенціроўкай на перыскоп. Рыба галодная, зморaная, сродак надзейны. Віцёк раскладзе шчодры касцёр, і яны будуць трэсціся вакол агню ў рытуальным танцы. Яны не дадуць ёй здохнуць спакойна. А якім малайцом яна сябе паказала. Няможна, каб яна трапіла ў зладзейскі кацёл, ператварылася ў страву, у закусь на варварскай пагулянцы. Нельга, каб яны яе дасталі. Няўжо Лоб мяне не падтрымае? Якімі вачыма глядзеў ён сёння рана.

Я агледзеўся. Лоб і Карнет счапіўшы лодкі і задраўшы ногі на барты, ці курылі, ці гутарылі аб чымсьці. Карнет, відаць, інтэрв'ю даваў. Большасць астатніх удзельнікаў таксама паастылі. Не суніміліся толькі Вадзяны Дзед ды Дацэнт з Трафікам, што арудавалі на адной лодцы.

Пакуль мы плылі да берага, збіралі дровы, гатавалі суп з канцэнтрату, я ўсё шукаў выйсце, абдумваў аргументы, падбіраў словы. Але запал мой ападаў, не выстройваўся ў мяне канкрэтны план, так, адны сантыменты. Дапусцім, Лоб і Карнет падтрымаюць мяне, а які толк? Што нам — насіцца па беразе, сход склікаць? Ды гэтую публіку ніякімі аргументамі не праняць. Падлюгі. Скажуць: «Ты, чмур барадаты, на беражку паляжы, раз твая гуманітарная адукацыя прачнулася. Раней трэба было рэфлексаваць і аб экалогіі клапаціцца, калі перамёты на сто кручкоў ставіў. А гэтай жывёліне ўсё роўна здыхаць — у гэтым балоце жыццё скончылася». І будзе іх праўда. І ніхто не адступіцца. Ні Дацэнт, які ведае слова «эўтрафіраванне» і згодзен каля касцярка паразважаць аб біясферы, антрапагенным прэсе, папуляцыі і экасістэмах. Ні Трафік, без пяці мінут кандыдат нейкіх там навук, уладальнік транспартнага сродку з заляпаным граззю нумарам. Ні гэты дробны ў берэціку, што эканоміць на ўласным жыцці, клеіць-пераклейвае сваю лодку эпохі першай сусветнай. Ні Вадзяны Дзед, які прамышляе ўвесну па нерасцілішчах. Ні Віцёк, які з маленства ў яго ў падручных. Ніхто. А Ерафееў — які ён інспектар? Быў інспектар, пакуль не прымаў хабару, не браў чарку з рук здабытчыкаў. А цяпер — зламысны саўдзельнік.

І сам я не лепшы. Сеткі — не, але перамёт ужываю. Сто не сто, а па сорак кручкоў ставіў. Не маю права з высокімі пачынаннямі лезці. Адным грэбенем чэсаны. Раз захацелася ў святыя, лепшае, што магу зрабіць, гэта пры ўсім пры гэтым не прысутнічаць. Увечары на лоўлю не выязджаю, а ранкам, што б там Карнет з Лобам ні вырашылі, скручваю манаткі і на аўтобус. Ліха яго бяры з кампаніяй!

Ціха было ў лесе. Дагараў агонь. Ерафееў учыняў традыцыйны абход стаянак. Лоб сказаў, што пойдзе ў хутар да знаёмых, і патупаў. Прыцягнецца гадзіны праз тры — у дыміну.

Пачвякаў помпай Карнет, папоркаўся каля лодкі і адчаліў. Не можа ён склаўшы рукі сядзець і да рыбы прагны.

Я падняўся і павольна пайшоў па знаёмай сцяжынцы. Па вывучаным да дробязей беразе. Ішоў я тут апошні раз. Вось і масток. Калісьці пад ім, у трубах, вяліся ракі. Гэта было вельмі даўно.

На мастку стаяў Лоб. Ён стаяў нерухома, абапёршыся на парэнчу, і глядзеў у ваду. Я зразумеў, на што ён глядзіць, раней, чым кінуў туды позірк. Там была наша рыбіна. Яна прыплыла паміраць у заліў, дзе нарадзілася на свет. Вось яна — доўгая і чорная. Нават пуза, якому ў такой старой рыбіны належыць быць жоўтым, было ў яе чарнавата-шэрае. Вялізнае вока ненатуральна вылуплена. Восцяў у хрыбце не было, відаць была рваная рана. Рыба ледзь прыкметна варухнула жабрамі, колер жабравых пласцін быў нездарова цёмны. Яна ляжала на баку, нібы падагнуўшы калені. Перад тым, як павярнуцца дагары пузам, рыба завальваецца на бок.

«Мы вярнуліся да пачатку...»

«Балтыйская тэатральная вясна»

Яна імкнула ў Гародню пад рознакалёрнымі ветразямі нацыянальных сцягоў краін-удзельніц; праз колькі дзён у міжнародным фестывальным клубе крытыкаў заўважылі: наша спатканне сімвалізуе пашкуматаны вітальны транспарант у гарадскім гістарычным цэнтры... Дзевятая—апошняя? І калі дзевятай «Вясне» наканавана зрабіцца апошняю, дык яе сталіцаю назаўсёды мусіць застацца Гародня года 1992, — з даджом-снегам, незразумелымі цэнамі, велікоднымі пісанкамі ды па-над часавым спакоем бажніц, з фестывальнай экскурсіяй па іх, калі грамаду збівалі з тропу паведамленнямі — пра Янку Купалу як пра «фундатара беларускай паэзіі», пра гарадзенскую пажарную вежу, што «не з'яўляецца творам архітэктуры», альбо перасяленнем знакамітага Ле Ду з Пастаў у гарадзенскія межы, — прынамсі, Антоні Тызенгаўз, што запрасіў балетмайстра з Францыі, быў бы ўсцешаны. «А цяпер хадзем да Барышава, — падбухторвалі адзін аднаго крытыкі і рэжысёры, — ён раскажа, як было на самай справе». Прафесар Барышаў мусіў весці сваю экскурсію праз увесь фестываль...

— Гэты горад, — распавядаў ён напачатку, — адметны як гістарычны і культурны цэнтр: тут крыжаваліся мастацкія каштоўнасці Захаду і Усходу, мірна суседзяцца помнікі старажытнарускага дойлідства з італійскім каталіцкім барока, павятовы ампір з вытанчаным ракако, — стварэннямі дрэздэнца Пёпельмана. У гэтым старажытным цэнтры зямлі беларускай ладзілі свае рэзідэнцыі польскія каралі, а Вялікі князь Вітаўт зрабіў Гародню другой — малой сталіцай Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Не менш значным было і яе тэатральнае жыццё — ягоная храналогія пачынае свой адлік з 1651 года, з першых спектакляў мясцовага калегіума, дзе ў інтэрмедыях героі ўпершыню загаварылі пабеларуску. Больш за трыста гадоў гарадзенскія жыхары мелі магчымасць знаёміцца з тэатральным мастацтвам мноства народаў, чуць са сцэн разнамоўе. У Гародні выступалі антрэпрызы польскія, рускія, нямецкія, яўрэйскія, французскія, летувіскія італійскія... Тут дэманстравалі сваё майстэрства тэатры двух «слупоў» тэатральных культур двух славянскіх народаў, — бацькі польскага тэатра Войцеха Багуслаўскага ды стваральніка першага прафесійнага тэатра беларусаў Ігната Буйніцкага. Нельга не згадаць і знакамітую гарадзенскую трупу А. Тызенгаўза, чые прыгонныя танцоры у XVIII стагоддзі запачаткавалі варшаўскі балет — «Танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці»; удзельнікі Міхаіл Рымінскі ды Дарота Сітанская зрабіліся ягонымі зоркамі. Можна назваць і іншыя імёны, што так ці інакш маюць дачыненне да беларускай тэатральнай культуры праз пасрэдніцтва старажытнага беларускага горада. — Паўла Арленева, Саламею Дэшнер, Элізу Ажэшку, Мацея Кажынскага, Юлюша Астэрву... Гародня заўсёдна была тэатральным горадам, — спатканняў, гастроляў, фэстаў...

Няўжо гораду заўсёдных тэатральных фэстаў наканаванатакі зрабіцца сталіцаю апошняй «Балтыйскай вясны»? Пытанне гэтае не задавалася на афіцыйных пасяджэннях клуба крытыкаў уголас, але між сабою пра гэтае «няўжо?!» шмат хто нагаварыўся, наспрачаўся. Відавочна, сім-тым з мастацкіх каштоўнасцяў Захаду ды Усходу выпадае да скону крыжавацца на гарадзенскіх абшарах; сцэнічныя доследы апошняга тэатральнага фестывалю, ягоныя лабараторыі, практыкаванні, сутыкненні зводзіліся ў агульную нетаропкую плынь абаяннем прафесара Барышава, які шчодра дзяліўся з калегамі сваімі ўражаннямі, — яму хацелася адказваць такой самай шчодрасцю. Мне пашэнціла больш за іншых. Дарога дадому была доўгаю, думка пра тое, што ніякі тэатр не зразумее сваёй глыбіннай сутнасці, калі не будзе параўнаны з іншымі, — здавалася неаспрэчнаю, і гутарка са старшынёй міжнароднага фестывальнага клуба крытыкаў вынікнула нібыта сама сабою.

— Гуры Іларыёнавіч, як той казаў, за дзяржаву крыўдна: зразумела, чым з'яўляецца для Беларусі лабараторыя нацыянальнай драматургіі «Вольная сцэна», але той, хто давёў яе прадстаўніцтва да «Балтыйскай вясны», ці ж не паспяшаўся? Тое, што ў Мінску здавалася чымсьці накшталт эксперыменту, на фоне эстэтычных пошукаў сусветнага тэатра выдавала на цьмянае незразумелае марнатраўства...

— Перадусім беларускі лабараторны твор, «Ку-ку» М. Арахоўскага, моцна выбіваўся з так званых эстэтычных крытэрыяў, — менавіта тым, што мастацкім творам так і не зрабіўся. Моцна падвёў спектакль узровень рэжысуры ды сцэнаграфіі (згадайце, як на ягоным фоне ўспрымалася выяўленчая рэжысура фінскага спектакля, — тэатра з Лахці, — «Шкляны звярынец» Т. Уільямса!).

— На маю думку, першым ды адзіным рэжысёрам фінскага спектакля якраз выступіў сцэнограф. Ягоная выгарадка з празрыстага пластыку, які меў эфект люстэрка і ў дадатак прасвечваўся наскрозь, утвараючы некалькі планаў «залюстроўя», ягоныя яркія кропкі касцюмаў Аманды, альбо шкляныя цацкі, якія ніяк не можна было лічыць калекцыяй Лавуры (здавалася яны набытыя за адзін раз, аднастыльныя ды падобныя, — як парыванне зрабіць прыемнае ці як адчэпнае) — утваралі знакамітую атмасферу спектакля, — тое, што на працягу пятнаццаці хвілін разбурылі ды збэсцілі акцёры, дарэчы, таксама па рэжысёрскай падказцы. Сцэнаграфія «Ку-ку» (мастак У. Осін) мне напачатку спадабалася. Я ўявіла гэткае закуліссе, тэатральныя задворкі, куды зносіцца ці выкідваецца рознае непатрэбства, накшталт бутафорскіх гадзіннікаў, выцвілых драпіровак, збуцьвелых дошак,—за адным разам і чалавечай прыстойнасці, кахання, далікатнасці... Стары, закінуты свет чалавека тэатра, якому не наканавана зведаць спакою. Суіснаваць-зносіцца з афармленнем герой мусіў паводле Шэкспіравага «ўвесь свет — тэатр...»

— Уяўляю, якім моцным было вашае расчараванне з таго, як гэтыя «задворкі» працуюць, дакладней, не працуюць у спектаклі. Памылкі рэжысёра я магу назваць досыць распаўсюджанымі. Шмат хто забываецца: ніводзін прадмет на сцэне не можа быць выпадковым! Вырашаць яго можна ў самай неверагоднай стылістыцы, але любая свяцільня, драпіроўка ці гадзіннік на падмостках жывуць сваім жыццём, і пажадана, каб яно суадносілася з жыццём персанажаў. Сцэнаграфія «Ку-ку» на іх зусім не зважае. Вось вам і пытанне: суадносіны розначасавых рэчаў, сабраных разам. У фінаў ненавязлівы тэхнічны прыём раскрываў новыя прасторы ды перспектывы, а ў «Ку-ку» я ўбачыў не больш як заяўку на матэрыялізацыю персанажаў, скажам так, з дэкарацый, — яна паступова ператварылася ў прэтэнзію. Пра спосаб існавання акцёраў пры сцэнічным пераходзе з рэальнага ў ірэальны свет нават спрачацца не даводзіцца, — ён проста не знойдзены.

— Ну, Гуры Іларыёнавіч, гэта вы проста за пастаноўшчыка працуеце, вырашаеце. Даводзіцца ж зыходзіць з таго, што рэжысёр А. Гузій прапанаваў... А чаго ён толькі ні прапанаваў...

— Перадусім — новую драматургію, якой бракавала якраз новага (прынцыпова) увасаблення. Уражанне такое, што рэжысёр проста не ўяўляў, як абысціся з матэрыялам п'есы, якую, у сваю чаргу, мо і не адзін год (!) трэба даводзіць да сцэны, — мо не на сцэне? Таксама мушу нагадаць пра «спектакль», які адбыўся перад фестывальным паказам «Куку»: фестывальны вядучы са сцэны звяртаецца да рэжысёра з просьбай распавесці пра падставы абрання падобнага матэрыялу, а рэжысёр прыгожа атайбаваўся... на галерэі. Дыялог між рампаю ды галерэяй мусіць выслухаць увесь спанатраны тэатральны свет,—хацелі разыграць выпадковасць, атрымалася нягегласць са звышзадачай: падрыхтаваць публіку (крытыку)... Да паразумення?

— Дуэт фестывальных вядучых напраўду выглядаў правінцыйна, асабліва са сваімі бясконцымі згаднамі, пажаданнямі, недарэчнымі просьбамі да ўдзельнікаў перад паказам распавесці пра свае тэатры альбо перапрашэннямі паненні-вядучай, маўляў, дрэнна валодае беларускаю мовай... Але гэта ўжо заклды да правінцыйных высілкаў рэжысуры самой «Балтыйскай вясны».

— Сапраўды, на фестывалі такога ўзроўню варта было б і адмовіцца ад нечага традыцыйна-кансерватыўнага. Ну а як вытлумачыць дамаганні шаноўнай рэдактаркі з Беларускага радыё, маўляў, чаму наша крытыка не змагалася за свае спектаклі, а перадусім не дапамагала зрабіць з іх шэдэўры? Але галасы крытыкаў са шмат якіх рэспублік засведчылі правалы і трох прызнаных лідэраў-мэтраў: Вайткуса, Шапіры, Луцэнкі. Проста гэта не іхні час, не іхні пік, — творчасць іхнюю, між тым, ніхто не збіраецца ганіць ці бэсціць. Каштоўнасць жа фэста — агляд тэатральнага **працэсу**, паразуменне, параўнанне. Пасля спектакляў адбываліся не менш цікавыя спектаклі ў клубе крытыкаў, калі абмеркаванні ператвараліся ў дыскусіі... Згадайце абмеркаванне «Ганчарні Эп Піларпарт з Пуньяба» П. Валака, — эстонскага спектакля, названага лепшым на фестывалі! Там спраўляюць нібы зусім не тэатральныя справы, а менавіта — лепяць гаршкі дзве дзеі запар. Ледзь не кожны з крытыкаў быў уражаны тым, як гучаць, як «гуляюць» гэтыя рэальныя гаршкі! Памірае стары майстар: акцёр спыняе ганчарны круг, выцірае рукі, перастаўляе гаршчок на паліцу і, перасекшы сцэну, сядае на супрацьлеглым баку за канэль, эстонскі народны інструмент, што нагадвае цытру. Стварае музычную тканіну спектакля і з'яўляецца ледзь не антычным хорам! «Адтуль» кіруе дзеяннем «гэтага» боку, — вось вам і сутнасць дачыненняў пакаленняў!

— Тэатр П. Педаяса, здавалася б, набліжаны да побытавасці, на самай справе метафарычны ў кожнай сваёй праяве: ад вярчэння гаршка да пацалунка гераіні. Свет спектакля па-боску ствараецца з боскага матэрыялу — гліны; з яе —і лёсы герояў спектакля, і жыццё-існаванне, і будучыня... Два майстры, што прэтэндуюць зрабіцца гаспадаром ганчарні і мужам Эп, у спаборніцтве лепяць-абпальваюць самі сябе ды адзін аднаго! Нават літаральна — аднаго разу маладзейшы ледзь не пазбыўся вока...

—Мяне ўразіла і чорная праца, калі з кавалка матэрыялу ствараецца рэч, і другі мастацкі план: людзі, што ва ўяўным побыце не надта прыгожа сябе трымаюць, не дужа вытанчаныя пачуцці дэманструюць, у працы — прыўкрасныя. Натуральны жыццёвы спакой, мудрасць існавання, сэнс быцця... Насмешкаю з іх мяне ўразіў літоўскі спектакль «Боскае ягня» Ф. Баёраса ў пастаноўцы Е. Вайткуса. Уразіў, удакладню, напачатку, — падаўся рэжысёрскай пародыяй на штампаваныя прыёмы, адметным хуліганствам на тэму «опера ў драматычным тэатры», бо менавіта опера была прадстаўлена нам... Летувіскім тэатрам нацыянальнай драмы!

— Але з расцягнутага падзейнага шэрагу оперы выйсця драматычнага рэжысёр не знайшоў. Акцёры спявалі, дзеянне стаяла. Як паставілі— тры дзеі засаб. Пераўскладнёная фармальная рэжысёрская мова, калі кожны персанаж цягае на сабе (літаральна) знакі свайго сацыяльнага становішча ці грамадскай арыентаванасці, ад лясных братоў з рагамі-рагацінамі да стрыбаў-знішчальнікаў у аперэтачных чырвоных штанах...

— Яны нагадалі мне знакамітага Папандопулу з легендарнага фільма, канчаткова разбурыўшы вобраз спектакля...

— ...Да сялян з дамкамі ці хацінкамі на галовах, альбо велізарных масак забітага героя, — то акрываўленай, то пасмяротнай. Калі Вайткус і напраўду з некага ці з нечага здзекаваўся, дык гэта з прыёмаў, ім самім некалі вынайдзеных.

— У мяне пасля «Боскага ягняці» ўзнікла паралель з Голым каралём. Два ткачы (кампазітар ды рэжысёр?), ведаючы норавы двара, смяюцца з яго. Дворня не пасмее сказаць сабе, што кароль — голы. Уражанне, што Вайткус наздзекаваўся і з самога сябе, і са свайго тэатра, не пакідзла мяне...

— Дзе-дзе, а на фестывалі «Боскае ягня» зрабілася ахвяраю, прабачце, аголенасці сваіх каралёў. Іронія мроілася на пачатку відовішча, перасур'ёзненага рэжысёрам. Музыка, на чыёй драматургіі мусіла грунтавацца дзеянне, не адпавядала таму, як яе... ілюстравалі...

— Музыка разышлася з рэжысурай! Да такой ступені, што нават фабулу спектакля цяжка было зразумець без падказкі! Я ўспрымаў відовішча, так бы мовіць, з нядаўняй гісторыі (змаганне супраць чырвоных, сваіх за сваё) як рэч у сабе — да таго зашыфраваную, што зразумець яе, бадай, мог толькі сам стваральнік. Магу правесці паралель са спектаклем «Канферэнцыя птушак» Ж.- К. Кар'ера нямецкага тэатра з Мангейма. Строга інтэлектуальны спектакль, вельмі філасофскі, пабудаваны на ўсходніх прыпавесцях, які быў створаны пластычнай, музычнай, харэаграфічнай моваю прымітыўных тэатраў, што зберагліся як рытуальныя з'явішчы народаў Афрыкі, Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі, Індыі, Інданезіі. Там можна знайсці што душа пажадае, ад пекінскай оперы да Но. Маскі — ад Лацінскай Амерыкі да Афрыкі... Кожнай птушцы была знойдзена пластычная мова. А калі ў Вайткуса з'яўляліся сяляне з хатамі на галовах, я губляўся: гэта накшталт сярэднявечнае выявы дзяка Тэафіла, які трымае на плячах бажніцу і ўсе лічаць, што ён зрабіўся Князем царквы, ці прыём, нягегла запазычаны з вядомага Тышлера?

— Оперная ўмоўнасць, перанесеная ў драму Вайткусам, не знайшла і акцёрскай натуральнасці. Драматычны артыст зусім не падрыхтаваны працаваць па законах і патрабаваннях іншага мастацтва. Але ж і выбітная «Канферэнцыя птушак» (яе аснову склалі немудрагелістыя пошукі сэнсу жыцця — птушкі шукалі свайго караля Зімурга), нібыта прызначаная для тэатральных гурманаў, канала хвілін праз пятнаццаць. Задума рэжысёра была празрыста-ілюстрацыйнаю, цягнула час. Фінал, на маю думку, мог прыйсці напрыканцы першага акта. Другі акт я цярпліва перажывала з надзеяй на эфектны нечаканы фінал, які, здавалася, рыхтуе замаруджанае дзеянне, — доўгія пералёты птушак, высілкі ў пошуках свайго караля, маленькія прыпавесці-павучанні, якія разыгрывалі між іншым, і, дарэчы, не самым дасціпным чынам уштукаваліся ў кантэкст спектакля. Ён апавядальна-размоўны, манатонны, і кульмінацыйная сцэна пераходу птушак з нашага свету ў іншабыццё (адбітак іх цьмяных ценяў на чырвоных шырмах-прасцірадлах), здавалася, рыхтавала фінал незвычайны, але абяцанка... Голас з-за сцэны літасціва абвясціў залі, што птушкі, якія шукалі свайго караля, самі з'яўляліся ім, — скажам, сэнс жыцця ў жыцці. Словы, словы, словы...

«Хрыстос і Антыхрыст» Д. МЕРАЖКОЎСКАГА. Рускі тэатр Беларусі, Мінск.

«Дэмакратыя» І. БРОДСКАГА. Маладзёжны тэатр Латвіі (руская трупа), Рыга.

— Думка пра тое, што і мангеймскі, і вільнюскі спектаклі перадусім для гледача звышлітарнага, не пакідае мяне і цяпер. Мангейм далёка, але цікава было б даведацца ў Вільні: ці ходзіць на «Боскае ягня» публіка? Мо на першых спектаклях жарты-кпіны разумеліся? Два гады назад для тэатраў Балтыі была характэрнаю празмерная спалітызаванасць, асабліва гэта было заўважна на фестывалях у Рызе і Вільні. Ці не на той час прыпадала опера Ф. Баёраса?

— Якая ў сённяшнім тэатральным жыцці выглядае музейнаю. Гэткім чарговым кпінам чарговай «лабараторыі нацыянальнага»...

— Я думаю, што ўсе, дачыненыя да тэатральных лабараторыя (і наша «Вольная сцэна» ў тым ліку), не павінны прэтэндаваць ні на якія прызавыя месцы ці асаблівае стаўленне. Калі б іхнія відовішчы ўяўлялі сабою нешта прынцыпова новае, непаўторнае, скажам, па стылістыцы, якой тэатр яшчэ не зведаў! У якасці выбітнага прыкладу згадаю Уршулю Радзівіл, якая ў сваім тэатры гуртавала герояў камедыі дэль артэ з героямі «Тысячы і адной ночы», альбо сярэднявечнай агіяграфіі, ды ці мала што яшчэ: чалавек, упершыню пабачыўшы тэатр, вырашыў стварыць яго сам! Яна — стварыла і тупала сваімі далікатнымі ножкамі па ягонай прасторы як хацела, — нездарма яе стварэнні буйныя тэатразнаўцы вылучаюць як адметныя тэатральныя прымітывы XVIII стагоддзя! Калі ж лабараторцы ідуць па шляху вядомым, дык хоць акцёрскае ўвасабленне мусіць мець нешта прынцыпова непаўторнае, не скажу — невядомае. Але і акцёрскія работы ўсіх эксперыментальных ці нібыта эксперыментальных сцэн не парадавалі...

— А тэатр Крэатур з Берліна, як на вашу думку, — эксперыментальны? Работа Анджэя Ворана, мастацкага кіраўніка Крэатура, — ці ж не відавочнае рэжысёрскае «сачыненне на зададзеную тэму» ў духу Тадэвуша Кантара, — яркае, гратэскава-метафарычнае, жорсткае па сваёй структуры і неабдымнае па асацыяцыях: гэткая матэрыялізаваная падсвядомасць Аўтара, чыё дзяцінства літаральна прайшло на сметніку — рэчавым, чалавечым...

— Дзе жывы акцёр суіснуе з натуралістычнымі лялькамі, — тыя паўтараюць ледзь не кожнага персанажа ды ў ягоных розных іпастасях... Яўрэйская навела Б. Шульца, дваццатыя гады кайзераўскай яшчэ Германіі, выяўленчая мова сатыр Гроса і трагічных масак Барлаха... Усё адметна адпрацавана пластычна: кожны вобраз зразумелы. «Крама ўсходніх прыпраў» — гэта тэатр абсурду ў ягонай завершанасці...

«Фарсы, альбо Новыя сярэднявечныя французскія показкі». Тэатр на Ліцейным, Санкт-Пецярбург.

«Цнатлівы шлюб» Т. РУЖЭВІЧА. Тэатр імя А. Хожыцы, Торунь.

— Прадметы, якімі гуляюць-карыстаюцца акцёры — таксама прылады працы, пазначні прафесійнай прыналежнасці. Аўтар згадвае маленства, і галерэя людзей узнікае перад намі: прастытуткі цягаюць за сабой жытло-атрацыён, салдат — недарэчнае прыстасаванне гарматнага прызначэння...

— Ён у польскім ківеры 1812 года і ў англійскім афіцэрскім фрэнчы пачатку нашага стагоддзя, — даведзеныя да аўтаматызму рухі, сам — лялька-манекен, а са свайго забойчага збудавання ў якасці самай страшнай зброі ён выцягвае папляжаны рупар. Маці сямейства з успамінаў хлопчыка цягае на сабе яшчэ дзве свае іпастасі: каханкі, жонкі... Іх яна ў адной са сцэн здымае і літаральна перавешвае на мужа. Дзед, які выгукае нешта з прыбіральні-катэдры, нявеста, якая любому ветру падстаўляе свой вэлюм, каб толькі ўзлунаць над сваім сметнікам...

— Асноўны прыём спектакля — увасабленне, так бы мовіць, згадан-мрояў. Тэатральная гульня рытмаў дэманструе эфект дэфармаванага часу і нібыта мае нешта агульнае з доследамі Кастанеды: час спыняецца, дэфармуецца, замаруджваецца; кадры агучанага абсурдысцкага існавання персанажаў то спыняюцца, то, набіраючы абароты, круцяцца на вар'яцкай хуткасці..

— А згадайце, як пад малітву Хлопчык і Аўтар адыходзяць! Разам з адыходам свайго свету, квартала, дзяцінства, асяродка, народа... Расповяд пра сутнасць чалавека стаўся адным з самых цікавых на фестывалі, а тэатр Крэатур даведаў, як акцёры ад Аўстраліі да Польшчы на нямецкай мове ствараюць маленькі еўрапейскі шэдэўр...

— Тэатр Ворана — тэатр аўтарскі; аўтарскі тэатр на сёлетняй «Вясне» здужаў так званы нацыянальны, прадэманстраваўшы за адным разам, як першы, аўтарскі, не можа спраўдзіцца без пэўнага грунту — другога, нацыянальнага. Пад крытэрый «нацыянальнага» ў спрошчаным агульнатутэйшым разуменні наўрад ці падпадзе і польскі тэатр імя Хожыцы з Торуні. Т. Ружэвіч, чый «Цнатлівы шлюб» у рэжысуры Я. Мацэёўскага тэатр прадставіў — даўно сусветная класіка. Тая, што ўвогуле займаецца канкрэтным чалавекам, — паненкай Б'янкай, напрыклад, і паненкай Паўлінкай, падлеткамі, якія рыхтуюцца ўступаць у сур'ёзнае дарослае жыццё.

— З аднаго боку, ступень даросласці рыхтуе кніжка накшталт падручніка па фізіялогіі (яе, па-мойму, у спектаклі падкідала маці), з другога — чаканне надзвычайных падзей...

— Увогуле прадчуванне надзвычайнага, але дужа асэнсаванага, адказнага, абавязковага, карацей — жыцця кабеты. Вачыма Б'янкі зірнула публіка на свет, дзе тая мусіла чакаць спазнання сэнсу свайго жыцця, — ен для розных узростаў, мабыць, розны, — і пакутваць ад прагі кахання і ад прагі чысціні-самаўдасканалення. Вызначыцца між знакамітымі «як трэба», «як правільна» і «як выпадае». Зацягнуты першы акт спектакля спакваля ўсталяваў атмасферу падлеткавых пакут-рэфлексій (як тут не падзякаваць актрысам Мар'і Керскоўскай ды Малгажаце Хайноўскай!) і, дарэчы, аддаючы належнае Стрындбергу, Ібсену, Гётэ, Пушкіну, Гарэцкаму ці, напрыклад, Сартру, нельга не дзівіцца з «польскіх алюзій», якія спараджае спектакль Мацэёўскага і якія цалкам праграмуе Ружэвіч: знойдзем тут Віткацы, Налкоўскую, Міцкевіча... Дзявочыя летуценні ў прынцыпе, — ці не эпоха ў жыцці жанчыны, пры гэтым — belle époque. Спектакль па-свойму высокаінтэлектуальны ды эратычны, — Эрас Д'ябал разпораз спакушае кожнага з насельнікаў гэтага відовішча, разпораз апаноўваючы ягоны час і прастору. Нават космас рэчаў, які ўяўляе сцэнаграфія, нішто іншае, як метафара змятага шлюбнага ложка. Эратызм спектакля своеасаблівы... эстэтызавана вытанчаны. Польскі рэжысёр нібыта прапануе сваё асэнсаванне дачыненняў чалавека грамадскага з чалавекам біялагічным, цытуе ледзь не з наступнікаў Фрэйда пра жаночую сексуальнасць,—на самай справе «Цнатлівы шлюб», па-мойму, апявае паэзію ды горыч першага спазнання жыцця... Праз спазнанне, праз адчуванне ўласнай душы: не магу не згадаць рэжысёрскія метафары раптоўных азвярэнняў персанажаў, калі стан душы выдае-характарызуе сабачы брэх, кракчанне качкі, альбо свінячы віскат, — за шлюбным сталом замест віншавання маладых...

— Пагодзімся, аднак, што менавіта праз акцёраў на гэтым фестывалі выяўляліся самыя хітрамудрыя рэжысёрскія вынаходніцтвы. Нарэшце мы падступіліся да царавання акцёра, дакладней, вярнуліся да пачатку, — да валадара сцэны ў ягоных найлепшых праявах. Лійна Тэнасаар атрымала прыз за лепшую жаночую ролю, — за ўвасабленне жаночай годнасці, як казалі крытыкі, але не менш цікавою, на маю думку, было і адкрыццё фестывалю — Уладзімір Кін-Камінскі ў пазаконкурсным спектаклі «Тэрмінатар» Беластоцкага тэатра ды ў эксперыментальным беларускім «Ку-ку».

— Што да Кін-Камінскага, дык ён увогуле пазначыў сваімі тэатральнымі работамі сёлетні сезон у рэспубліцы; што да царавання акцёраў, дык менавіта іхнімі высілкамі дагэтуль трымаецца і самы элітарны, і самы неінтэлектуальны тэатр.

— Але ж менавіта «Балтыйская тэатральная вясна» дала нам магчымасць гэта канстатаваць нарэшце! Няўжо — апошняя?..

З Гурыем БАРЫШАВЫМ гутарыла Жана ЛАШКЕВІЧ.

НАШЫ ГОСЦІ

МАЙСТЭРСТВА СІЛКУЕЦЦА ПРАЦАЙ

Маэстра Райнхольд РОГ.

Выступленні ў Мінску ды Гродне маладзёжнага духавога аркестра зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія (ФРГ) прайшлі бліскуча і ўдала ўпісаліся ў панараму насычанага музычнага жыцця рэспублікі. Існуе гэты калектыў з 1985 г. Прынцып і ўмовы фарміравання яго складу даволі жорсткія. Усе прэтэндэнты пасля настойлівай індывідуальнай падрыхтоўкі праходзяць па самых высокіх крытэрыях выканаўчага майстэрства адбор на конкурсе «Моладзь музіцыруе». Збіраецца арыгінальны аркестр лаўрэатаў (70 выканаўцаў ад 14 да 25 гадоў!) толькі двойчы на год — напярэдадні Калядаў ды вясной.

Лаканічнасць творчай дзейнасці, складаны рэжым працы да многага абавязвае, і аддача з боку аркестрантаў досыць высокая. Гэта паказалі і гастролі ў нас, бо свае першыя рэпетыцыі наноў укамплектаваны склад распачаў толькі ў Палацы культуры прафтэхадукацыі літаральна за дзень да выступленняў. Да таго ж адначасова (!) музыканты рыхтавалі праграму для будучай паездкі ў Італію...

Чаму ж галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Райнхольд Рог робіць стаўку толькі на маладзёжны склад? Вядома, моладзі ўласцівы асаблівы тэмперамент, эмацыянальны напал, непадробны энтузіязм, што найлепшым чынам падтрымлівае творчы тонус сталага, ды па-юнацку зграбнага і жыццярадаснага маэстра. Як ветэран духавой музыкі Германіі пан Р. Рог безумоўна дбае пра ўмацаванне і далейшае развіццё лепшых традыцый нацыянальнага духавога аркестравага выканальніцтва. Нягледзячы на тое, што склад аркестра ў пэўнай ступені вар'іруецца залежна ад вынікаў конкурснага адбору, мастацка-выканаўчы патэнцыял калектыву набірае новую моц, мкне да новых творчых здабыткаў.

Нас асабліва зацікавіла прачытанне чароўнага «Дывертысмента» Л. Бернстайна ў транскрыпцыі К. Грудман, дзе Маэстра разам з аркестрам быў на вышыні. У «Інтэрлюдыі» Ф. Цэзарыні ўдалося Р. Рогу малым, амаль ансамблевым складам дамагчыся дакладнага, літаральна сінхроннага грання. А ў Тоэцяй сюіце А. Рыда пасля фанфарна-святочнай I часткі, захапляючага, грацыёзнага і стракатага вальсу II часткі Р. Рог выявіў усю сваю дырыжорскую мужнасць і сканцэнтраванасць, падпарадкаваўшы аркестр абгрунтаваным патрабаванням па выкананні рытмічнага малюнка ў гарэзлівым маршы III часткі. Але ўсіх відавочна ўразілі «Фантастычныя варыяцыі» Д. Бернеса на тэму Н. Паганіні.

Досыць паспяховым быў і дэбют маладога дырыжора А. Хільнера. Ягонай сцэнічнай упэўненасці спрыяла не толькі веданне твораў і асэнсаванне іх, але і бездакорная выканальніцкая падрыхтоўка як кларнетыста. Менавіта таму ўзаемаразуменнем вызначалася дырыжорскае правядзенне «Канцэрціна для тубы з аркестрам» Р. Вільхельма. Саліст Г. Бакман прадэманстраваў свае дасягненні на тубе in F— на такім, на думку шэрагу слухачоў, «абмежаваным» у сэнсе творчай выразнасці, грубаватым інструменце. Цікава, што гэты бліскучы музыкант цяпер у сценах медінстытута Дзюсельдорфскага універсітэта набывае другую прафесію.

Канцэрты аркестра пакінулі найпрыемныя і яскравыя ўспаміны. Бясспрэчна, што майстэрства духавікоў з Германіі сілкуецца карпатлівай працай. Застаецца спадзявацца, што і на Беларусі ў хуткім часе з'явіцца аналагічны маладзёжны творчы калектыў. Бо ў нашай рэспубліцы даўно ўжо існуюць спецыялізаваныя духавыя ДМШ, я ўжо не кажу пра спецыялізацыю ў музычных вучылішчах ды ВНУ. А такі калектыў, поруч з Дзяржаўным аркестрам духавых інструментаў «Няміга», унёс бы свежы струмень у музычную культуру рэспублікі.

А. КАРАЦЕЕЎ,
дацэнт кафедры духавой музыкі, намеснік дэкана факультэта мастацкай творчасці МІКа, кандыдат мастацтвазнаўства.

Нямецкія музыканты «у гасцях» у цымбальнага аркестра.
Фота У. ВІТЧАНКІ.

Віктар ЛУЖКОЎСКІ

На паверцы

Дзень стаіць мой на паверцы.
Хоць і ціш ды гладзь,
А маё ў трывозе сэрца:
Пра каго спяваць!

Пра таго, хто сыты ў «Чайцы»
Горадам плыве,
Ці таго, хто зімнім зайцам
З грошыка жыве!

Ці пра воўка, што тры скуры
За тавар дзярэ,
Хто народ умела дурыць,
Любіць лапы грэць!

Царанят, васалаў зграя,
Ледзь каго крані,
Нашы душы люта крае,
Лупіць дзень пры дні.

Лёс стаіць мой на паверцы.
Як ні запявай,
А сваё радзіме сэрца
З песняю аддай.

Рабочыя ля Дома ўрада

Патушу, як свечку,
Я сваю бяду
І з урадам спрэчку
Сёння павяду.

Для каго мазолі
У працы набіваў,
Каб «талоннай» волі
Я пакаштаваў!

Што ж вы, дэпутаты,
Маўчыцё ў адказ!
Пелі: будзень — свята...
Свята ж не для нас.

Задыміць ці выпіць —
Бегай — не знайсці.
З душ пакору выбіць
Нам пара ў жыцці.

Праклінаць не буду
Свой парожні дзень.
Вас я перабуду!—
Рэжу напрасцень.

Не па цвіль скарынак
Выйшлі мы на брук.
Гэта — Працы рынак,
Моц разумных рук.

Плачу́ і пла́чу

Вочы жмурыш,
Каб не бачыць —
Так высока
Цэны скачуць.
Хоць працую,
Не лайдачу,
А плачу́
І пла́чу.

Цар-рубель
Ці быў харошым!
Стаўся ён
Гарэлым грошам.
Хоць працую,
Не лайдачу,
А плачу
І плачу.

ГУМ ды ЦУМ,
А побач рынак —
З горкай доляй
Паядынак:
Хоць працую,
Не лайдачу,
А плачу
І плачу.

Гэта ж трэба!
Адны боты —
За тры месяцы
Работы.
Хоць працую,
Не лайдачу,
А плачу
І плачу.

Махляроў
З Каўказа орды
І тузоў
Тутэйшых морды...
Хоць працую,
Не лайдачу,
А плачу
І плачу.

Цэны,
Паўлава падаткі
Нас паклалі
На лапаткі.
Хоць працую,
Не лайдачу,
А плачу
І плачу.

Хопіць дома
Нам жабрачыць!
Трэба ўсё
Як ёсць зыначыць.
Быць, не быць! —
Рашай задачу,
Каб набыць
Харчы без плачу.

Процістаянне

Засціла свет нам
Махлярская муць
З кагортай чыноў
Дубалобай.
Крылы
Памкнешся
Шырэй развінуць —
Падрэжуць.
Дарэмная спроба!
Абвешчана сёння:
З нас кожны —
Народ;
Цярпелі —
Цярпець больш не будзем.
Хіснуўся
Дзярждач
Рассакрэчаны плот,
На плошчах
Гуртуюцца людзі.
Махляр не адзін
У спалоху прыціх,
Сасніўшы
Ляфортава краты, —
Цяпер
Не ўратуюць
У банках чужых
Рабунку таемныя спраты.
Хіба ж
Чынадралам
Належаць навек
Пасады,
Машыны,
Палацы.
Жыве,
Як і жыў,
З мазаля чалавек,
Царуе
З царыцаю Працай.

З ПОШТЫ «ЛіМа»

МЕЦЭНАТ ГУЧЫЦЬ МІЛАСЭРНА

Маё дзяцінства прыпала на час хрушчоўскай адлігі, і я добра памятаю, як тады многія аднавяскоўцы з недаверам ставіліся да партыйнай дэмакратыі. Недавер людзей да камуністычнай ідэалогіі ў хуткім часе апраўдаўся.

Добра памятаю, як напрыканцы «эры» Мікіты Сяргеевіча палалі святыя храмы, пілаваліся праваслаўныя крыжы, руйнаваліся капліцы. Гэтак камуністычная улада святкавала перамогу над Богам. Жанчыны галасілі, сціплыя вясковыя мужчыны моўчкі адварочваліся, адмаўляючыся такім чынам ад беззаконня.

Але ж як цяжка ні было, царква вытрывала, і зноў ідуць да яе вернікі, моляцца, адбудоўваюць, вяртаюць святыні да жыцця, не шкадуючы ні часу, ні сродкаў.

Вось і нядаўна некалькі соцень вернікаў, якія прыйшлі на абедню ў Пакроўскі сабор, што ў Гародні, былі сведкамі неардынарнай падзеі. Святы храм наведалі прадстаўнікі сельскагаспадарчай фірмы «Амега» з Беласточчыны, якія ахвяравалі сто тысяч рублёў на аднаўленне царквы ў вёсцы Мураванка, што ў Шчучынскім раёне. Чаму менавіта на царкву ў Мураванцы? Валянцін Сельвясюк, беларус па паходжанні, кіраўнік дэлегацыі, расказаў, што па справах бізнесу яму давялося быць у Мураванцы і бачыць шчырыя намаганні веруючых людзей у справе адбудовы свайго прыходу. Спадар Сельвясюк дасканала вывучыў трагічную гісторыю храма і вырашыў дапамагчы грашовымі сродкамі ў яго аднаўленні. Гасцей за міласэрнасць падзякаваў мітрапаліт Гродзенскі і Ваўкавыскі Валянцін. З кароткай прамовай выступіў і прэзідэнт фірмы, таксама беларус, Міраслаў Целушэцкі. Ён зазначыў, што гэта толькі пачатак дапамогі, а ўвогуле фірма «Амега» жадае стала фінансаваць разнастайныя галіны культурнага адраджэння на Беларусі.

Г. АСТРОЎСКІ,
праваслаўны гарадзенец.

ВЫЙСЦІ З НАЦЫЯНАЛЬНАГА АНАБІЁЗУ

(Пачатак на стар. 5).

пад такім вытанчаным прэсам афіцыйнай прапаганды, цэнзуры і г. д., па-сапраўднаму ўставала пытанне не толькі аб духоўным здароўі, але нават і аб выжыванні, выратаванні беларускага народа ад дэградацыі і поўнай асіміляцыі. Іншымі словамі, пытанне практычна стаяла рубам — быць або не быць самабытнай беларускай культуры, мове і яе носьбітам. У псіхалагічным плане, на падставе аналізу ўмоў жыцця ў тыя далёкія часіны, а таксама розных прыкладаў беларускага фальклору можна сцвярджаць, што значная частка беларускага народа апынулася ў стане **нацыянальнага анабіёзу**, калі энергія, воля беларусаў былі паралізаваны, не маючы належных варункаў для свайго развіцця і практычнага ўвасаблення. У XIX ст. значна ўзмацніліся сярод беларусаў, гаворачы мовай сацыяльнай псіхалогіі, рысы канформнасці, нейкага раўнадушша, або «апатычнасці» (дарэчы, гэтая якасць беларусаў адзначалася амаль усімі дарэвалюцыйнымі даследчыкамі). Некаторыя з беларусаў у той час паддаліся канфармізму, волі і меркаванням рускага ці польскага чыноўніцтва, фактычна адмовіўшыся ад усяго аўтэнтычнага і тым здрадзіўшы сваёй Бацькаўшчыне. Частка беларускага народа, разумеючы неабходнасць развіцця сваёй культуры, усё ж такі нічога не рабіла дзеля гэтага, а прыстасоўвалася да неспрыяльных абставін і спакойна, без лішніх турбот і хваляванняў жыла сабе. У псіхалогіі падобны стан, калі чалавек усведамляе патрэбу ў пэўных дзеяннях, аднак, насуперак гэтаму, не хоча альбо не можа прыняць адпаведныя рашэнні, мае назву **«абулія»**. Дык вось, менавіта ў такім стане, на наш погляд, беларускі народ знаходзіўся не толькі ў XIX ст., але і ў савецкі час, прычым у найбольш відавочнай форме.

Сапраўды, многія людзі і ў мінулым, і ў нашым стагоддзі разумелі, што беларускі народ няўхільна дэградуе, амаль што выраджаецца, і патрэбны нейкія захады для яго ўратавання. Але практычна ўсе аддавалі перавагу маўчанню, пасіўнасці, бо так было лягчэй жыць і дамагчыся хаця б нязначных матэрыяльных даброт аў. І гэта таксама каранілца ў нашай псіхалогіі, — абы ўсё было спакойна і ціха, абы каго не пакрыўдзіць. Так, беларускі народ талерантны, рахманы, лагодны, ён, як раней адзначалі, гатоў пайсці на кампрамісы, абы была заўсёды «згода». Безумоўна, гэта добрая рыса характару, аднак, на жаль, у некаторых абставінах яна можа прыводзіць і да негатыўных вынікаў (для саміх жа беларусаў), што між іншым нядрэнна разумелі і выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах паланізатары і русіфікатары «Паўночна-Заходняга краю». У тыя перыяды гісторыі, калі праяўляецца адкрыты здзек, глумленне над народам, яго мовай, звычаямі, празмерная талерантнасць (цярпімасць) народа часцей за ўсё не ідзе яму на карысць.

Прыклады такой асаблівасці беларусаў можна знайсці і ў народным фальклоры (у казках, песнях, прыказках, анекдотах і г. д.). Так, цікава адзначыць тое, што ў розных песнях, анекдотах беларусаў у той час, калі на Беларусі ўзмацнялася прыгонніцтва, часта сустракаюцца словы «паночак», «панок», «бацюшка», «паненка» і да т. п. Адбываецца ў падобных выпадках фарміраванне так званай **«амбівалентнасці пачуццяў»**, калі да адной нейкай асобы адносіны з'яўляюцца дваістымі, г. зн., напрыклад, адначасова станоўчымі і негатыўнымі. Прычым заўважым, што для беларусаў, пры іх пэўнай лагоднасці, пераважала ўсё ж пазітыўнае стаўленне нават да такіх асоб, да якіх прадстаўнікі іншых народаў аднесліся б рэзка адмоўна. Такі характар адносін можна заўважыць у дачыненні да некаторых чыноўнікаў-бюракратаў, памешчыкаў, суддзяў ды інш. І ў тых выпадках, калі віна за нейкія дзеянні адназначна ляжала на канкрэтным чалавеку, беларус нярэдка неяк «прыгладжваў» яго памылкі, недахопы, думаючы больш аб тым, ці не зрабіў сам якоганебудзь недарэчнага ўчынку. Беларус, у большасці, хутчэй зверне ўвагу на свае, чым на чужыя недахопы. Гэта значыць, што яму ўласцівы, у адпаведнасці з псіхалагічнай тэрміналогіяй, унутраны (інтэрнальны) **«локус кантролю»**. Прадстаўнікі ж іншых нацый нярэдка больш схільны да экстэрнальнага (знешняга) **«локус кантролю»**. Іншымі словамі, адказнасць за вынікі якой-небудзь дзейнасці людзі першай групы часцей бачаць у сваіх асабістых паводзінах, у той час як другія прыпісваюць такую адказнасць нейкім знешнім сілам (прыродным умовам, пэўным групам, катэгорыям насельніцтва). Напрыклад, у кнізе «Трагедия белорусского народа» (1908 г.) даная тэндэнцыя знаходзіць паказальнае адлюстраванне. Аўтар кнігі, прыхільнік палітыкі расійскага ўрада, піша, што хіба не з'яўляецца сапраўднай трагедыяй беларуса, што ён пад уплывам польскіх чыноўнікаў, ксяндзоў, памешчыкаў у многіх месцах пераходзіць у каталіцтва, пачынае гаварыць па-польску і называць сябе палякам. Зразумела, што ўсё гэта не садзейнічала адраджэнню беларусаў, аднак якое рэзюмэ робіць аўтар? Вось яно: «Ці не пара Расіі, пакуль не позна, падумаць аб тым, як звярнуць беларускі народ да яго праваслаўна-рускай, як раней, самасвядомасці...?» Праўда ж, характэрны падыход: маўляў, вінаватыя ва ўсім палякі, і толькі мы, рускія, для вас, беларусаў, з'яўляемся шчырымі дабрадзеямі, мы прынясём вам шчасце і радасць. Канешне, адвесці ад сябе адказнасць за дэнацыяналізацыю цэлага народа куды лягчэй і прыемней, чым узяць хоць бы маленькую долю такой віны.

Невыпадкова, што значная частка беларусаў у XIX ст. верыла многім прапагандысцкім хлуслівым установкам, падпадала псіхалагічна пад іх уздзеянне, як пры гіпнозе. У выніку мела месца т. зв. **акцэнтуацыя** (узмацненне) асобных рысаў характару беларусаў пры адначасовым аслабленні іншых (часта сацыяльна-важных і неабходных) духоўных якасцей. Сярод мноства тыпаў падобнай **акцэнтуацыі** характар беларусаў хутчэй за ўсё можна было б аднесці да **астэнічнага** і **дыстымнага** тыпу, якія вызначаюцца такімі рысамі, як пэўная нерашучасць, недастатковая актыўнасць, схільнасць да дэпрэсіі, пачуццё непаўнацэннасці, апатычнасці. Ды і якім іншым практычна мог быць тып характару беларускага народа пры такіх неспрыяльных умовах яго гістарычнага развіцця, пры падобным націску на псіхіку беларусаў з розных бакоў і па розных каналах?! Больш таго, беларускі народ мог бы поўнасцю асіміліравацца ці дэградаваць, калі б не яго славутая доўгацярплівасць, працаздольнасць, таленавітасць. Нездарма ж міжнародная статыстыка сведчыць, што беларусы — адзін з найбольш здольных і працавітых народаў у свеце. Калі б не гэтыя цудоўныя якасці беларускага нацыянальнага характару, існаванне беларускага народа, як самастойнага этнасу, магло б увогуле спыніцца яшчэ ў XIX ст., асабліва пасля 30-х гг., падчас максімальнага «росквіту» працэсаў дэнацыяналізацыі беларусаў.

Безумоўна, у значнай меры духоўна-маральны патэнцыял беларускага народа быў падарваны, нацыянальная псіхалогія падверглася штучным, насільным зменам і скажэнням. Аднак, хаця воля да жыцця ў беларусаў аслабла, яе ўсё ж ніхто не змог пазбавіць поўнасцю. У тыя часы Беларусь «нацыянальна не памірала, але і не жыла». Гэтыя словы належаць А. Цвікевічу, які далей піша, што Беларусь ахапіў гістарычны нацыянальны **анабіёз**, калі ўсе сілы, уся энергія народа «спыніліся, не выяўляючыся ў актыўнай творчасці, як бы чакаючы свайго ўскросу».

Канешне, пры аналізе псіхалагічных праблем развіцця беларусаў нельга зараз асвятліць усе іх бакі і адказаць на ўсе пытанні. Тэма, мушу паўтарыцца, патрабуе грунтоўных даследаванняў. Я ж не меў намераў абвінавачваць каго-небудзь у нашым сённяшнім становішчы, ускладаць за гэта віну на ўсіх прадстаўнікоў якой-небудзь адной нацыі. За тое, што было ў гісторыі Беларусі, аб'ектыўна павінны несці пэўную адказнасць у першую чаргу тыя, хто найбольш заўзята праводзіў палітычныя ўстаноўкі на практыцы, незалежна ад іх нацыянальнай і канфесійнай прыналежнасці. Але ўсё гэта адышло ў нябыт, і цяпер усім прыхільнікам беларушчыны даецца яшчэ адзін (мо апошні?) шанц на справе даказаць, што не ўсё яшчэ страчана, што ў нас яшчэ хопіць сілы волі і моцы здзейсніць светлыя **ідэалы нашага новага Адраджэння.**

Эдуард ДУБЯНЕЦКІ,
псіхагісторык, сябра Нацыянальнай асацыяцыі «Беларусаведа».

ПРЭМ'ЕРЫ

Ах, «Марыца»...

У ролях Марыцы і Тасілы — Л. СТАНЕВІЧ ды А. ІСАЕЎ.

Фота Ул. КРУКА.

Любіць публіка класічную аперэту. У гэтым няцяжка пераканацца, завітаўшы на новую пастаноўку неўміручай кальманаўскай «Марыцы» (дырыжор А. Лапуноў, рэжысёр-пастаноўшчык А. Барсегян, сцэнаграфія А. Шчолакава, касцюмы — Л. Ганчаровай). Першыя паказы гэтай прэм'еры прайшлі з поспехам. З поспехам у гледача, не спешчанага «рафінаванымі» спектаклямі, гатовага дараваць і хібы ў аркестры, і вакальныя агрэхі салістаў, і рэжысёрскія алагізмы... Зрэшты, пра вартасці й выдаткі гэтай прэм'еры мы яшчэ пагаворым. А пакуль — спяшайцеся ў тэатр паслухаць цудоўную музыку «Марыцы», паглядзець на маладых выканаўцаў у ролях галоўных герояў, ацаніць новыя работы сталых майстроў Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі Беларусі.

С. Б.

МУЗЫКА

Калыханка па-англійску

«Спіць над лесам аблачынка...» Як гэта будзе па-англійску? Зрэшты, няважна. Бо не тэкстам, а музыкай папулярнай калыханкі З. Яўтуховіча зацікавіўся канадскі лінгвіст, паэт Джэймс Бел. Ён зрабіў пераклад, і любімая беларускімі дзеткамі вечаровая песня ў новым варыянце папоўніла рэпертуар саліста ансамбля «Песняры» Валерыя Дайнекі. Магчыма, праз нейкі час мы пачуем «Добрай ночы!» у запісе на англійскай мове?

Н. К.

Міністр падпісаў загад...

Тыдзень таму міністр культуры Беларусі Яўген Вайтовіч падпісаў загад аб стварэнні новага творчага калектыву — Беларускай капэлы. Гэта рэальны плён працэсу адраджэння традыцый музычнага жыцця і музычнай культуры на Беларусі, распачатага працай нашых вядомых дзеячаў мастацтва. Іх намаганнямі пры падтрымцы Саюза музычных дзеячаў рэспублікі адбыўся Першы фестываль «Адраджэнне беларускай капэлы», што сталася падзеяй сапраўды гістарычнай. Зрэшты, стварэнне менш чым праз год пасля фестывалю паўнацэннай, на дзяржаўным узроўні, структуры пад назваю «Беларуская капэла» — таксама гістарычная падзея. Капэла будзе дзейнічаць пры тэатры оперы і балета, у яе творчы склад уключаны вядомы ансамбль салістаў «Класік-Авангард». Як паведамляў «ЛіМ», пачалася падрыхтоўка Другога фестывалю, і спадзявацца на яго поспех дазваляе тая акалічнасць, што маладую Беларускую капэлу ўзначалілі цікавыя творчыя асобы: Яўген Паплаўскі (дырэктар) ды Віктар Скорабагатаў (мастацкі кіраўнік).

Н. К.

«Тызенгауз-капэла»

26 мая — цяпер гэты дзень будзе лічыцца «чырвонаю датай» беларускага музычнага календара. Менавіта ў гэты дзень, крыху больш як тыдзень таму, адбыўся першы канцэрт Гродзенскай гарадской капэлы. Новы творчы калектыў складаецца з камернага аркестра (мастацкі кіраўнік і дырыжор Уладзімір Бсрматаў) ды камернага хору (мастацкі кіраўнік і дырыжор Ларыса Іконнікава). У рэпертуары творы М. Радзівіла, І. Голанда, М. Равенскага, П. Альхімовіча, заходнееўрапейская музыка, духоўныя хоры С. Рахманінава, апрацоўкі беларускіх народных песень... Значнае месца ў ім займае творчасць гродзенскага кампазітара Андрэя Бандарэнкі, які з'яўляецца мастацкім кіраўніком і дырэктарам капэлы і, вядома, адным з актыўных яе стваральнікаў.

Адраджэнне капэлы — слаўная справа і гарадскіх улад, падтрыманая таксама Міністэрствам культуры, Саюзам музычных дзеячаў, Саюзам кампазітараў Беларусі. Справа, вартая багатай гісторыі культуры Гродна, музычных традыцый гэтага краю. Адно толькі імя — Антоній Тызенгауз — выклікае асацыяцыі нядаўняй падзеі з тым, што рабілася намаганнямі вядомага гродзенскага старасты ў другой палове XVIII ст. Пры ім тут быў створаны тэатр, капэла, музычная школа, дзе рыхтаваліся, прытым з люду мясцовага, артысты, музыканты...

Гродзенская гарадская капэла ўтварылася на месцы сваіх гістарычных каранёў. І хаця імя ёй пакуль не дадзена, само сабою зляцела з пяра вось гэта: «Тызенгауз-капэла». Відаць, па аналогіі з «Вівальдзі-арнестрам»... Ну, а больш падрабязна пра новую творчую супольнасць гарадзенскіх музыкантаў чытайце ў наступных нумарах «ЛіМа».

С. Б.

ДРУК

Не толькі навукоўцам...

Як і ў іншыя гады, багаты і разнастайны тэматычны план выдавецтва «Навука і тэхніка» на 1993 год. Праўда, і тут заўважаецца агульная наша бяда — колькасць пазіцый скараціцца. Але усё ж выйдзе нямала кніг, якія праўдзіва адлюстроўваюць учарашні дзень Беларусі і яе складанае сённяшняе.

Вось зборнік «Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння». У ім будуць апублікаваны звесткі пра выяўленыя нядаўна і малавядомыя творы жывапісу, іканапісу, графікі, драўлянай скульптуры, разьбы і іншыя. У кнізе — шмат ілюстрацый.

У серыі «Згукі мінуўшчыны» выходзіць вядомая праца І. Абдзіраловіча «Адвечным шляхам» і кніга С. Брагі «Доктар Скарына ў Маскве». Такі псеўданім абраў В. Тумаш, да нядаўняга часу дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку, расказвае ён аб магчымым наведванні першадрукаром сталіцы Расіі.

Папаўненне і ў серыі «Нашы славутыя землякі». Лёс таленавітага вучонага-фізіка Івана Яркоўскага раскрывае В. Гапоненка («Сягнула думка ў глыбіню Сусвету»). А. Пілішчук («Ланцэтнік — «цудоўная рыбка») у займальнай форме апавядае пра выдатнага вучонага ў галіне заалогіі, фізіялогіі бесхрыбетных Аляксандра Кавалеўскага. Фізік Аляксандр Садоўскі (сусветна вядомы «эфект Садоўскага») — герой кнігі Т. Процькі «Даследчык таямніцаў святла». І. Саверчанка («Апостал яднання і веры») знаёміць з уніяцкім мітрапалітам, заснавальнікам Базыліянскага ордэна, пісьменнікам, педагогам і прапаведнікам Язэпам Вельямінам Руцкім.

Па сваёй тэматыцы блізкая да гэтай серыі і новая — «Вернутыя імёны». А. Валахановіч апавядае пра начдыва І. Траццяка («Партызанскі генерал з Амерыкі»), Н. Васілеўская прыадкрывае таямніцы лёсу наркома асветы Беларусі А. Баліцкага («Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме»).

Як звычайна, багаты раздзел «Літаратуразнаўства і крытыка»: даследаванні П. Васючэнкі «Пошукі страчанага дзяцінства. Беларускія празаікі «сярэдняга пакалення» аб Вялікай Айчыннай вайне», П. Дзюбайлы, С. Лаўшука, М. Арочкі «На рубяжы 90-х», І. Навуменкі «В. Дунін-Марцінкевіч», І. Штэйнера «Варожаць балады вякоў. Беларуская балада міжваеннага перыяду і славянскія традыцыі», Я. Янушкевіча «Роўныя ў няволі. Беларуска-польскія літаратурныя сувязі ў 2-й палавіне XIX ст».

Выйдзе штогоднік «Беларусістыка», другая кніга «Нарысаў па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязяў».

Выдавецтва распачынае выданне спадчыны славутых даследчыкаў фальклору. Выйдзе том «Беларуская народная творчасць. Фальклор у запісах братоў Тышкевічаў і Яна Чачота». Запланаваны кнігі «Жніўныя песні» А. Ліса, «Беларуская сацыяльна-бытавая казка» А. Фядосіка, «Паэзія кахання» А. Гурскага, «Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. Канец XIX—XX ст.» Т. Кухаронак.

ЛІТКУР'ЕР

Выдадзена ТБМ

«Незалежнасьць» — кніга паэзіі Ніла Гілевіча, што выпусціла Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Зборнік склалі пераважна вершы, напісаныя народным паэтам Беларусі ў апошнія два гады, а таксама паасобныя ранейшыя. Гэта ўсё творы яркага выражанага грамадзянскага гучання, лірычны герой якіх — наш сучаснік, які нарэшце на поўны голас можа заявіць, што ён беларус і патрабуе гэткага ж нацыянальнага абуджэння ад іншых.

Упершыню кніга прыйшла да сваіх чытачоў у час рэспубліканскай канферэнцыі ТБМ «Беларуская мова і нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь». Цяпер зборнік можна набыць у кіёску ТБМ, што знаходзіцца па праспекце Ф. Скарыны, 18 у Мінску, у «Кнігарні пісьменніка» ці ў самім тазарыстве (Румянцава, 13).

«Незалежнасьць» — выданне безганарарнае, увесь прыбытак ад яго пойдзе на рахунак ТБМ.

З жыццёвых выпрабаванняў

Летась Сяргей Новік-Пяюн адзначыў сваё 85-годдзе. Гады і перажытае бяруць сваё, аднак не расстраіў Сяргей Міхайлавіч бадзёрасці і аптымізму, веры ў людзей. Як і ў гады маладосці, закаханы ў песню, паэзію.

У гэтым пераканаў і творчы вечар С. Новіка-Пеюна ў Доме літаратара. Пачаўся ж ён з песні ў выкананні самога аўтара: «Калі б я мог быць вольнай птушкай...» Дружнымі апладысментамі сустрэлі прысутныя паэта нялёгкага жыццёвага і творчага лёсу.

Пуцявіны жыцця Сяргея Міхайлавіча паўставалі ў выступленнях Я. Пархуты, С. Законнікава, В. Жуковіча, В. Шніпа, У. Дамашэвіча, В. Супруна, У. Пецюкевіча, мастака У. Хадаровіча, кампазітара В. Сярых і інш.

У вялікай канцэртнай праграме выступілі вучні СШ № 148 г. Мінска, удзельнікі народнага тэатра чытальнікаў «Жывое слова» Мінскага педінстытута, студэнцкі хор і хор настаўнікаў.

Вяла вечар Г. Дзягілева.

П. ГАРДЗІЕНКА.

Віталі землякі

У Чамяроўскім сельскім клубе Слонімскага раёна прайшоў вечар, прысвечаны 80-годдзю паэта-земляка Анатоля Іверса. Адкрыў яго даўні сябар юбіляра А. Сучок. Свайго земляка віншавалі госці з Мінска І. Чыгрын і С. Місно. З Гродна сказаць яму добрыя словы прыехалі Ю. Голуб і Д. Бічэль-Загнетава. Сабрата па пяру віталі члены слонімскага літаратурнага аб'яднання І. Сяргейчык і Р. Пастухоў. Выступілі на вечары загадчык аддзела культуры А. Цярэнін, рэдактар «Слонімскага весніка» С. Прасняк, былы дырэктар беларускай сярэдняй школы № 1 г. Слоніма П. Закрэўскі, дырэктар краязнаўчага музея І. Шпыркова, рабочы турэцкай фірмы «Энка» А. Казма і іншыя.

У заключэнне выступіў юбіляр.

С. ЧЫГРЫН.

Юбілей — гэта падсумаванне

Шмат добрых, цёплых слоў было сказана ў Доме літаратара на вечары, прысвечаным 80-годдзю Леаніда Прокшы. Пра юбіляра гаварылі пісьменнікі Я. Каршукоў (ён вёў вечарыну), А. Васілевіч, Н. Галіноўская, А. Камароўскі, І. Скарынкін, журналісты Д. Чаркасава, В. Мацкевіч, А. Карпілаў. У выкананні артыстаў прагучалі ўрыўкі з твораў Л. Прокшы. З цікавасцю слухалі прысутныя віноўніка ўрачыстасці.

П. ГАРДЗІЕНКА.

Памяці песняра

Памятны знак устаноўлены ля дома па вуліцы Рабкораўскай у Мінску, дзе правёў апошнія дні на беларускай зямлі і стварыў сваю неўміручую «Пагоню» Максім Багдановіч.

Скульптар Уладзімір Слабодчыкаў і архітэктар Уладзімір Зелянкевіч стварылі знак у выглядзе прыдарожнай каплічкі. І гэта сімвалічна: як спадарожнікі схіляюцца перад ёй, так і мы, землякі паэта, схіляем галовы перад памяццю песняра.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ. (БЕЛТА).

Успомнілі Л. Геніюш

Літаратурны вечар, што адбыўся ў Мінскім інстытуце культуры, быў прысвечаны творчай спадчыне Ларысы Геніюш. У выступленнях М. Грынчыка, вучонага-археолага М. Чарняўскага і іншых гаварылася пра ролю Л. Геніюш у выхаванні патрыятызму, любові да Радзімы сярод студэнцкай і творчай моладзі ў Беларусі і за яе межамі.

Творы Л. Геніюш чыталі выкладчыкі інстытута У. Раманоўскі, Р. Саматыя. З асаблівым уздымам і ўсхваляванасцю дэкламаваў дзіцячыя вершы паэтэсы пяцігадовы Іллюк Доўнар.

У чытальнай зале бібліятэкі арганізавана выстава кніг і матэрыялаў аб жыцці і творчасці выдатнай паэтэсы.

Л. МАРХЕЛЬ.

КОНКУРСЫ

Поспех нашых юніёраў

У германскім горадзе Клінгенталі штогод адбываецца Міжнародны конкурс баяністаў і акардэаністаў. Гэта сусветна вядомае і найбольш прэстыжнае спаборніцтва для музыкантаў такой спецыяльнасці. Беларускія пасланцы, яго актыўныя ўдзельнікі, атрымліваюць, як правіла, тытулы лаўрэатаў і дыпламантаў. Сёлета парадавалі нашы юніёры. Чацвёра вучняў музычных устаноў Беларусі (узрост — да 15 гадоў) удзельнічалі ў конкурсе ў Клінгенталі. І вось — вынікі. Другое месца і званне лаўрэата атрымалі Аляксандр Пылік з Брэсцкай ДМШ (выкл. А. Шыманоўскі) ды Павел Неўмяржыцкі з Музычнага ліцэя пры БДК (выкл. І. Атраднаў), чацвёртае месца і званне дыпламанта — у Дзімы Атраднава, таксама вучня Музычнага ліцэя (выкл. В. Чабан). Падводзячы вынікі, міжнароднае журы адзначыла высокі прафесійны ўзровень беларускай баяннай школы.

В. А.

АНОНС

«Звіняць цымбалы і гармонік»

Свята пад такой назвай зрабілася традыцыйным на беларускай зямлі. Сёлета яно 5-е, папярэднія двойчы адбываліся ў Віцебску й Магілёве. Сёлетнюю ініцыятыву Міністэрства культуры ды Беларускага інстытута праблем культуры па правядзенні свята падтрымаў Віцебскі аблвыканком і прапанаваў зрабіць гэта ва ўтульных старажытных Паставах. Чаму? Там існуюць багатыя выканаўчыя традыцыі, прынамсі, добрай славай карыстаўся народны цымбальны аркестр «Груздаўскія дзяды», чыю справу падтрымалі маладыя выкладчыкі Пастаўскай музычнай школы, стварыўшы ансамбль «Паазер'е». Дарэчы, яны дасюль карыстаюцца унікальнымі дыятанічнымі цымбаламі, выробленымі старымі майстрамі Пастаўшчыны.

Такім чынам, з 5 па 7 чэрвеня на Пастаўшчыне — «Звіняць цымбалы і гармонік». Лепшыя музыкі з розных куткоў Беларусі выступяць на вясковых сцэнах раёна. Сярод гасцей — воранаўскія «Лявоны», «Гуцкі гармонік» з Ліды, «Сакавінка» з Маладзечна, «Радзімічы» з Гомеля і інш. Журы, узначаліць якое народны артыст рэспублікі М. Казінец, адзначыць лепшых, звярнуўшы ўвагу і на мастацкі ўзровень, і на адметнасць музычных твораў, і на выканаўчае майстэрства, і на сцэнічную культуру носьбітаў традыцыйнага інструментальнага фальклору Беларусаў. Заключным урачыстым канцэртам завершыцца гэтае свята, якога так чакаюць жыхары Пастаўшчыны.

Т. КАРОЛЬ.

АЗВЯРЭННЕ

(Пачатак на стар. 1).

Па суседстве з вёскай Пціч вёскі Узляны і Грабень, Дудзічы. Дык вось, па словах ужо мясцовай інтэлігенцыі, а па сумяшчальніцтве і адміністрацыі, менавіта сюды ў старадаўнасці пасля бітвы на Нямізе павярнуў сваю дружыну князь Ігар, на Дудзічы — Дудуток у «Слове аб палку Ігаравым». Усё можа быць. Вяскоўцам ад таго ні холадна, ні горача. Старэчым напаўсляпым вокам пазірае праз ваду, цераз рэчку на цёмныя кладачкі па-над ёй — масток паміж мінулым і будучым, цывілізацыяй і занядбаннем, па гэтых кладачках яны кожны дзень ходзяць на другі бераг у магазін, глядзяць на ацалелыя пянькі—пáлі ад былога сапраўднага маста вёсачка Пціч на вёску Дудзічы — Дудуток. Упіраецца зацягнутым пахмуркам птушыным вочкам у яшчэ больш высокі бераг, чымсьці той, на якім яна месціцца, у дудутоцкі, па ўсім рукатворны курган.

Гэты курган, пэўна, і засціць ёй вочы, слепіць яе. Вецер, што бярэ сілу на процілеглым беразе, смеціць вока, выбівае слязу. Гады са два-тры назад курган раскапалі. І нейкі новы магнат урэзаў у яго асабняк. А пцічане яшчэ не забылі, як стаялі там, на вяршыні кургана, белакаменны палац і блакітна - макавая цэркаўка. І па сцежачках з белай рачной галькі, аголенага некалі магутнымі водамі ракі адборнага, нібы залатаноснага пцічанскага пяску шпацыравалі, адстаяўшы службу ў царкве, сам пан з пані пад ручку, са стромага берага беглі, ляцелі матылькамі панічы і паненкі — да Бармалея-млына пасярод Пцічы, да лодак, што чакалі іх на канале. А пцічанцы чакалі іх у тых лодках і развозілі ў прыбярэжныя навісі белай чаромхі, спляценне вясенняга хмелю, бузіны, баяркі, рабіны.

Паненкі і панічы хмялелі, бузілі - баярыліся. А пцічанам была адведзена роля служак пры іх. Яны былі чэляддзю. Усе пцічане — чэлядзь. Адселеныя панам на правы бераг, яны павінны былі ўслугоўваць яму. Такая завядзёнка была спакон веку. Якім быў сам той пан, з самадураў-прыгоннікаў, ці дэмакратаў - лібералаў — сёння ўжо ў мінуўшчыне. І сам пан, і яго палац, цэркаўка, млын, мост праз рэчку, катанне на лодках па канале. Праваліласяў апраметную, тартарары. Але тое-сёе і ацалела. Па ўсёй акрузе, шляху - пуцявіне палкоў Ігаравых, не знайсці ніводнага пралетарскага, лапуховага дрэва-таполі. Толькі клёны, клёны, рабіны ды бярозы з нарамхай, ды ліпы — дрэвы, што бліжэй да вечнасці, Бога, чалавека і пчалы. І норавам пцічане адметныя, на асобіцу ад усіх, хто па суседстве, хто ў «Шляху» і «Барацьбе», «Перамозе». Не так, каб зусім ужо скнарныя і скупыя, але, скажам, беражлівыя, не зусім ужо скрытныя і маўклівыя, а патайныя і негаваркія. Цяжкія вокам, але чыстыя на руку. Апошняе асабліва значна, маючы на ўвазе тое, пра што пойдзе гаворка далей. Веку ўсе сталага, а між іншым—не. Сярэдняга, сярэднекрамлёўскага, знамянальна - эпахальнага. Гэткія крамлёўскія даўгавечнікі наадварот. І сама іх вёска ў пятнаццаць хатак, у адселенасці і выгараджанасці ад усяго свету, як Крэмль, толькі зноў жа з адваротным знакам.

Пад гэтым адваротным знакам сацыялістычнай планіды і ўсеагульнай роўнасці жылі-былі на Пцічы Ганна Паўлаўна і Канстанцін Васільевіч. Жыццяпіс іх—не з таго, што друкавалася і друкуецца на адкрыцці першай старонкі ўсіх газет, якія штодзень выходзяць на адной шостай сусвету. Так, нарадзіліся ў семнаццатым пад саўковаю зоркай, а таму і самі шуфлікі-саўкі. Мярзотнае слова, хай будзе праклятым той, хто яго прыдумаў. А людзі добрыя, не вінаватыя, што выпала ім доля нарадзіцца вось пад такой зоркай. Звычайныя, гаротныя і гарапашныя пакутнікі на гэтай зямной юдолі: так, так, не, не, не—вось і ўсё, што яны могуць мовіць пра сябе, развітваючыся з вамі і жыццём. І ўсё ж, пэўна, насуперак апошняму перадсмяротнаму «не» яны завершаць словам «так». Як клічнік, як кол загоняць гэта «так» у зямлю і неба. Так, былі, так, сярод людзей жылі і людзьмі звяліся. Так! Але за што вы, людзі, з намі вось так, за якую правіннасць, за які грэх? Ці ёсць на смертнай зямлі такі грэх, каб са звычайнымі людзьмі вось так абыходзіцца...

За доўгае паўвекавое сумеснае жыццё гэтай пары паміж іх «так» і «не» нічога немагчыма паставіць з таго, што здольна нас сёння ўзрушыць, абурыць ці вельмі ўжо ўзрадаваць. Ганна Паўлаўна ўдалася жанчынай дужай і здаровай, здольнай прымаць мужа і нараджаць і гадаваць дзяцей, песціць і абрабляць зямлю і прымушаць яе радзіць. Таму была ўсё жыццё пры мужу, дзецях, калгасе і зямлі. Мо крыху перабірала з мацюканнем, як усякая наша жанчына-маці, моцная і дужая, запрэжаная з дзяцінства ў работу, нястачу, якую штодзень гоняць і панукаюць уласная жаночая бездапаможнасць, абыякавасць неба і зорак, патуранне ўладаносцаў. Гэта якраз і прызвычаіла яе да лаянкі і мата, а нарадзілася яна чыстай, з адчуваннем святла, болю і крыку на вуснах. Гэты крык і боль яна пранесла па свеце, ні на кога не наракаючы, ніколі нічога, акрамя сваёй уласнай долі, не кленучы. Грэх, як бачыце, на ёй невялікі. А каму падаецца вялікім, што ж, можаце кінуць у яе каменем. Яна прыме той камень, як прымала гэта жыццё, і мноства іншых каменняў, што паслалі ёй жыццё, Бог і людзі. Толькі той хто пабівае яе, хай паспее затуліцца сам.

Канстанцін Васільевіч. На яго долю гэтых каменняў прыпала, пэўна, куды больш. Кансерватары і дэмакраты, застойшчыкі і перабудоўшчыкі, сталіністы і анты былых часоў і эпох, эпох і часоў будучых, можаце ганарыцца. Хутчэй даставайце свае каменні з-за пазухі, таму што гэта ён, Косцік, Канстанцін Васільевіч, стаіць папярок гэтага вашага светлага шляху да свята жыцця — усенароднага шчасця. Кідайце, шпурляйце смела вашы камяні, баяцеся прамахнуцца — падыдзіце бліжэй. Ён не ўцячэ і не здолее адхіліцца. Вельмі ўжо спора бег ён, вядомы вамі па шляху да ўсеагульнага шчасця. Семдзесят з хвосцікам гадоў бег. Цягнуў за сабою Ганну Паўлаўну і дзяцей, выцягваў з іх жылы, сам недасыпаў, недаядаў, недапіваў і ім не даваў. Бег, бег, ды вось бяда, прыстаў, збіўся з ног, здарожыўся. Адмовілі старому каню ногі. Ён зараз на мыліцах. Так што біце яго цяпер смела, старога калгаснага мерына, варашылаўскага стралка, ударніка палёў усіх калгасных пяцігодак і адной сямігодкі, удзельніка таварыства выратавання на водах, удзельніка дзвюх войнаў і адной перабудовачнай рэвалюцыі. Вось за ўсё гэта і пляжце, біце старога казла, за тое, што нарадзіўся і жыў у такі эпахальны для ўсёй планеты, усяго чалавецтва час, за тое, што іменна ён і тварыў гэту эпоху і час, гісторыю. А яшчэ і жанчын і дзевак не абыходзіў бокам, крыху перайначыў паэта: любіў коней і жанчын. Тры вайны — ганебную і славутую, і доўгую, бясконцую, у якой мы нас, аказваецца, перамаглі — прайшоў на кані, цалуючы яго ў храпу, каб нідзе не схібіў, не падвёў, ні пад Масквой, ні пад Сталінградам, ні на калгасных палетках. На буланчыку заехаў у Берлін. На буланчыку вярнуўся ў «Барацьбу за камунізм». З вайны ў вайну. Добры дзесятак коней ад яго пайшло на салатопку і жывадзёрню. І за кожнага ён узяў па чарцы і пусціў па слязе.

Так, любіў чарку. Ніводную міма рота не праносіў, за каўнер не выліваў. А прыняўшы добрую чарку, браце ты мой, як ён кляў любімую ўладу, усіх правадыроў, усіх, хто з Богам адышоў, і ўладарыць яшчэ сёння, праклінаў нема, як воўк у піліпаўку вые. Каб пачулі яго, адзін, пэўна, збег бы з Маўзалея, вылечыўся б ад картавасці, навучыўся б чалавечай мове, другі забыўся б гэтай чужой яму мовы назаўсёды, па сваёй ахвоце да пары, да часу прыйшоў бы і лёг у той Маўзалей.

Не, зусім не дарэмна яго пазбавілі гэтага чортавага зялёнага зелля, пачулі. Дайшло да іх вушэй, перапужаліся. І ў апошнія свае дні Канстанцін Васільевіч выдаваў па мацеры ўжо на сухую, без падмазкі, але не тоячыся, услых. Вам выдаваў, каторыя сталі звацца сёння прэзідэнтамі, парламентамі, дэмакратамі - лапачкамі: ад Гарбачова-Ельцына да Зянона Пазняка і Станіслава Шушкевіча. Прыпрагаючы ў гэту кампанію і Вячаслава Кебіча. Усіх у адзін хамут, у адны аглоблі—і па храпе, па храпе. За тое, што пазбавілі самага апошняга ў жыцці, намёку нават на свята, святых франтавых ста грамаў, на якія не жмоціўся і сам вусаты. Укралі апошняе, чым ён мог хмельна ганарыцца, — Дзень Перамогі. Укралі ў яго і яго коней.

Такім чынам, якая б ні правіла ўлада — былая, што сканала ў Бозе, і тая, што, як птушка Фенікс, паўстала з праху і попелу, і нават будучая, невядомая яшчэ сёння — мае ўсе падставы: па храпе яго, па храпе. І твар яго сапраўды як конская, калгаснага мерына храпа, не прамахнешся. Такім ужо ўдаўся, у бацьку ці маці пайшоў. А мо той жа пан ці хто з яго роду паспрыяў, з другога берага падкраўся да бабулі ці маці. Пародзісты твар, з такім лобам і думаць шырока і зямлю араць прывольна, не з кулачок, зморшчаны, як у іншых, а прасцяг і воля. За плугам, за касою, ці пры сякеры — добра пот збіраць і страсаць, і думку запасіць добра. І твар гэты ягоны скрозь гады, войны, ударніцтва, узліванне да самага апошняга часу застаецца захаваным. Не сапсаванымі аказаліся да самага адыходу і вочы, ясныя і празрыстыя, як часоў князя Ігара яшчэ, пэўна, крынічка, што б'е непадалёк ад яго хаты пры высокім беразе Пцічы і струменіць у Пціч, не дае згінуць старажытнай рэчцы, памятае і захоўвае і след коней дружыны Ігаравай.

Плоць цела Канстанціна Васільевіча ўсохла, спрацавалася ў калгаснай збруі. Ногі адняліся і ўкараціліся, абвіслі, не трымаюць цела, адмаўляюцца яму служыць. А рукі дужыя, кулакі — кожны з пуд і як бы, здаецца, відушчыя на сконе веку, так праглядваюць з іх сінеўздутыя жылы. Але здатныя гэтыя рукі трымаць толькі мыліцы ды шырынку расшпіліць, каб хлопца дастаць, колішняга хлопца. Грэшны, і ляцяць, ляцяць у яго камяні.

Жыць яму заставалася роўна гадзіна. І стаяў на тую гадзіну Канстанцін Васільевіч на сваіх кастыльках, як з'езджаны конь аб чатырох нагах, на пачатку вясны дзевяноста другога года сярод свайго занядбанага падворка, каля хаткі на курыных ножках, і ўсё вакол хаткі было падобна яму. Аднаго з ім веку, аднаго ладу хаткі былога панскага чалядніка. Праўда, шмат чаго з яго падворка за час савецкага чалядніцтва і знікла, прапала. Праваліўся і зраўняўся з зямлёй пограб, у якім ён некалі ва ўсякую пару года захоўваў «лёды» — замарожанае ў кругах малако. Зведзена з хлява і сама кароўка, каторая давала тое малако. На кастыльках з касою на сенажаць не выйдзеш. Ні ў яго, ні ў яго старой ужо няма сілы трымаць карову. Таму і ржавела пад сінім небам, сыходзіла кроўю саламарэзка. Бабіны ступа і начоўкі гнілі проста ўжо таму, што былі непатрэбны. Хлеб елі казённы, магазінны, бялізну ў начоўках не замочвалі, дачка мыла яе ў горадзе на пральнай машыне.

Квактала, шорпала вакол Канстанціна Васільевіча Ганна Паўлаўна ў чорных бурках на босую нагу, баялася, што прастудзіцца, хаця і ведала, што на здароўе даравана яму адна толькі хвіліна, сама ж пазвала прыехаць на развітанне са старым сына і дачку. Угаворвала ісці ў хату. Але ён не адгукаўся на ўсе яе ўгаворы. Быў глухі і да суседзяў, бабулек, яго равесніц, што без патрэбы выкідваліся з хат, сноўдалі па падворках: адзінае — дасведчыцца, адышоў ужо ці яшчэ мучыцца.

А ён зусім і не мучыўся. А калі і мучыўся, то не іх зямнымі мукамі. Быў, як кажуць, пры розуме і цвёрдай памяці. Прымаў і збіраў камяні. Трэба сказаць, што і гэта было яму не цяжка. Камянямі семдзесят гадоў былі засеяны і калгасныя палеткі і яго прыватныя соткі. Камяні ці самі раслі на гэтай зямлі, ці падалі з неба. Восенню іх збіралі, разорвалі поле, а вясною яны ўзыходзілі. Надаралася і горш таго: увечары іх прыбіралі, а зранку яны прарасталі зноў, нібыта пры сонцы сеяў ён жыта, а ноччу яно ўзыходзіла каменнем. Што зробіш, чорт помслівы, а мужык трывушчы. Зямля пад яго рукамі ўсё роўна радзіла жытам. Жытам, жыццём, жыцівам завяршаліся ў рэшце рэшт усе беды. Заўсёды і на тую хвіліну яго куды больш за камяні-самасеі жахаў той каменны дакор, што сыходзіў з размазанага хмарамі неба, з вызваленай ужо ад лёду, але яшчэ глухой вады ў рэчцы, ад кладачак між двума яе берагамі —нітачкай паміж абарваным і пахаваным панскім мінулым і чалядным будучым, будучым, якое так і не адбылося. І яшчэ больш дакарала закамянелая скруха ў вачах дзяцей, іх маці, а яго жонкі Ганны Паўлаўны.

Вось дзе камяні. Магільная пліта, валун, пад які ён ляжа і зачыніцца на тым свеце, адгародзіцца ад зямнога дакору і тых дробных каменняў, пцічанскіх рачных акатышаў, што ляцяць зараз у яго. Жыццё пражыў, як крот пад зямлёй, усё рыў, рыў, а нічога не вырыў, не здабыў нават спакою на апошнюю сваю гадзіну. Крацінымі крывымі хадамі ўсё абыходзіў, абыходзіў камяні, валуны, што паўставалі на яго шляху. Вырыўся нарэшце на свет Божы, паказалася — на прастору. Але то была прасторная яма, пастка для такіх вось, як ён, працавітых кратоў. Магіла, падрыхтаваная злым ці добрым розумам, які загадзя ведаў, што ён даграбецца да гэтай ямы-магілы, кульнецца туды, аслепне і сканае.

І ён дагробся, кульнуўся ў тую яму, апошнюю пастку смертных і яшчэ жывы аслеп ад смяртэльнага для кратоў сонечнага святла. І апошні раз у сваім жыцці заплакаў, пусціў слязу на волю з вачэй, што ўжо нічога не бачылі. Ён плакаў ужо слязою вызвалення і збаўлення, а каменні працягвалі ляцець, але яму яны плылі вянкамі: ад праўлення калгаса, ад прафкама, суседзяў, жонкі, сына, дачкі. Яны пабівалі ўжо сляпога і глухога на гэтай зямной юдолі чалавека. Чалавек, гаспадар, мужык і бацька да апошняга стаяў на сваім падворку, на ўкрытай каменнем Галгофе і толькі калі адчуў, што яму адмаўляюць служыць разам з вачыма і рукі — аслабелі, няздольны ўжо трымаць мыліц, і ён таго і глядзі распластаецца, ляжа пасярод гэтай Галгофы, — пашкандыбаў у хату. Перакуліцца на падворку, легчы на мокрую расталую ўжо зямлю, дзе ўсё спаскуджана курамі, ён не жадаў, не мог дазволіць сабе такога і ў думках. Туды ён павінен быў прыйсці чыстым.

Уладкавацца ў ложку яму дапамаглі сын з дачкой. Але і ў ложку ён застаўся пры памяці, розуме і голасе. Наказаў жонцы, што апрануць яму, як і дзе пакласці. Ордэн і мноства медалёў за штурм і вызваленне чужых гарадоў, раскіданых па ўсёй Еўропе, загадаў у труну не класці, захаваць для ўнукаў. Загадаў і адышоў, храпянуў апошні раз, як храплі перад тым жа адыходам яго конікі. Храпянуў і нечакана для сябе набыў ногі, маладую вёрткую сілу ў нагах. Ён выпрабаваў іх яшчэ на гэтым свеце, узняў, здаецца, каб ступіць імі на гэтым свеце, але ступіў ужо на тым. Маладымі пруткімі нагамі пайшоў Канстанцін Васільевіч да Бога. Пайшоў, свята верачы і ведаючы, што горш, чым тут, там яму не будзе. Не можа быць горш. Занятак яму будзе і там. У чым-чым, а ў коніку Божухна яму не адмовіць. А з конікам ён ужо як-небудзь ды згаворыцца, паладзяць яны, абодва ж добра ведаюць, што трэба рабіць, калі сустракаюцца конь і мужык.

На якую хочаш работу на гэтым свеце быў здатны Канстанцін Васільевіч, усё, можна сказаць, ведаў пра той свет. Але на паверку выйшла — усё, ды не зусім. Пражыўшы ўвесь час у сваёй птушынай чалядной адселенасці, ён не прыкмеціў, пэўна, самага галоўнага, — як свет перавярнуўся, жыццё перамянілася. Ён успрымаў яго адвечнай сваёй памяццю, вачыма бацькоў, дзеда, а яно даўно ўжо зрабілася інакшым. Пазіраў на кладачкі паміж панскім і чалядным берагам, а бачыў, пэўна, мост, непарушны мост паміж мінулым і будучым, хоць і ведаў, што кожная новая паводка змывае тыя кладачкі. Ён сам не раз пасля вялікай вады пракладваў іх нанава. Думаў, назаўсёды, але толькі да новай вады. Ён сам быў, як тая вялікая вада. Сам, атрым-

лівалася, тварыў новае незразумелае яму жыццё. І ў рэшце рэшт не прыкмеціў, як сатварыў яго, і сам пераўтварыўся. Перавярнуўся, абярнуўся ў нешта інакшае, агіднае і прыкрае ўласнай душы і натуры. І гэтыя абаротныя яго душа і натура распладзіліся і памножыліся, пайшлі рыскаць па зямлі. Але калі сам ён яшчэ глядзеў на гэтую зямлю вачыма бацькоў, то дзецям яго ўжо бачылася ўсё на ёй яго вачыма. Без мастка паміж двума берагамі рэчкі. Усё сплыло для іх веснавой вадой, тарфяной і чорнай вадою адвечна Пцічы, і сканала там, за рачным паваротам. І цяпер ужо не толькі блакітная цэркаўка на кургане знікла з іх вачэй. На іх вачах, заслепленых пяском, раскапалі і сам курган, а там, дзе некалі стаялі цэркаўка і панскі палац, паставілі асабняк нованароджанага магната, гмахуродзіну, народжаную мноствам літаральных і фігуральных перабудоў і надбудоў. І Канстанцін Васільевіч, калі быў яшчэ ў сіле, дапамагаў будаваць тую ўродзіну.

Так што не без падстаў пабівалі яго каменнямі, ляцелі ў яго камяні. І родныя дзеці, і родная жонка кідалі іх і на магілу, на грудзі, збіваліся паставіць каменны помнік. Вінаваты, вінаваты ён хаця б таму ўжо, што нарадзіўся. Мёртвыя сораму, канечне, не маюць, але, па справядлівасці, павінны трымаць адказ за пакінутае імі жыццё. З каго інакш спытае мужык, жывы ці мёртвы — павінен за ўсё адказваць. Жывыя ж адказваюць толькі за спакой на тым свеце, за тое, каб іх прадзіцелі ў трунах сваіх не пераварочваліся.

А Канстанціну Васільевічу наканавана было перавярнуцца ў труне. Напоўніцу дало яму жыццё горкага і салёнага на зямлі ў бацькоўскім дамку. Не салодкім аказалася яно і ў дамавіне на тым свеце. Толькі вось чаму ўжо і там — гэта яму ўжо ніколі не зразумець, таму што гэта ўжо за мяжой усіх светаў, за мяжой разумення ўсіх, хто ішоў, ішоў да апошняга ўпору, ішоў, але рысы той апошняй не пераступіў. Не пераступіў яе і Канстанцін Васільевіч. Ваяваў — так. Але не звёў са свету ніводнай жывой душы і на вайне, таму што пры коніку. Вазіў снарады і нябожчыкаў, параненых і забітых. Але сам не забіваў, хаця і меў вінтоўку, аўтамат. Сумленне, віну і страх у душы заўсёды насіў. Першародныя: сумленне, віна і страх перад жывым, а страху смерці не ведаў. Мо смерць за гэта і расплацілася з ім так ужо на тым свеце.

Пахавалі Канстанціна Васільевіча хораша, па-людску, як ён заказваў. Касцюм, пінжак на ім быў амаль што новы, ні разу не ліцованы, сарочка таксама новая, белая. Гальштукаў не насіў пры жыцці, не сталі мучыць і пасля смерці. І штаны, брукі-галіфэ ездавога з лампасамі амаль камандзірскімі, што прыдбаў ён яшчэ на фронце, але бярог для смерці, апранулі. Палажылі ў дамавіну — не Канстанцін Васільевіч, а карцінка. Твар, галава ўжо вельмі прыгожыя, як пісаныя, лоб шырокі, трохі заклапочаны, і валасы хораша глядзяцца, белыя, хоць ты пісьмо на іх з таго свету пішы, вусны сцятыя, але без пакуты, не замыленыя. І месца, ім жа прызначанае, знайшлі. Сухое, высокае, пясочак беленькі і хвойка каля галавы. Адпачывай, Канстанцін Васільевіч, радуйся, заслужыў.

Але не на радасць аказалася Канстанціну Васільевічу і магіла, такі прыгожы новаздабыты дамок. І на тым свеце здарылася з ім... Здарылася... Ніхто не ведае, што здарылася. Відавочцаў няма. Сведкаў на гэтым свеце няма. А з таго свету ніхто яшчэ не вярнуўся і не пераказаў. Увогуле, як кажуць у такіх выпадках, здарылася нешта наўродзе Валодзі. Яно і на самай справе адбылося з Канстанцінам Васільевічам нешта накшталт Валодзі. Таго, крамлёўскага Валодзі. Гісторыя амаль па Ільічу, Леніну, каторы пасля смерці замест магілы апынуўся ў Маўзалеі. Але з Уладзімірам Ільічом усё ясна, ён чалавек вялікі, нават геніяльны, з простымі смяротнымі нідзе не сыходзіўся, не сутыкаўся, заўсёды ішоў толькі іншым шляхам. А Канстанцін Васільевіч хадзіў пратораным ужо іншымі шляхам, слядок у слядок, каб, не прывядзі Гасподзь, нідзе не спатыкнуцца, не ступіць ні ўправа, ні ўлева. Ён і Маўзалея таго ніколі жыўцом не бачыў, хаця іх вёсачку Пціч у акрузе называюць Крамлём, так яна выгараджана ад усяго свету, як на выселках, жывуць у ёй людзі, патомныя панскія чаляднікі. Іх яшчэ завуць і крамлёўскімі даўгавечнікамі, таму што і сапраўды зажыліся яны ўжо на гэтым свеце. Пана і костачкі згнілі, а чэлядзь у добрым здароўі. Занесла глеем, пазарасталі травой, асакой ды аерам былыя панскія каналы, нікому і ў галаву не прыйдзе катацца там на лодках. І лодак на ўсю акругу— ніводнай. Ніхто і паняцця не мае, як зрабіць тую лодку. Саму рэчку ўсюды можна ў брод перайсці. З усіх бакоў абрэзалі яе, акараціл дамбамі, вадасховішчамі. Спякотным летам, каб надарылася зноў жа таму князю Ігару павярнуць сюды свае палкі, коням іх напіцца недзе. Хіба што крынічка сочыць яшчэ трошкі вадзіцы. Б'е крынічка пры былым кургане на беразе Пцічы. Але гавораць, што пасля Чарнобыля вада яе горкаю зрабілася. Уначы, калі Чарнобыль надарыўся, паўстала на зрубе каля крынічкі, загарэлася свечачка. Яшчэ ніхто ў сяле нідзе нічога ні слыхам, ні дыхам пра той Чарнобыль, радыё песні спявала, тэлевізар танцы паказваў, а свечачка ўжо гарэла. Яно і не дзіўна. Іх жа маленькая рэчка ўпадае ў раку вялікую, на якой месціцца той Чарнобыль, звязана яна недзе падземнымі хадамі з тым Чарнобылем, як усё малое звязана з вялікім, мінулае з будучым і наадварот. І крынічка, хоць і гаючая і карысная для здароўя, радыеактыўная сёння. Не той, дык іншай заразай атручаны іх воды. Мо таму і зямля трымае яшчэ жывых, але адмаўляецца прымаць нябожчыкаў. Не прыняла яна і свайго вечнага батрака, чалядніка Канстанціна Васільевіча. Адмовіў, пэўна, Божухна яму на тым свеце ў коніку, як брыгадзір адмаўляў на гэтым.

Ганна Паўлаўна адчула нядобрае, калі толькі-толькі пачалі набліжацца дзевяціны. Але па-старэчы, пэўна, ужо не вельмі цямячы, не здолела звязаць гэтае нядобрае, разладнае ў душы з магілкамі, з магілкаю свайго Косціка, Канстанціна Васільевіча. А ён жа на пяты ўжо дзень з'явіўся да яе. Не павясковаму далікатны, чужы ёй і хаце. Па-гарадскому пастукаўся ў дзверы. Ганна Паўлаўна да такога не прывыкла і не адгукнулася, тады ён птушкай заскробся ў акно, і зноў — тук-тук у дзверы.

— Заходзь, каго там чорт прынёс, — прабурчэла Ганна Паўлаўна з-пад сваіх дзяружак. — Не замкнёна.

І сапраўды, дзверы ў хату былі незамкнёныя, ад вайны, ад партызан яшчэ і немцаў завядзёнка такая ішла. Што замыкацца, калі і адны, і другія пры зброі? Ад кулі і пад зямлёю схованкі не знойдзеш, а браць у хаце ўсё роўна няма чаго. Не замыкалася, ведала, што няма на зямлі такога ліха, якое здольна яе ці яе хату пакрыўдзіць.

І той ноччу чакала яна ўбачыць чужога чалавека, а ўбачыла свайго Косціка. Уваліўся ён у хату, сеў на ўслонік, каля цёплай печы, і колькі быў, усё жаліўся: холадна яму, сыра, дождж і снег сыплюць, завейна. Яна прагнала яго: не хадзі, як сірата беспрытульны, не палюдску такое. Ёсць у цябе хатка—пільнуйся яе, не нагаворвай на яе лішняга, яна сугрэўная. А холадна і завейна тут, на зямлі.

На зямлі і сапраўды было няўтульна і холадна, і адначасова смяротна горача. Кожан дзень па тэлевізары некага забівалі і хавалі. Ішоў брат на брата, рэзаў, паліў, не ведаў літасці ні да старога, ні да малога. Каўказцы крывымі нажамі рэзалі дзяцей, малдаванцы трушчылі адно аднаму чарапы. На Беларусі, слава Богу, было яшчэ ціха. Адно толькі галасілі, жыдка ці немца нейкага ўзгадвалі: фярэндум, фэрэндум, як хлеба ў галадоўку прасілі. Хлеб той у магазіне зрабіўся дарагім, і не падступіцца да яго, сала з мясам раней таго не каштавалі. За само ж сала, кілаграмчык нейкі, як некалі за цэлага кабана. Не хадзілі б у той магазін ногі, не бачылі б яго вочы. Выпірае вочы ад аднаго толькі пагляду на гэты белы свет.

І не да нябожчыка і яго голасу, скаргаў было Ганне Паўлаўне. Цяпер ніхто не ведае, што будзе з жывым. Сам чорт не ведае, што будзе, што будзе... Пціч, Грабень, Узляны, Дудзічы трасе, як у ліхаманцы. З усіх бакоў наляцелі, абклалі іх іншапланецяне. А мо і не іншапланецяне, а тыя самыя, што ад рукі брата, бацькі і маці аддалі Богу душу — каўказцы і малдаванцы, маскоўцы, што паспыталі пяшчоты міліцэйскіх кулакоў і іх гумавых дубінак. Паспыталі, задрыжэлі і ўзняліся, узляцелі іх душы. Лётаюць цяпер, не ведаюць ні прытулку на гэтым свеце, ні прыстанку на тым. Страх і жах людскі перад тым, што яшчэ будзе, вызваліўся ўжо і ляціць, ляціць цяпер па свеце, уцякае з вялікіх гарадоў у маленькія вёсачкі, палохае, бянтэжыць і зводзіць мужчын і жанчын. Перад вайной такое ўжо было. Нечысць і пошасць ішлі па зямлі, кожан дзень выпадалі знакі.

Збянтэжаная душа ў спалоху празорліва. Чалавек яшчэ і не здагадваецца, што чакае яго напярэдзе, а яна ўжо ўсё ведае і бачыць, стогне ў жальбе і тузе, ужыве аплаквае сваю долю, спраўляе сама па сабе хаўтуры. Звер жыве ў душы чалавека. Жыве, спіць у дрымоце да пары да часу і баіцца прачнуцца, таму што з яго абуджэннем сам чалавек, аб тым не здагадваючыся, звярэе. І вось гэты звер у чалавеку зараз падняў галаву. І адскочылі звер і чалавек адно ад аднаго. І не дай ім Бог паяднацца зноў. Таму што тады не суджана ім ведаць і адрозніваць, дзе звярынае, а дзе людское. Чалавечынай будуць карміцца абодва. Вох, не прывядзі Гасподзь, і і без таго ўжо на белым свеце невымяральна пралілося той крыві і ўжыта той чалавечынкі. Звер у абліччы чалавека пойдзе па зямлі. Ужо ідзе, абуджаны чалавечай злосцю і кроўю.

— Не, не звер, — не пагадзілася з Ганнай Паўлаўнай старая, што набегла адведаць удовую суседку, вельмі гаваркая, таму што яе распірала ад двайнога гонару. Па-першае, яна стала нарэшце на роўную нагу з Ганнай Паўлаўнай, таму што сама аўдавела ўжо даўно. Усе жанчыны на Пцічы былі цяпер ўдовымі. Канстанцін Васільевіч апошні з мужчын у вёсцы. І цяпер Ганне Паўлаўне няма чаго і няма перад кім дзерці носа. Другі ж гонар старой: яна мела навіну—іншапланецяне прыляцелі. Ганна Паўлаўна раскусіла яе і таму, пэўна, упарта адмаўлялася паверыць у іншапланецян. Выказвала сваю думку-версію наконт іх, настойвала на сваім, бо заўсёды была натурыстай і строгай:

— Ты мне кажаш, што не звер, а я ведаю, што звер.

— Ты ведаеш, а я бачыла на свае вочы.

— Не вер сваім вачам.

— А я вось веру. Быў шар. Чырвоны такі шар. Я яшчэ галавою да яго падсунулася. Бачыш, валасы падсмаліла.

— У печ ты сунула галаву, вось і падсмалілася. Ты ўсё жыццё сунеш галаву ў печ і ходзіш, як сава падсмаленая.

— Сава падсмаленая, — пакрыўдзілася старая. — У мяне газ, не так, як у некаторых.

— І ў некаторых газ, — абсекла яе Ганна Паўлаўна. Усё ж яна была не раўня гэтай старой. Чалавек у той памёр даўно, а ў яе зусім свежанька: — Няма на зямлі ніякіх шароў, не бывае.

— Ёсць, — узрадавалася старая. — Зямля наша круглая з усіх бакоў, як шар.

— Ты сама круглая, з усіх бакоў, як шар.

— Няхай круглая, затое спраўная, не тое, як некаторыя, — і апярэдзіўшы намер Ганны Паўлаўны ўставіць і сюды свае два грошыкі: — Быў напачатку шар, а потым, калі я падсмалілася, у талерку ён ператварыўся, у талерку...

— Талерку ты тую ў магазіне бачыла, — усё ж спыніла яе Ганна Паўлаўна. — Убачыла, колькі яна цяпер каштуе, вось у галаве ўсё ў цябе і памарочылася. Сёння трэба моцная галава, чыгун, а не твае клёпачкі, каб цэны новыя пераварыць.

— Яно так, яно так, цэны сёння не па нашым з табой кашальку і набытку. А талерка ўсё ж была, і зямля наша круглая. Талерку тую і шары чырвоныя не адна я толькі бачыла. Вось і...

— Добра, добра, зямля наша шар. — Ганна Паўлаўна ведала, пра што далей хацела весці гаворку старая. Зранку ў яе хаце перабылі ўжо ўсе пцічанцы, што бачылі на свае вочы талерку, іншапланецян і чырвоны шар. За гэтымі адведкамі і казаннямі яна і забылася пра сваё ці то сненне, ці то яву, забылася, што і гэтай, як і мінулай ноччу, прасіўся пагрэцца ў хату Канстанцін Васільевіч, ледзь не на каленцах умольваў пусціць, а яна прагнала. Але недзе надвячоркам, пад змярканне, калі прыехалі ўжо на дзевяціны дзеці з унукамі, прыгрэлася каля іх, раздумалася, паведала ім пра свой сон і кінулася апранацца. Дачка паспрабавала пярэчыць:

— Куды ты нанач гледзячы. Заўтра ўсе разам адведаем.

— Холадна яму там. Холадна. Я адчуваю. І ў мяне мароз па скуры... Холадна яму. Холадна. — Нібы трызнячы, засяродзілася на гэтым «холадна» Ганна Паўлаўна. Хуценька апранулася, выграблася за парог хаты, нібы ваўчыца з логава. Азіраючыся зверам, пачыкільгала па адпушчанай ужо, раскіслай вясенняй дарозе да могілак. Дачка з мужам пайшлі следам за ёй. Ішлі не даганяючы і не імкнучыся дагнаць, цягнуліся за ёй, як чужыя за чужой. І на самай справе на тую мінуту гэтая старая была ім чужой. І ішла яна да могілак, як ходзіць звер, і вялі яе, бадай, не дарога і вочы, а нюх.

Яшчэ тыдзень назад прыбраная і дагледжаная магілка была раскапана. Скасабочаная і пакарабачаная труна стаяла на кучы пяску. Вечка адчынена і разламана па краях. Канстанцін Васільевіч ляжаў у труне не разварушаны, усё такі ж задумлівы, якім аддалі яго зямлі. Толькі снег і трохі наледзі было на яго твары. Па тым снезе вяскоўцы ўжо крыху пазней меркавалі, што выцягнулі яго з магілы тры дні назад. Тры дні назад ішоў снег, была невялікая мяцеліца. А хто яго раскапаў, а галоўнае — дзеля чаго, тут ужо ніхто не мог і галавы прыкласці. З-за медалёў і ардэнка, што сёння ў цане, надсаджвацца было няварта. Усе бачылі, усе ведалі, што тыя медалі і ардэнок Канстанцін Васільевіч перад смерцю загадаў пакінуць унукам. А ніякага больш багацця пры ім не мелася, нават зуба залатога ніводнага сабе не паставіў, толькі жалезныя, са сталі.

Прыдуркаватая суседка, што расказвала Ганне Паўлаўне пра шар і лятаючыя талеркі, выказала думку, што ўсё тут учынілі іншапланецяне: хацелі, маўляў, выцягнуць яго, забальзаміраваць і адтарабаніць на сваю планету, пакласці ў Маўзалей, як у нас Уладзіміра Ільіча Леніна, і паказваць той планеце. Ёй, зразумела, не паверылі. Мо і дарэмна, а мо і не. Хто ведае.

Старшыня калгаса, што праязджаў міма могілак на сваім козліку і завярнуў на жаночае галашэнне, сказаў як бы сам сабе:

— Чалавек нармальны і разумны на такое не пойдзе.

На што яму пераканаўча адказалі:

— І дурань не пойдзе. Пабаіцца могілак і мерцвяка, кары Божай.

Азвалася зноў убогая старая з Пцічы:

— Вох, будзе, вох, што будзе, калі горад пойдзе на вёску. А яшчэ ж горш будзе, калі вёска рушыць на горад, пусціць чырвонага пеўня па дачах, што ўсюды сёння на кожным кроку.

Мовіла са злоснай прарочай сілай юродзівай, якая тое-сёе ведае і прадбачыць з таго, што чакае нас наперадзе. Усе пачулі яе, але ніхто не запярэчыў, не паставіў яе на месца. Хутчэй за ўсё з-за беспрасвету і бездапаможнасці перад гэтай магілай, прахам Канстанціна Васільевіча і жывымі яшчэ мошчамі Ганны Паўлаўны. Ні чалавек, ні Бог нічым ужо няздольны былі дапамагчы ім. Улады зямныя, праўда, хацелі дапамагчы, завесці справу і пачаць шукаць злачынцаў. Але для гэтага, сказалі яны, неабходна анатаміраванне, гэта значыць, разрэзаць Канстанціна Васільевіча, нібы злачынца сядзеў недзе ўсярэдзіне яго. Ганна Паўлаўна паказала ім з труны Канстанціна Васільевіча кукіш.

У той жа вечар, на тых жа могілках знайшлі яшчэ дзве раскапаныя магілкі. Але не да канца, не зусім, як магіла Канстанціна Васільевіча. І ляжалі ў тых магілках таксама пцічане. Дзве бабулі, якіх і прозвішча ўжо пцічанцы пачалі забываць. Зусім нікчэмныя старыя. Яны і пры жыцці нікому не патрэбныя былі. Але вось жа спатрэбіліся некаму пасля смерці. Каму? Навошта? Хто ведае? Хто адкажа?

Вось на тое, што тае ж начы на цэнтральнай сядзібе калгаса ўзламалі склад і ўкралі поліэтыленавую плёнку для парнікоў і металічную сетку, адказ быў. Сетка і плёнка рэчы ў гаспадарцы найнеабходныя, архіпатрэбныя і архідэфіцытныя. Усе ж навокал будуюцца, садзяць агароды, заводзяць парнікі. Думаюць жыць доўга.

Мо ведае што-небудзь пра свайго Канстанціна Васільевіча і пра тое, што з ім адбылося, Ганна Паўлаўна. Канстанцін Васільевіч мог шапнуць ёй адной па сакрэту нешта на вуха. На могілках яна ўпала на яго, накрыла сваім целам, бы хацела сагрэць. Пачала растапляць вуснамі лёд са снегам, што прыпаў да яго ілба. І што дзіўна, не выпусціла з вачэй ні адзінай слязінкі, не выдала ні гуку, ні стогну. Усё па-звярынаму, моўчкі. Маўчыць, не кажа нікому ні слова і сёння, не азываецца нават да дзяцей і ўнукаў.

А спаць той ноччу, пасля вяртання з могілак, яна легла, паклаўшы пад падушку сякеру. Перад гэтым занесла ў сенцы, здабыўшы ў хляве асаджаную яшчэ Канстанцінам Васільевічам, калі яны яшчэ трымалі карову, касу. З сякерай пад падушкай, няспынна мацаючы яе то шчакой, то патыліцай, з вышчарбленай іржавай касой, што стаіць у сенцах, так і спіць яна з той пары ў сваёй хатцы на курыных ножках. Адна, як ваўчыца ў логаве. Навошта? Чаму? Хто адкажа?

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Часам знаходкі археолагаў прыводзяць даследчыкаў культуры амаль да дэтэктыўных росшукаў. Менавіта да такіх росшукаў падштурхнулі знойдзеныя ў Мсціславе археолагам А. Трусавым і ў Менску археолагам В. Собалем гербавыя пячаткі ў форме медальёнаў з празрыстага зялёнага шкла з ледзь жаўтаватым адценнем. Мяркуючы па сегментах, пячаткамі аздаблялі бутылі, шырокія нізкія чашы (браціны) ці жбаны з шырокім дыяметрам тулава. Аб'ядноўвае пячаткі выява герба Дуброва: белая паліраваная падкова на блакітным полі шчыта, над ёй залацісты крыж; такія ж крыжыкі ўнізе завяршаюць канцы падковы, загінаючыся ўверх. Над шчытом герб вянчае птушынае крыло, праткнутае стралой. На шкляным медальёне з Мсціслава герб з двух бакоў атачаюць лацінскія літары. З гісторыі Мсціслава мы ведаем, што герб Дуброва мелі князі Цеханавецкія. Іх прозвішча паходзіць ад назвы мясцовасці Цеханоўцы, пазней Цеханавец у акрузе Драгічына, які цяпер размешчаны на тэрыторыі Рэспублікі Польшча. У XV ст. Цехановецам валодалі шляхетныя роды — Кішкі (герб мелі таксама Дуброва) і Струмілы. Гэтыя роды пазней таксама парадніліся з беларускай шляхтай. Іх нашчадкі ў 2-й палове XV ст. атрымалі прозвішчы Цеханавецкія і Цеханоўскія, таму што род паходзіў з гэтай мясцовасці. Аналагічную сітуацыю мелі ўладары вёскі Дастоева, набыўшы прозвішча Дастаеўскія.

Адзін з братоў Струмілаў Пашко меў сыноў Мацея і Петрашко (Пётра), апошні пазней атрымаў прозвішча Пашковіч (ад імя па бацьку) з Цеханоўца (быў старастам Драгічынскім у 1463 і 1468 гг.), меў сыноў Станіслава, Міколу і Яна. Яго ж называлі Пётра Цеханавецкі Струміла. Яго дачка Ганна адмовілася ў 1491 г. ад маёнтка Цеханавец у карысць свайго брата Станіслава. Унук Петрашкі ад сына Яна — Нікадзім Янавіч у першай палове XVI ст. валодаў пэўнымі землямі ў цэнтральнай Беларусі.

Другі сын Пашкі Струмілы Мацей таксама меў сына Яна і ўнука Нікадзіма Янавіча, які ў 1546 г. быў маршалкам каралеўскім і ездзіў паслом польскім у Маскву ў 1541 г. Менавіта ад гэтага Нікадзіма Янавіча ў 2-й палове XVI ст. цягнуцца шлюбныя сувязі Цеханавецкіх з усходняй Беларуссю, таму што ён ажаніўся з мсціслаўскай князёўнай Ульянай — уладальніцай Бачэйкава (Бешанковіцкі раён Віцебскай вобл.), удаве князя Міхала Заслаўскага. Але пасля смерці Нікадзіма Бачэйкавым авалодаў сын Ульяны ад першага мужа.

Стаць уладарамі Мсціслава сучасныя нашчадкі Цеханавецкіх змаглі дзякуючы жаніцьбе ў 1562 г. сына Нікадзіма Янавіча ад другой жонкі Гелены — Андрэя на мсціслаўскай князёўне Багдане, крэўна парадніўшыся такім чынам з беларускімі князямі, таму што мелі сына Станіслава. Наследаваць Бачэйкава Цеханавецкія змаглі толькі з трэцяга захаду. У канцы XVI ст. Андрэй і Багдана арандавалі Бачэйкава, якое перайшло да іх сына Станіслава ў 1584 г. (пасля смерці Андрэя).

Нашчадкі Станіслава ў XVII ст. займалі розныя пасады ў гарадах і ваяводствах усходняй Беларусі: Мсціслаўскім, Полацкім, Віцебскім, Менскім.

Калі параўнаць мінулы адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел з сучасным, то ўбачым пэўную аналогію: існавала Мсціслаўскае ваяводства (гэта прыблізна сучасная вобласць) і Мсціслаўскае гарадское староства (накшталт нашага гарвыканкома), якому падпарадкоўваліся горад Мсціслаў з замкам і вёскі Надзейкавічы, Стараселле, Загмін.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. быў утвораны Мсціслаўскі павет. Чытаючы спісы мсціслаўскіх ваявод, мы сустрэнем імя Мікалая Цеханавецкага, які займаў гэтую пасаду ў 1659 і 1672 гг. А старастамі «гродскімі» мсціслаўскімі былі наступныя Цеханавецкія: вышэйадзначаны Крыштоф Цеханавецкі (1653 г.), Мікалай Валерыян (1658—1671), Фелікс (1731—1733), Нікадзім (1738—1747).

Акрамя таго, пасля далучэння Мсціслава да Расіі маршалкам павета Мсціслаўскага быў у 1789 г. граф Ян Цеханавецкі (меў таксама герб Дэнброва).

Ёсць падставы лічыць, што пячатка магла аздабляць посуд, прызначаны Крыштофу Цеханавецкаму.

Пячатку, знойдзеную ў Мінску з выявай герба Дуброва, але без абрэвіятуры, можна ідэнтыфікаваць таксама з асобай Крыштофа Цеханавецкага, таму што ў 1655 г. ён быў ваяводам менскім. Магчыма, Крыштоф быў уладальнікам мсціслаўскай ці менскай гуты, а можа, посуд з яго гербам быў зроблены па замавенню ці ў якасці падарунка.

Пачаўшы шукаць уладара шклянога посуду, аздобленага гербавай пячаткай, мы кранулі гісторыю ўзнікнення і развіцця польска-беларускага роду Цеханавецкіх, князёў мсціслаўскіх і заслаўскіх, якія на працягу XVI — пачатку XX ст. аказалі значны ўплыў на развіццё эканомікі і культуры Усходняй Беларусі. Дзякуючы шлюбным адносінам дзеці і ўнукі Крыштофа на працягу XVII ст. сталі ўладарамі маёнткаў і зямель у многіх мястэчках, гарадах, ваяводствах і староствах, апроч Мсціслава і Бачэйкава (апошнім на правах спадчыны яны валодалі да 1939 г.), Друцка, Оршы, Лепеля, Віцебска.

Добра ведаючы культуру Захаду Цеханавецкія ўтрымлівалі свае маёнткі на заходнееўрапейскім узроўні. Так, пры Станіславе Андрэевічы Бачэйкава дасягнула пэўнага росквіту. Уладар запрасіў да сябе архітэктара Эмануіла Кантакузена, грэка па нацыянальнасці, які, узяўшы маёнтак у арэнду, цалкам яго перабудаваў, стварыўшы тут у XVII ст. лепшыя ў Задзвінні аранжарэю, лазні, пякарню, сырніцу, стайню, склеп, увёў у севазварот азімае жыта, аздобіў інтэр'ер палаца італьянскімі камінамі.

У XVIII ст. нашчадкі Цеханавецкіх пашырылі сваю ўладу на Чаусы — упамінаецца Станіслаў, маршалак Чавускі. Многія з іх пэўны час займалі пасады ў Мсціславе.

Развіццю Бачэйкава ў XIX ст. спрыяў паштовы тракт Віцебск — Лепель, які праклалі каля маёнтка ў 1801 г. У гэты час маёнтак складаўся з 6-ці фальваркаў: Бачэйкава з хутарам Галяндрыя, Свяча з хутарам Заполле, Сялец, Давідкавічы, Стрыжэва, Касарэўшчына і 51 вёска.

Намаганнямі Цеханавецкіх Бачэйкава стала цэнтрам воласці і ў 1886 г. у ім размяшчалася валасная ўправа, прыходская царква, яўрэйскі малітоўны дом, пачатковае народнае вучылішча, ваенная ўстанова, ветраны млын, вінакурны і піваварны заводы, гандлёвыя рады.



Мсціслаўская і Менская пячаткі з гербам графаў Цеханавецкіх «Дуброва».

Фота А. СПРЫНЧАНА.

Са зменамі ў нашым сённяшнім сацыяльным і грамадскім жыцці, што пачаліся пасля 1985 г., да нас пачалі прыязджаць нашчадкі былых уладароў маёнткаў, добразычлівыя і добрасумленныя нашчадкі былых мецэнатаў і вядомых раней мясцовых дзеячаў Беларусі. Яны шчыра любяць сваю Радзіму, хочуць быць ёй карыснымі. Так, у 1988 г. наведаў родныя мясціны, у тым ліку і вёску Бачэйкава, па запрашэнні Беларускага фонду культуры і таварыства «Радзіма» доктар мастацтвазнаўства Анджэй, граф Цеханавецкі, князь Мсціслаўскі-Заслаўскі, які трымае ў Лондане ўласную галерэю мастацтва і займаецца мецэнацтвам.

Яшчэ да перабудоўчых працэсаў у СССР доктар мастацтвазнаўства Анджэй Цеханавецкі падараваў шэраг помнікаў мастацтва, якія дасталіся яму ў спадчыну, музею — Замак каралеўскі ў Варшаве. А пасля першага наведвання Беларусі, увосень 1989 г. ён прыслаў на Радзіму праз прафесара Адама Мальдзіса, які наведаў Лондан, унікальныя і каштоўнейшыя па мастацкіх асаблівасцях помнікі беларускай культуры XVIII ст.— слуцкі пояс, якіх у Беларусі засталося ўсяго некалькі штук, і кнігу, уручыўшы іх са шчырымі словамі «Для маёй роднай Беларусі». Па жаданні мецэната слуцкі пояс быў перададзены ў музей старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук Беларусі, а «Кніга аб веры адзінай праўдзівай праваслаўнай», выдадзеная ў Гродне ў 1785 г.— у Полацкі музей гісторыі беларускага кнігадрукавання. Супрацоўнікі музеяў, мастацтвазнаўцы і ўвогуле ўсе жыхары Беларусі, якія неабыякава ставяцца да вяртання ў Беларусь помнікаў яе культуры, былі вельмі ўдзячны графу Цеханавецкаму за такі высакародны ўчынак. Але на гэтым мецэнацкая дзейнасць нашага добразычлівага земляка не скончылася. У час знаходжання ў Менску на 1-м Міжнародным кангрэсе беларусістаў, які адбыўся ў маі 1991 г., дзе доктар мастацтвазнаўства Анджэй Цеханавецкі выступіў з дакладам аб мецэнацтве князёў Агінскіх. У гэты прыезд ён падараваў Музею старажытнабеларускай культуры акварэль з краявідам Нясвіжа 1812 г., вельмі каштоўную для гісторыі архітэктуры Беларусі XIX ст.

Дзякуючы нашым славутым землякам, якіх лёс раскідаў па свеце, мецэнацтва ў Беларусі зноў адраджаецца і адыгрывае значную ролю ў вяртанні яе спадчыны і развіцці культуры.

Такім чынам, менавіта пячатка стала мастком паміж мінулым і сучасным, звязаўшы карысную дзейнасць Цеханавецкіх у мінулыя часы з такой жа дзейнасцю іх сучаснага нашчадка — мецэната графа Анджэя Цеханавецкага.

Мая ЯНІЦКАЯ.

З ПОШТЫ «ЛіМа»

Хто падкажа дыктару з Астанкіна?

У пятніцу 15 мая 1992 года ў вячэрнім выпуску «Новостей» з Астанкіна дыктар паведаміў, што рускія лінгвісты звярнуліся да прэзідэнта Расіі Ельцына: маўляў, паводле правілаў рускай граматыкі, трэба гаварыць і пісаць «Молдавия», «Белоруссия» і г. д. У сваім каментарыі дыктар дадаў, што тое, як называць гарады ці краіны, павінны вырашаць філолагі, а не парламентарыі. Добра яшчэ, сказаў ён, што немцы не патрабуюць ад нас называць іх краіну «Дойчлянд», а палякі — «Польска», партугальцы не патрабуюць вымаўляць «Лішбона» замест прынятага Лісабон і г.д. А я падумаў, чаму гэта рускія лінгвісты не зважаюць на тое, што ўжо 52 гады старажытны беларускі горад Вільня называецца Вільнюс. Тое, што яго так ахрысцілі ў 1940 годзе, — зразумела: Сталін хацеў паказаць палякам, што гэты горад — літоўскі і таму называцца будзе па-літоўску. Гэтым ён падкрэсліваў, што Вільня незаслужана была падорана Пілсудскаму ягонай арміяй. Вільню такім чынам назвалі па-літоўску, хаця ў 1937 годзе літоўцаў там пражывала толькі адна тысяча чалавек са 170 тысяч жыхароў горада. Але Сталін даўно памёр, а Вільнюс застаўся. І сёння беларусы сваю былую старажытную сталіцу называюць па-літоўску, літоўцы ж наш Мінск па-беларуску пісаць не хочуць ніяк. Не так даўно яшчэ я спаткаў два аўтобусы: адзін з Мінска ў Вільню, а другі з Вільні ў Мінск. На нашым аўтобусе было напісана «Минск — Вильнюс», а на літоўскім «Вильнюс — Минскас» («Vilnius» — «Minskas»). Вось так, яны сваю граматыку берагуць, а з ёй і пачуццё годнасці, затое мы — рады старацца: іх сталіцу называем толькі па-літоўску.

Дык хто падкажа дыктару тэлестудыі Астанкіна, а мо самому спадару Ельцыну, што наша сапраўдная гістарычная сталіца павінна па-руску называцца «Вильно», як гэта было зафіксавана на ўсіх геаграфічных картах ад XVII стагоддзя да 1940 года?

Аляксандр БАХАНЧЫК.

г. Гарадзея.

ЛіМ

Заснавальнікі:
САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
І МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня «Беларускі Дом друку».

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600. ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел літаратурнага жыцця: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жана ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел навін: Віталь ТАРАС — 33-19-65, Юрась ЗАЛОСКА — 33-22-04; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт Уладзімір ПАНАДА — 33-24-62; бухгалтэрыя — 26-86-40.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Андрэй ГАНЧАРОЎ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Барыс ПЯТРОВІЧ.

Індэкс 63856
Тыраж 18068

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12